Варта любіць сваё

СТАР. 8

Жаночыя страхі без крайнасцяў

СТАР. 18

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Падрыхтоўка дзяцей у спартыўных школах павінна быць скіравана на спорт найвышэйшых дасягненняў. Галоўная мэта — вызначыць прыярытэтныя віды спорту ў такіх школах. Разам з тым, займацца фізкультурай павінны ўсе дзеці. Добрай дапамогай гэтаму з'яўляецца сярэдняя школа або фізкультурна-спартыўны клуб па месцы жыхарства. Тут і нагрузка не такая высокая, як у спартыўных установах. Ды і не кожнае дзіця можа быць спартсменам, калі ў яго няма адпаведных здольнасцей. Гэта павінны разумець бацькі. У той жа час эфектыўнасць работы дзіцячых спартыўных школ, якасць спартыўнай падрыхтоўкі ў іх па розных відах спорту неабходна павышаць».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.10.2015 г.

Долар ЗША	17450,00	▼
Еўра	19077,00	▼
Рас. руб.	271,76	▲
Укр. грыўня	761,09	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15210

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 210 (28068) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КАРАГОД НА ЗАЛАТЫМ

Пяцікласнікі 55-й сталічнай школы радуюцца сонцу і харастве навокал.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Кропка на сэрцы

ХОСПІС — ГЭТА ПРА ЖЫЦЦЁ,

або Калі кропля ўвагі каштоўнейшая за любыя грошы

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Да мяне часта прыходзяць дзеці нашых падапечных і кажуць: «У вас працуюць сапраўдныя анёлы. Калі ў наш дом завіталі дактары з выязной службы — адразу стала неяк цёпла, настрой з'явіўся. Яны, здаецца, яшчэ нічога і не зрабілі, нават лекі не паспелі прызначыць, а ўжо ўсё памянялася». Такія словы дарагога варты», — дзеліцца галоўны ўрач анкалагічнага хоспіса для дарослых Вольга Мычко, якая 10 гадоў таму адна з першых не па-жаноцку напорыста ўзялася за развіццё паліятыўнай медыцыны ў нашай краіне.

«Адчуваю патрэбу аддаць тое, што не дадала сваім бацькам»

Тое, што ў хоспіс проста так людзі не прыходзяць, — гэта дакладна. І Вольга Віктараўна не выключэнне. Сваю ролю ў тым, што яна, не раздумваючы, з галавой кінулася ў паліятыў, адыграла асабістае гора:

— Калі тата захварэў на рак і месяцы яго былі злічаны, я, доктар, з жыццёвым і прафесійным багажом ведаў, не ведала, што рабіць, як зняць боль, дэпрэсію, чым дапамагчы. Пра паліятыў у Беларусі тады і думаць не думалі. Усё трэба было пачынаць з нуля.

СТАР. 17

■ Надвор'е

БЕЗ ДАЖДЖОЎ

Уначы на суботу сіноптыкі абяцаюць да мінус 8 градусаў

На выхадныя ў Беларусі прагназуецца сапраўды сонечнае, але халаднаватае надвор'е, пра што паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння чакаецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е. Тэмпература ўдзень складзе 4-9 цяпла, а ў крайніх паўднёва-заходніх раёнах Беларусі будзе крыху цяплей, там паветра прагрэецца да плюс 11 градусаў. У суботу на тэрыторыю краіны завітае чарговы антыцыклон, які рухаецца да нас з боку Фінляндыі. Будзе малавоблачна і без ападкаў. Чакаецца слабы паўднёва-заходні і паўднёвы вецер. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 1-8 марозу, аднак у крайніх заходніх раёнах месцамі да нуля—плюс 2 градусаў, удзень будзе 3-10 цяпла.

І ў першы дзень лістапада тэрыторыя Беларусі застанецца пад уплывам антыцыклону, які перамесціцца ва Украіну, а да нас пачне паступаць больш цёплае паветра з Заходняй Еўропы. Пераважна захаваецца сухое надвор'е, толькі ў паўночных раёнах краіны стане больш воблачна і ўзмоцніцца вецер. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, а ўдзень будуць увогуле камфортныя 6-12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночна-ўсходніх раёнах магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагназуецца туман. Уначы тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, аднак месцамі пры праясненнях магчымы замаразкі да мінус 3 градусаў, удзень будзе 6-13 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

НОВЫ ІМПУЛЬС ДЛЯ ДЭКРЭТА №6

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора правёў нараду па ўдасканаленні ўмоў прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі малых, сярэдніх гарадоў і сельскай мясцовасці.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў свой час прымалася сур'ёзнае рашэнне па стымуляванні бізнесу ў рэгіёнах, стварэнні там вытворчасцей. У 2012 годзе быў прыняты дэкрэт №6, у якім вызначаны льготы і прэферэнцыі для ахвотных размяшчаць вытворчасць у сельскай мясцовасці. «На думку ўрада, настаў час унесці пэўныя змены і дапаўненні», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся эфектам ад дзеяння гэтага дакумента, які існуе больш за тры гады. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць, ці захаваецца ў выніку змяненняў накіраванасць дэкрэта на стымуляванне інвестыцый у вытворчасць і ці дастатковыя ўносімыя змены для актывізацыі працэсу стварэння новых прадпрыемстваў у малых гарадах і сельскай мясцовасці.

Як было даложана Прэзідэнту, рэалізацыя дэкрэта №6 дала станоўчы вынік. Так, за два з паловай гады — з 1 ліпеня 2012 года па 1 студзеня 2015 — колькасць суб'ектаў гаспадарання на тэрыторыі сярэдніх і малых гарадоў і ў сельскай мясцовасці павялічылася на 38%. Тут зарэгістравана больш за 35 тысяч арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў. У той жа час у буйных гарадах прырост склаў 2,6%. Пры гэтым рост суб'ектаў прадпрымальніцтва назіраецца ва ўсіх рэгіёнах. Лідарам стала Магілёўская вобласць, дзе колькасць суб'ектаў прадпрымальніцтва павялічылася амаль у два разы, у Гомельскай і Віцебскай — больш як у паўтара раза, у Мінскай і Брэсцкай абласцях — у 1,3 раза.

Аляксандр Лукашэнка ў асноўным падтрымаў усе ініцыятывы ўрада, якія тычацца ўдасканалення норм Дэкрэта №6. У найбліжэйшы час з улікам праведзенага абмеркавання базавыя палажэнні дакумента будуць дапрацаваны і на працягу месяца прадстаўлены кіраўніку дзяржавы, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Галоўная задача змяненняў — надаць новы імпульс дэкрэту №6 з пункту гледжання стварэння новых працоўных месцаў, новых кампаній у малых гарадах, дзе адчуваецца істотны недахоп ініцыятыў і ёсць залішняя колькасць рабочай сілы.

■ Віншуем!

АДНАГОДАК ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

70-гадовы юбілей адзначае Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў ВНУ: «Ваш універсітэт займае годнае месца ў сістэме вышэйшай адукацыі краіны. Сёння ён стаў сапраўднай кузняй кадраў для Брэстчыны: з улікам патрэб прадпрыемстваў і арганізацый рэгіёна тут рыхтуюць спецыялістаў па найбольш перспектыўных напрамках. Педагагічны калектыў універсітэта заслужыў шырокае прызнанне як у Беларусі, так і далёка за яе межамі, а студэнты неаднаразова станавіліся пераможцамі розных конкурсаў, інтэлектуальных і спартыўных спаборніцтваў». Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце і ў далейшым будуць множыць найлепшыя традыцыі айчыннай адукацыі і рыхтаваць сапраўдных майстроў справы.

Ва ўніверсітэта — слаўная гісторыя, якой можна ганарыцца. Рашэнне аб стварэнні настаўніцкага інстытута было зацверджана Пастановай Савета Народных Камісараў БССР у 1945 годзе. За параўнальна кароткі час навучальная ўстанова прайшла шлях ад настаўніцкага інстытута да класічнага ўніверсітэта, стаўшы цэнтрам навуковых даследаванняў і культурна-асветніцкага жыцця паўднёва-заходняга Палесся.

Сёння ва ўніверсітэце дзейнічаюць 10 факультэтаў: філалагічны, псіхолага-педагагічны, сацыяльна-педагагічны, факультэт замежных моў, факультэт фізічнага выхавання, геаграфічны, біялагічны, фізіка-матэматычны, гістарычны і юрыдычны. Падрыхтоўка вядзецца па 45 спецыяльнасцях першай ступені вышэйшай адукацыі, па 20 спецыяльнасцях магістратуры і 16 спецыяльнасцях аспірантуры. Улічваючы патрэбы сучаснага рынку адукацыйных паслуг, універсітэт сістэматычна адкрывае новыя спецыяльнасці. На дзённай і завочнай формах навучаецца больш за 8 тысяч студэнтаў, у тым ліку больш як 450 замежных грамадзян. На 46 кафедрах універсітэта працуюць 506 штатных выкладчыкаў, сярод якіх 16 дактароў навук, 19 прафесараў, 228 кандыдатаў навук і 202 дацэнты.

Ва ўніверсітэце дзейнічаюць больш як 140 студэнцкіх навукова-даследчых груп і гурткоў, 11 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, у якіх займаюцца каля 900 студэнтаў і магістрантаў. Дзякуючы міжнароднаму супрацоўніцтву студэнты ўніверсітэта маюць магчымасць навучацца за мяжой, а выкладчыкі — праводзіць сумесныя з замежнымі партнёрамі даследаванні. Універсітэтам рэалізуюцца дагаворы аб супрацоўніцтве з 54 замежнымі ўстановамі, навуковымі арганізацыямі, фондамі. ВНУ ўдзельнічае ў рэалізацыі міжнародных праектаў праграм Erasmus, Tempus і «Трансгранічнае супрацоўніцтва: Польшча—Беларусь—Украіна».

Універсітэт ганарыцца сваімі выбітнымі спартсменамі. Сярод яго выпускнікоў чэмпіёнка XXVIII Алімпійскіх гульняў у Грэцыі Юлія Несцярэнка (лёгкая атлетыка) і бронзавы прызёр гульняў Наталля Гелах (акадэмічнае веславанне).

Выхаванцаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта можна сустрэць ва ўсіх куточках краіны на самых розных пасадах: у сацыяльнай сферы, народнай гаспадарцы, у органах дзяржаўнага кіравання і сілавых структурах. І ўсюды яны пацвярджаюць самы высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Прастора ЕАЭС

РЭГІЯНАЛЬНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ ВЫХОДЗІЦЬ НАПЕРАД

У нацыянальных кватэрах — цесна, глабалізм робіць крок назад, у выйгрышы павінны застацца тыя, хто аб'яднаўся па рэгіянальным прынцыпе. Такая думка стала «чырвоным радком» X Міжнароднай канферэнцыі «Еўразійская эканамічная інтэграцыя», якую ўчора ў Маскве правялі Еўразійскі банк развіцця і Еўразійская эканамічная камісія.

У сучасных умовах сусветнага развіцця важна сканцэнтравацца на інтэграцыйных пытаннях, так лічыць **старшыня праўлення Еўразійскага банка развіцця Дзмітрый ПАНКІН**. «Мы бачым, што цяпер адбываецца ў свеце: развіваюцца Трансціхаакіянскае партнёрства, Еўрапейскі саюз пераадольвае праблемы, актыўна вядзе свае інтэграцыйныя працэсы Кітай, — сказаў ён. — У гэтым свеце застацца па-за інтэграцыйнымі блокамі, напэўна, будзе вельмі складана. Гэта пытанне выжывання для краін Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі».

Асноўная ўвага канферэнцыі была сканцэнтравана на трансгранічным, інфраструктурным развіцці, на пытаннях прамысловай кааперацыі, на ўзаемадзеянні фінансавых рынкаў краін ЕАЭС.

Член Калегіі (міністр) па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргей СІДОРСКІ адзначыў, што юбілейная міжнародная канферэнцыя па пытаннях еўразійскай інтэграцыі праходзіць у новых рэаліях: дзейнічае ЕАЭС, членамі еўразійскай эканамічнай інтэграцыі з'яўляюцца ўжо пяць краін, а не тры. Пры гэтым старт саюза адбываецца ў няпростых умовах. «У прэсе ў апошні час абмяркоўваюць тое, што ўсім хацелася б, каб Еўразійскі саюз з гэтага года даў актыўны рух наперад па паказчыках развіцця, але трэба ўлічваць, што ў краінах свету працягваецца эканамічны крызіс, а ў адносінах да аднаго з важных партнёраў інтэграцыйнага аб'яднання — Расіі — дзейнічаюць санкцыі. Шэраг паказчыкаў развіцця ЕАЭС быў запланаваны на тры гады наперад, калі было іншае бачанне падзей. На жаль, многае залежыць не толькі ад Еўразійскага эканамічнага саюза, але і ад знешніх умоў», — заўважыў Сяргей Сідорскі.

Міністр ЕЭК нагадаў, што адбываецца рэзкае падзенне цэн на энерганосьбіты, па выніках 2014 года дэфіцыт гандлёвага балансу краін саюза склаў больш за 200 млрд долараў. Кіраўнікі дзяржаў падпісалі дагавор, які ставіць задачы па выводзе саюзных эканомік на высокі ўзровень канкурэнтаздольнасці, інавацыйнага развіцця і ў выніку павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва сваіх краін. «Задачы лідары краін нават у гэтых складаных умовах ставяць амбіцыйныя, якія адказваюць запытам грамадства, — сказаў Сяргей Сідорскі. — Інтэграцыйнае супрацоўніцтва становіцца адным з галоўных прыярытэтаў і інструментаў у эканамічнай палітыцы краін-удзельніц».

Член Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі пералічыў асноўныя крокі, якія ўжо зробленыя па выкананні пастаўленых кіраўнікамі саюзных дзяржаў задач. ЕЭК распрацавала, а нацыянальныя ўрады падтрымалі асноўныя напрамкі супрацоўніцтва ў многіх сферах: у макраэканамічнай, прамысловай палітыцы, міжнародным супрацоўніцтве, адзінай транспартнай сістэме, падыходах да фарміравання адзіных рынкаў электраэнергетыкі, нафты і газу.

«Калі мы інфармуем кіраўнікоў дзяржаў, мы разумеем, што гэта аб'ёмнае кола пытанняў інтэграцыі ў адзін дзень вырашыць нельга, — заўважыў выступоўца. — Мы разбілі інтэграцыйны рух на часовыя перыяды: тое, што павінна быць зроблена ў кароткі перыяд, сярэдні і да 2025 года — напрацаваць пагадненні, якія стануць моцнай асновай нашага эканамічнага саюза».

У кароткі час павінна быць створана нарматыўная база па асноўных кропках росту эканомікі ў перыяд да 2025 года. «Мы бачым, што існуюць праблемы з дадатковым коштам вытворчых ланцужкоў, мы практычна мала вырабляем цяпер высокатэхналагічнай прадукцыі на знешнія рынкі саюза. Асноўныя артыкулы экспарту складае прадукцыя з дастаткова нізкім узроўнем перапрацоўкі. Неабходны пераход ад эканомікі попыту, якая базіруецца на высокіх цэнах на нафту, да эканомікі прапановы. Пры гэтым інвестыцыі ў новыя тэхналогіі і новыя вытворчасці павінны генерыраваць новую прадукцыю, якая можа пацясніць імпарт і атрымаць новыя нішы на сусветным рынку», — выказаў пазіцыю Калегіі па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе Сяргей Сідорскі.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне глыбокай дыверсіфікацыі вытворчасцей, што здольны замяніць імпарт і павялічыць долю прадукцыі саюза, у тым ліку з арыентацыяй на экспарт. Неабходны дадатковыя фінансавыя інструменты, магчымасць прыцягнення рэсурсаў Еўразійскага банка развіцця і не толькі.

ЕЭК сфармулявала і прапрацавала інструменты ўзаемадзеяння па рэалізацыі кааперацыйных прамысловых праектаў: лізінг, сумесная аналітычная работа банкаў. «Несумненна, трэба абмеркаваць больш цеснае ўзаемадзеянне з новым Банкам развіцця BRIKS, а таксама з азіяцкімі банкамі. Асноўным гульцом тут з'яўляецца Кітай, з якім у апошнія гады мы актыўна развіваем супрацоўніцтва. Мы можам дасягнуць аб'ёму гандлю з Кітаем ужо сёлета ў 100 млрд долараў, але нават з такімі аб'ёмамі мы застаёмся не самым важным яго партнёрам. Але сітуацыя ў свеце змяняецца, і Кітай прызнае, што ўмацаванне адносін з ЕАЭС — стратэгічная задача. Гэта вельмі важны тэзіс, які мы павінны не толькі падтрымаць, але і актыўна яго развіваць», — сказаў Сяргей Сідорскі.

Паўстае пытанне глыбокай дыверсіфікацыі вытворчасцей, што здольны замяніць імпарт і павялічыць долю прадукцыі саюза, у тым ліку з арыентацыяй на экспарт.

«Прэзідэнты краін ЕАЭС прынялі важнае рашэнне ў найбліжэйшай перспектыве выйсці на стварэнне дарожнай карты з Кітаем», — паведаміў міністр ЕЭК. Ён падкрэсліў, што такі амбіцыйны праект, як будаўніцтва Новага шаўковага шляху, які злучыць Азію, Еўропу і Афрыку, створыць новую глабальную эканамічную зону ў 12 тысяч кіламетраў. Гэта запатрабуе пабудовы сучасных хуткасных аўтамабільных дарог, чыгунак, энерга- і аптавалаконных сетак, што дазволіць нашым прамысловым прадпрыемствам актыўна інтэгравацца ў дзеючыя эканомікі, а таксама стварацьновыя прадпрыемствы.

ЕАЭС ужо падпісаў пагаднене аб зоне свабоднага гандлю з В'етнамам. Працягваецца работа па выбудоўванні ўзаемавыгаднай эканамічнай палітыкі паміж ЕАЭС і ЕС. Еўразійская эканамічная камісія актыўна працуе з ААН: у найбліжэйшай сесіі Арганізацыі ЕАЭС будзе ўдзельнічаць ужо як паўнавартасны член сусветнай суполкі. Таксама ЕАЭС працуе з Арганізацыяй па прамысловым развіцці (ЮНІДА). «Падпісалі з імі найважнейшы мемарандум летась, і цяпер гэтая арганізацыя прапанавала нам скласці пагадненне, якое выведзе нашы прамысловыя прадпрыемствы, структуры на больш высокі, новы ўзровень эканамічнага развіцця, супрацоўніцтва з краінамі не толькі ЕС, але і наогул удзельнікамі ААН», — растлумачыў Сяргей Сідорскі.

Кітай прызнае, што ўмацаванне адносін з ЕАЭС — стратэгічная задача.

Арганізатары канферэнцыі ў Маскве разлічваюць, што абмеркаванне пытанняў еўразійскай інтэграцыі дазволіць выпрацаваць эфектыўныя прапановы бізнесу для далейшай работы ЕАБР і ЕЭК, прапановы па выніках канферэнцыі таксама будуць накіраваны ў нацыянальныя ўрады.

Падчас размовы з журналістамі старшыня праўлення Еўразійскага банка развіцця Дзмітрый Панкін паведаміў, што банк амаль узгадніў матрыцу тых мер грашова-крэдытнай палітыкі, якія павінны быць выкананы ў Беларусі для выдзялення ёй крэдыту за кошт Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця. Ён запэўніў, што «ўжо дасягнуты вялікі прагрэс, бо ў асноўным узгоднены тыя крокі, якія павінны быць выкананы па скарачэнні субсідый, па камунальных тарыфах, пытаннях грашова-крэдытнай палітыкі, мэтах па аб'ёме грашовай масы, крэдытным стымуляванні эканомікі». Пытанне знаходзіцца на ўзроўні прыняцця рашэння Саветам фонду.

Таксама кіраўнік банка выказаўся наконт перспектыў увядзення агульнай саюзнай валюты: «Сёння ў ЕАЭС неабходна найперш каардынацыя фінансавай палітыкі. Таму што без яе ўвядзенне адзінай валюты ў Еўразійскім эканамічным саюзе было б памылковым і прывяло б да ўзнікнення дадатковых праблем». Паводле яго слоў, у ЕАЭС ужо існуюць яе элементы. «Краіны пераходзяць на рэжым інфляцыйнага таргетавання, плаваючых валютных курсаў, узгадняюць бюджэтныя падыходы. Такі паступовы працэс можа ў перспектыве прывесці да фарміравання адзінай валюты. Адзіная валюта — гэта вянок працэсу інтэграцыі, — дадаў Дзмітрый Панкін, — а не яе пачатак».

Дзмітрый Панкін заўважыў, што сёння ў свеце налічваецца звыш 90 інтэграцыйных аб'яднанняў, аднак не ўсе яны аднолькава эфектыўныя. Паводле яго ацэнкі, частка з іх знаходзіцца «ў стане комы». «Важнымі фактарамі для паспяховасці інтэграцыйных аб'яднанняў з'яўляецца рэальны эканамічны рост і паляпшэнне дабрабыту насельніцтва дзяржаў-удзельніц. Пры гэтым трэба арыентавацца на зніжэнне бюракратычных бар'ераў у аб'яднанні. Што тычыцца дзейнасці ЕАБР і нашай палітыкі па фінансаванні прапаноў і ініцыятыў у ЕАЭС, то асноўнымі крытэрыямі тут з'яўляюцца надзейнасць праекта, яго эканамічная абгрунтаванасць, а таксама ўзровень магчымай рызыкі. Пакуль мае месца недахоп сапраўды эфектыўных праектаў», — лічыць Дзмітрый Панкін.

Перспектывы членства Таджыкістана ў ЕАЭС пракаментаваў журналістам Сяргей Сідорскі. «Калі кіраўніцтва Таджыкістана выкажа ініцыятыву і жаданне наконт ЕАЭС, то мы гатовы разгледзець усе прапановы. Таджыкістанскія калегі могуць азнаёміцца з усёй дакументацыяй па ЕАЭС, якая знаходзіцца ў адкрытым доступе, рашэнне застаецца за імі», — дадаў міністр ЕЭК.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*
Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*
г. Масква

■ Будаўніцтва

КАЛЯ 3,5 ТЫСЯЧЫ КВАТЭР — ЗА КОШТ ДЗЯРЖПРАДПРЫЕМСТВАЎ

Налета 250 тысяч квадратных метраў жылля (каля 3,5 тысячы кватэр) у нашай краіне запланавана пабудаваць за кошт сродкаў прадпрыемстваў. Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў №898 ад 27 кастрычніка, што апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Прынятым дакументам урад абавязаў фінансаваць будаўніцтва жылля дзяржпрадпрыемствы і акцыянерныя таварыствы (з доляй дзяржавы, вышэйшай за 50%). Самую вялікую частку жылля па гэтай праграме павінны прафінансаваць прадпрыемствы сталіцы (135 тысяч квадратных метраў) і Мінскай вобласці (55 тысяч «квадратаў»). Заданне для Брэсцкай і Гомельскай абласцей складае ў аб'ёме па 15 тысяч квадратных метраў, для Гродзенскай — 12 тысяч, Віцебскай — 11 тысяч, а Магілёўскай вобласці вызначылі пабудаваць усяго 7 тысяч квадратных метраў жылля. Трэба адзначыць, што ў пастанове няма дакладнага ўказання таго, для каго яно будзе будавацца і якое гэта будзе жыллё. Аднак, трэба нагадаць, што кіраўніцтва Мінбудархітэктуры яшчэ ў пачатку года разглядала прапанову аб тым, каб айчынныя прадпрыемствы будавалі за свой кошт арэнднае жыллё.

Савет Міністраў пастанавіў аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму забяспечыць выкананне гэтага задання, а таксама давесці да дзяржаўных арганізацый і гаспадарчых таварыстваў, у статутных фондах якіх больш за 50% акцый належаць дзяржаве, заданні па будаўніцтве жылых памяшканняў. Больш за тое, цяпер выканкамы павінны рэкамендаваць і кіраўнікам камерцыйных арганізацый забяспечваць будаўніцтва жылых памяшканняў за свой кошт. Адзіным паслабленнем для апошніх з'яўляецца адсутнасць канкрэтных планаў па ўводзе такога жылля.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

МАЛАДЗЕЧНА СТАНЕ СТАЛІЦАЙ. КУЛЬТУРНАЙ

Такое рашэнне прынялі ўчора на калегіі Міністэрства культуры Беларусі

На статус культурнай сталіцы будучага года прэтэндавалі два гарады Мінскай вобласці — Слуцк і Маладзечна. Калегіяльны выбар спынілі на другім.

Рэспубліканская акцыя «Культурная сталіца года» праводзіцца з 2010-га. У кожным з гарадоў, абвешчаных культурнай сталіцай, рэалізуюцца інавацыйныя праекты па прэзентацыі культурнай самабытнасці, актывізацыі творчай ініцыятывы, павышэнні турыстычнай прывабнасці рэгіёнаў.

Статус культурнай сталіцы Беларусі першым атрымаў Полацк. Потым эстафету прынялі Гомель, Нясвіж, Магілёў, Гродна. Сёлета тытул «Культурнай сталіцы Беларусі» носіць Брэст. Два гарады — Гомель і Магілёў адначасова мелі статус «Культурная сталіца СНД».

Надзея ПАЎЛАВА.

■ Сталічны час

ПАМІЖ ДУБАЕМ І ЛОНДАНАМ

Як будуць засяляць гарады-спадарожнікі і які новы праспект з'явіцца ў Мінску

Да 5 лістапада працягваюцца грамадскія абмеркаванні карэкціроўкі Генеральнага плана Мінска. Па сваёй сутнасці яна мае значныя змяненні. Адно з галоўных у тым, што спецыялісты адмовіліся ад далейшага тэрытарыяльнага развіцця горада (раней перспектыўная тэрыторыя планавалася большай, цяпер далей за межы мінскай кальцавой сталіца не выйдзе).

КАМЕННУЮ ГОРКУ ПАКІНУЦЬ У СПАКОІ

Увага архітэктараў і праекціроўшчыкаў накіравана не толькі на генплан Мінска, але і на распрацоўку генпланаў гарадоў-спадарожнікаў. Іх ператворацъ у паўнавартасныя гарады са сваёй інфраструктурай.

Па словах **галоўнага архітэктара прадпрыемства «Мінскград» Аляксандра АКЕНЦЬЕВА**, найбольш актыўнае развіццё чакае Рудзенск і Смалявічы. Усяго ў гарадах-спадарожніках колькасць насельніцтва павялічыцца з 90 тысяч да 200 тысяч чалавек. У Рудзенску колькасць жыхароў узрасце з 11 тысяч да 82 тысяч. Гэты прырост, па словах архітэктара, выкліканы тым, што горад мае тэрытарыяльныя рэзервы развіцця, якія не закранаюць сельскагаспадарчыя землі, і іншыя рэсурсы.

Што да канкрэтнага спісу прадпрыемстваў, якія з'явяцца ў гарадах-спадарожніках, то яго пакуль няма, аднак цяпер стаіць задача стварыць умовы для гэтых прадпрыемстваў.

Па словах Аляксандра Акенцьева, сярод зваротаў, якія пакідаюць мінчане падчас грамадскага абмеркавання, большасць звязана з рэканструкцыяй жылых тэрыторый сядзібнай забудовы. Самыя вострыя пытанні тычацца зносу, перасялення і кампенсацыі.

Цікава, што пры абмеркаванні генплана мінчане падзяліліся на два «лагеры». Адны лічаць, што трэба арыентавацца на вопыт азіяцкіх краін і высокую паверхавасць забудовы, шматузроўневыя сістэмы і будаваць горад усходняга ўзору. Другая група раіць абапірацца на еўрапейскі вопыт, адмовіцца ад вышыннага будаўніцтва і ствараць забудову на ўзроўні чатырох паверхаў. **Старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Павел ЛУЧЫНОВІЧ** заўважыў, што Мінску яшчэ далёка да такіх гарадоў, як Дубай і кітайскія мегаполісы, і адзначыў, што ў сталіцы пакуль што дамінуе еўрапейская тэндэнцыя. На яго думку, характар забудовы нашага горада больш нагадвае забудову Лондана.

А вось інфармацыю пра тое, што ў Каменную Горку плануюць засяліць яшчэ 11 тысяч чалавек, старшыня камітэта архітэктуры абверг.

— Перад тым, як распрацоўваць дэталёвы план, разглядаецца некалькі варыянтаў развіцця тэрыторыі. Я магу вас запэўніць, што горад адмовіўся ад размяшчэння дадатковых 11 тысяч новых жыхароў у Каменнай Горцы, — сказаў Павел Лучыновіч.

ЛЁСЫ СЕЛЬГАСПАСЁЛКА І АСМАЛОЎКІ ЯШЧЭ НЕ ВЫРАШАНЫ

Не абмінулі ўвагай адну з «балючых кропак» сталіцы — Сельгаспасёлак. Згодна з дзеючым генпланам, на месцы сённяшняй сядзібнай забудовы там плануюць пабудаваць шматкватэрныя дамы, а ў перспектыве па вуліцы Багдановіча павінен прайсці ўчастак мінскага метро. Жыхары раёна актыўна пратэстуюць супраць гэтага рашэння, патрабуючы адмовіцца ад зносу і зняць усе абмежаванні на рамонт і рэканструкцыю іх сядзіб.

— Ніхто не ставіў задачу татальна зносіць прыватны сектар, і не зусім карэктна казаць пра тое, што Сельгаспасёлак цалкам ідзе пад знос, — зазначыў Павел Лучыновіч. — Улічваючы вялікі сацыяльны рэзананс, выкліканы гэтым пытаннем, улады горада і краіны стварылі рабочую групу, і ўсе гэтыя пытанні цяпер разглядаюцца. Калі група скончыць сваю працу, мы вас азнаёмім з вынікамі. Я думаю, гэта адбудзецца ў найбліжэйшы месяц.

Па-ранейшаму не губляе сваёй вастрыні пытанне лёсу сталічнага раёна Асмалоўка.

— Адносна Асмалоўкі я не гатовы зараз дакладна пацвердзіць, ці ўнесена яна ў пералік аб'ектаў, якія мы рэкамендуем для арганізацыі навукова-даследчых работ, неабходных для абгрунтавання надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Без надання гэтага статусу казаць пра захаванне якіх-небудзь пабудоў на тэрыторыі горада немагчыма. Мы такія тэрыторыі выдзялялі раней, і ў іх пералік уваходзіў і раён вуліцы Кашавога, і водна-зялёны дыяметр. У найбліжэйшыя два гады мы плануем распрацоўку горадабудаўнічага праекта. Ён будзе звязаны з распрацоўкай новага гісторыка-архітэктурнага плана ў межах першага кольца (Асмалоўка ўваходзіць у гэтыя тэрыторыі). Самае галоўнае пытанне, якое мы там будзем разглядаць, — гэта праспект Незалежнасці, які да сёння не мае праекта зоны аховы, — паведаміў Аляксандр Акенцьеў.

Значная частка пытанняў гараджан датычыцца характару арганізацыі руху, будаўніцтва транспартных вузлоў, работы пасажырскага транспарту, рэзананс выклікала і прапанова зрабіць кальцавой чацвёртую лінію метро.

— Часта задаюць пытанне, ці не паўторым мы лёс Масквы: яна таксама мае радыяльна-кольцавую сістэму. Я думаю, што не. Пры развіцці горада да пэўнага моманту такіх праблем не павінна ўзнікаць. На жаль, Масква перайшла гэты парог. У Мінску яшчэ вельмі далёка да гэтых праблем, — адзначыў Павел Лучыновіч.

ЛОШЫЦУ ЧАКАЕ МАСАВАЕ БУДАЎНІЦТВА

На другім месцы пасля пытанняў пра знос прыватнай забудовы стаяць звароты адносна захавання зялёных зон у сталіцы. Архітэктары кажуць, што неабходна захоўваць водна-зялёны дыяметр, у прыватнасці паўкольца Сляпянскай воднай сістэмы, а таксама развіваць другое паўкольца (Лошыца і рака Мышка), бо там знаходзяцца найбуйнейшыя жылыя раёны горада і зеляніны там не хапае.

Яшчэ адно пытанне, датычнае Лошыцы, паступіла ў рэдакцыю «Звязды» літаральна на днях. Прыватныя сядзібы пасёлка, што каля парку, пойдуць пад знос, і на іх месцы плануюць пабудаваць шматпавярховікі. Жыхары занепакоены не толькі тым, што знікне своеасаблівы «анклаў», дзе жывуць амаль адны навукоўцы, але пад пагрозай знікнення ў гэтым раёне апынуцца рэдкія віды раслін, перастануць гнездавацца салаўі.

— Гэта ўсё ж дзве розныя тэрыторыі. У нас ёсць пэўныя пытанні па той, якая прымыкае да Лошыцкага парку бліжэй да Серабранкі. Там сапраўды ёсць рэдкія віды раслін. Што тычыцца пасёлка навукоўцаў, у Ленінскім раёне цяпер пачынаюцца грамадскія абмеркаванні гэтага дэталёвага плана, таму што Лошыца — адна з перспектыўных пляцовак для масавага будаўніцтва. Але магу сказаць, што прынцып захавання паніжанай паверхавасці тэрыторыі, якая прымыкае да парку, захаваны, — патлумачыў Павел Лучыновіч (больш падрабязна пра гэтую тэму «Звязда» абавязкова раскажа).

— Гэтая тэрыторыя распрацоўваецца нашымі калегамі з «Мінскпраекта», і я хацеў бы звярнуць увагу на тое, што вуліца Маякоўскага і яе працяг па новай магістралі ў бок Гатава будзе для горада адным з галоўных праспектаў. І мы павінны будзем максімальна стварыць і архітэктурны, і горадабудаўнічы ансамбль, дастойны нашай сталіцы, з боку Гомеля. І калі атрымаецца захаваць нейкую частку забудовы, верагодна, гэта будзе зроблена, — падсумаваў галоўны архітэктар «Мінскграда».

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

■ Ну і ну!

ПЯЦЬ ПРАТАКОЛАЎ НА ПАРУШАЛЬНІКА

Вечарам на вуліцы Савецкіх пагранічнікаў у Гродне кіроўца «Рэно» чакаў разгрузкі тавару, як раптам адчуў удар у сваю машыну.

Выйшаўшы з кабіны, ён убачыў, што стаў удзельнікам дарожна-транспартнага здарэння. Віноўнік аварыі, кіроўца «Фольксвагена», паспрабаваў дамовіцца, каб не выклікаць супрацоўнікаў ДАІ. Аднак пацярпелы, убачыўшы, што той знаходзіцца ў нецвярозым стане, стаў тэлефанаваць у дзяжурную часць Дзяржаўтаінспекцыі. І тады віноўнік аварыі, кінуўшы свой аўтамабіль, збег з месца здарэння.

Неўзабаве інспектары ДАІ затрымалі парушальніка і склалі на яго пяць адміністрацыйных пратаколаў. Адзін з іх — за здзяйсненне аварыі ў стане ап'янення. Другі — за кіраванне транспартным сродкам, не маючы на тое права, паколькі раней мужчыну ўжо пазбавілі вадзіцельскага пасведчання за «п'яную» язду. Як бачна, ніякіх высноў на будучыню ён не зрабіў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Злачынства і пакаранне

ПРЫСУД ЗА ГАШЫШ

У Брэсце вынесены прысуд па рэзанансной справе аб кантрабандзе вялікай партыі наркотыкаў. Адзін фігурант справы атрымаў — 17, другі — 16 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Кантрабанду затрымалі на беларуска-польскай мяжы ў канцы мінулага года. У тайніку было 344 кілаграмы гашышу. Каб ажыццявіць гэты злачынны праект, 37-гадовы прадпрымальнік зарэгістраваў у Брэсце асобную фірму. На яе адрас і быў накіраваны чыгуначны вагон з Польшчы з гранітнай брусчаткай.

Унутры грузу адпраўшчыкі схавалі пакеты з гашышам. А каб не было праблем з мытным афармленнем, прадпрымальнік загадзя дамовіўся з мытнікам. 40-гадовы служачы мытні распрацаваў свой план і паспрабаваў прыцягнуць да справы інспектара мытнага паста. Але апошні ад удзелу ў сумніўным праекце адмовіўся. 9 снежня ў пункце мытнага афармлення «Брэст-Усходні» груз агледзелі, як след. Была знойдзена 521 упакоўка з наркотыкам. Прыкладны кошт атрутнага зелля на чорным рынку складае 4,5 мільёна долараў.

Суд Маскоўскага раёна Брэста прызнаў прадпрымальніка вінаватым у кантрабандзе наркатычных сродкаў у буйным памеры і прызначыў пакаранне ў выглядзе 16 гадоў пазбаўлення волі і канфіскацыі маёмасці. А былы супрацоўнік мытных органаў правядзе за кратамі 17 гадоў. Яго маёмасць таксама падлягае канфіскацыі.

Рашэнне суда пакуль не ўступіла ў законную сілу і можа быць абскарджана.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Навука і людзі

СВЕТ УРАТУЮЦЬ... ГУМАНІТАРЫІ?

Што можна супрацьпаставіць эканамізацыі чалавечых адносін

Стварэнне ў Нацыянальнай акадэміі навук так званых кластараў — установ, скіраваных на пашырэнне даследаванняў на міжведамасным і міжнародным узроўнях — закранула і гуманітарныя інстытуты. Дарэчы, беларускім вучоным у гэтай сферы ёсць чым ганарыцца. Напрыклад, па колькасці выдадзеных за год у акадэмічным выдавецтве кніг яны пераўзыходзяць сваіх больш шматлікіх калег з прыродазнаўчых устаноў (і не дзіва, бо менавіта кніга — галоўны плён працы любога навукоўца-гуманітарыя). У якім стане айчыннае «чалавеказнаўства» цяпер і куды яно будзе рухацца? Якія праекты рэалізуюцца? Пра гэта распавялі кіраўнікі гуманітарных устаноў Акадэміі навук.

ВЕДЫ НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ АБРАНЫХ

Ці не страчваюць сваю вартасць гуманітарныя даследаванні ў сучасным свеце? На думку **акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандра КАВАЛЕНІ,** развіццё прыродазнаўчых дысцыплін сёння значна апераджае духоўны стан чалавецтва. Але гэта не нагода для вялікай радасці, бо навуковы прагрэс, не ўраўнаважаны маральнымі каштоўнасцямі, можа прывесці да глабальных катастроф.

— Трэба сказаць, што цывілізацыя ў вялікай ступені эканамізавала адносіны паміж людзьмі, а грамадства штучна падштурхоўваецца да таго, што я назваў бы рэлігіяй прагрэсу, — зазначае Аляксандр Каваленя. — Сёння многае, у тым ліку душа і цела чалавека, разглядаецца праз прызму камерцыйнага поспеху. Але эканоміка — гэта толькі частка грамадскага жыцця, і развіццё грамадства без духоўных і культурных арыенціраў будзе тупіковым шляхам.

Аддзяленне гуманітарных навук НАН працуе згодна з дзяржаўнай праграмай навуковых даследаванняў на 2011—2015 гады «Гісторыя. Культура. Грамадства. Дзяржава», вялікую дапамогу ў гэтым аказваюць айчынныя ВНУ. Штогод выдаецца прыкладна 500 кніг, у тым ліку 200 манаграфій, падрыхтоўваецца 250 вучэбных дапаможнікаў, карт, атласаў. Не апошняе месца ў дзейнасці навукоўцаў займае і ўдзел у навуковых канферэнцыях, на якіх адстойваюць беларускі пункт гледжання на шматлікія пытанні.

— Вядома, ёсць і праблемы, — кажа Аляксандр Каваленя. — Трэба канстатаваць, што публікацыі па выніках нашых навуковых даследаванняў маюць абмежаваны тыраж — 100, 150, максімум 1500 асобнікаў. А гэта значыць, што праца вучоных не знаходзіць шырокай аўдыторыі, яна скіравана толькі на вузкае кола тых, хто займаецца адпаведнымі праблемамі. А хацелася б, каб наша пазіцыя даходзіла не толькі да грамадзян Беларусі, але і да замежных супольнасцей.

Для вырашэння сітуацыі робяць адпаведныя захады. У гуманітарных інстытутах Акадэміі навук узнік шэраг кластараў: Міжнародная школа гісторыка-археалагічных даследаванняў, Рэспубліканскі цэнтр фундаментальнай і практычнай філасофіі, Міжнародны цэнтр беларускай культуры, Міжнародная школа беларускай мовы і культуры, Рэспубліканская лабараторыя гісторыка-культурнай спадчыны. Пад іх эгідай працуюць не толькі вядомыя навукоўцы з Беларусі і замежжа, але і падрастаючае пакаленне, у тым ліку школьнікі.

ЖЫЦЬ НЕ ВЁСКАЙ АДЗІНАЙ

— Падчас глабалізацыі справа захавання культурнай і моўнай разнастайнасці патрабуе ўвагі да праблем менавіта нацыянальнай культуры, — мяркуе **дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр ЛАКОТКА**. — У тым ліку і для гэтых мэт у нашай установе быў створаны адзін з кластараў — Міжнародны цэнтр беларускай культуры.

Адна з галоўных яго задач — стварэнне новай парадыгмы разумення беларускай культуры. Па словах Аляксандра Лакоткі, больш за 70 гадоў перад тым, як Беларусь пачала будаваць уласную суверэнную дзяржаву, наша нацыянальная культура пазіцыянавалася ў асноўным як культура вясковая, сялянская. Амаль не ішло гаворкі аб тым, што полацкія князі былі вельмі адукаванымі па тых часах людзьмі, што беларуская навука часоў Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага знаходзілася на сусветным узроўні. І гэта не кажучы пра эпоху Вялікага Княства Літоўскага, падчас якой на Беларусь прыйшла культура Рэнесансу.

Развіццём такой парадыгмы і займаецца інстытут. Распачата новая серыя «Нарысаў гісторыі і культуры Беларусі» ў чатырох тамах. Першыя два ўжо пабачылі свет, яны прысвечаны адпаведна культуры сацыяльнай эліты і гісторыі гарадоў. Яшчэ два распавядуць пра сялянскую культуру. Іншая задача — стварыць сістэмнае выданне рухомых помнікаў гісторыі і культуры. Размова ідзе пра вялікую колькасць твораў манументальнага, сакральнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, якія знаходзяцца ў рэлігійных установах, музеях, прыватных калекцыях, у тым ліку за мяжой.

СЛОВА ПРА МОВУ

— Цяпер завяршаецца падрыхтоўка дзяржаўнай праграмы даследаванняў у сферы гуманітарных навук на наступныя пяць гадоў, — распавядае **першы намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ**. — Яна якраз ахоплівае тыя праекты, якія распрацоўваюцца гуманітарыямі нашай краіны. Асобнай падпраграмай выдзелена беларуская мова і літаратура, што сведчыць пра важнасць гэтага кірунку.

Сярод прац беларускіх мовазнаўцаў можна адзначыць даследаванні лексікаграфіі, бо лексічны склад мовы працягвае змяняцца і час вымагае стварэння новага і актуальнага тлумачальнага слоўніка. Цэлы шэраг прац датычыцца граматычнага ладу беларускай мовы, вынікам якіх стане новая акадэмічная граматыка. У ёй будуць зафіксаваны ўсе тэндэнцыі ў словазмяненні і сінтаксісе. Яшчэ адзін аспект — вывучэнне нашай нацыянальнай мовы ў супастаўленні з рускай і іншымі славянскімі.

На наступны год запланавана перавыданне аднатомнага «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» ў адпаведнасці з новымі правіламі арфаграфіі, перавыданне «Граматычнага слоўніка беларускай мовы» (дзе пададзены ўсе словаформы кожнага слова). Рыхтуецца да выхаду чарговы тэрміналагічны слоўнік — па металургіі. Па ініцыятыве пасла Італьянскай Рэспублікі абмяркоўваецца пытанне стварэння беларуска-італьянскага слоўніка. Працуюць нашы мовазнаўцы і над міжнароднымі праектамі, такімі як агульнаславянскі лінгвістычны атлас, у якім усе моўныя з'явы і дыялекты славянскіх народаў будуць пазначаны на карце.

— Вельмі важныя задачы стаяць і перад нашымі літаратуразнаўцамі, — зазначае член-карэспандэнт НАН. — Гэта ў першую чаргу вызначэнне месца беларускага мастацтва слова ў сусветным літаратурным працэсе, а таксама ролі літаратуры ў духоўным удасканаленні грамадства. Атрыманне беларускай пісьменніцай Нобелеўскай прэміі арыентуе нас на больш глыбокія даследаванні такога феномена, як рускамоўная літаратура Беларусі.

«ПРЫЗЯМЛІЦЬ» НАВУКУ АБ ВЫСОКІМ

Як сцвярджае **дырэктар Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Анатоль ЛАЗАРЭВІЧ**, менавіта цяпер прыйшоў той час, калі людзям трэба змяняць сваё стаўленне да філасофіі як да выключна тэарэтычнай навукі. Тэорыя пазнання, тэорыя творчасці, логіка, тэорыя аргументацыі, этыка, антрапалогія, філасофія рэлігіі — усё гэта складнікі філасофскага вучэння, якія могуць дапамагчы ў вырашэнні паўсядзённых праблем чалавека.

Над задачай прымянення філасофскага вучэння ў штодзённым жыцці працуе Рэспубліканскі цэнтр фундаментальнай і практычнай філасофіі — кластар, створаны на базе інстытута.

— У межах кластара мы ствараем цэнтры, арыентаваныя выключна на практыку, — распавядае Анатоль Лазарэвіч. — Напрыклад, Цэнтр упраўлення ведамі і кампетэнцыямі. У гэтай установы ёсць дамова з Міністэрствам прамысловасці, паводле якой нашы спецыялісты праводзяць семінары і трэнінгі для інжынерна-тэхнічнага персаналу многіх прадпрыемстваў. Інавацыйны менеджмент, упраўленне кампетэнцыямі — гэта той патэнцыял, які нам трэба задзейнічаць, не абапіраючыся толькі на адміністрацыйны рэсурс дзяржавы. Работнікі прадпрыемстваў самі павінны шукаць шляхі інавацыйнага развіцця, а гэта залежыць ад сістэмы кіравання.

Аналагічныя методыкі ёсць для школьнай адукацыі, маральна-псіхалагічнага клімату на прадпрыемствах і іншых сфер. Асобна можна вылучыць праект «Філасофія для дзяцей». Па словах навукоўца, вельмі важна з дзяцінства прывучыць малых да правільнай логікі, аргументацыі, самастойнага пошуку адказаў на ўласныя пытанні.

БЕЛАВЕЖСКІ СКАНСЕН — У БЛІЗКАЙ БУДУЧЫНІ

Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці, па якіх працуе Інстытут гісторыі НАН, — уласна гісторыя, археалогія і антрапалогія. Ужо больш за год існуе Цэнтр гісторыі геапалітыкі. Кластар, які ствараюць на базе інстытута, Міжнародная школа гісторыка-археалагічных даследаванняў займаецца правядзеннем сумесных даследаванняў з гісторыкамі іншых краін. Сярод іх першая Міжнародная школа гісторыкаў краін СНД, што была прысвечана праблематыцы Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, Міжнародная летняя школа для аспірантаў і студэнтаў па праблеме Першай сусветнай вайны, беларуска-французская археалагічная экспедыцыя на месцы пераправы войскаў Напалеона праз Бярэзіну і іншыя.

— Галоўная перавага, якую дало нам стварэнне кластара — гэта замацаванне сувязяў з гісторыкамі іншых краін і вывядзенне нашых напрацовак на міжнародны ўзровень, — патлумачыў **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ**. — Бо мы не павінны, што называецца, «варыцца ва ўласным соку». Трэба даносіць свой погляд да міжнароднай гістарычнай супольнасці і адстойваць яго ў дыскусіях з калегамі з-за мяжы.

Ужо ідзе праца над стварэннем першага ў Беларусі археалагічнага скансена (этнаграфічнага комплексу і музея пад адкрытым небам, ад назвы аднайменнай установы на востраве Юргардэн у Швецыі). Размясціць яго плануюць у Белавежскай пушчы. І тут таксама спатрэбіцца досвед замежных калег, бо падобныя музеі ўжо працуюць у суседняй Польшчы і іншых краінах.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Рэйд

ДА ЗІМЫ... НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

На мехдвор прадпрыемства «Саўгас «Патапаўскі», што ў Буда-Кашалёўскім раёне, мы разам з супрацоўнікамі Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях прыехалі нечакана. Дарэчы, мэтай такога рэйду стала праверка гатоўнасці да магчымых надзвычайных сітуацый ва ўмовах зімовага надвор'я. Вартаўніца доўга раілася з кімсьці, ці можна пускаць людзей у форме і з адпаведнымі пасведчаннямі на ахоўваемую тэрыторыю і, нарэшце, дазволіла.

Спецыяліст упраўлення МНС Яўгеній КАЗЛОЎ папрасіў правесці нас у памяшканне, дзе звычайна знаходзіцца сама вартаўніца. Звярнулі ўвагу на няўстойлівую падлогу і шмат недакуркаў. Дарэчы, пабывалі і ў невялічкім памяшканні, дзе ля самаробнай металічнай печкі, па словах ахоўніцы, грэюцца механізатары.

— Па якім нумары тэлефона будзеце выклікаць пажарных? — спытаў ратавальнік. Адказ быў спачатку ўпэўнены:

— 102, як паўсюль. Ці, можа, усё ж 103? Або 104?

Калі б гэта была выпадковасць!.. На жаль, любыя камбінацыі з трох лічбаў, акрамя той, што патрэбна, называлі ўсе радавыя супрацоўнікі гэтай гаспадаркі. Не ведалі яны і правілаў пажарнай бяспекі пры правядзенні агнявых работ. Няспраўнымі былі вогнетушыцелі.

На малочнай ферме ў Патапаўцы, дзе ўтрымліваецца больш за 1000 галоў жывёлы, сітуацыя аналагічная. Далей — больш. Каровы на ферме ў вёсцы Зарэчча павольна жавалі аўсяную салому, а супрацьпажарныя шчыты дэманстравалі... цнатлівасць. Інвентар з прычыны «каб не пакралі» захоўваўся асобна, у зачыненым памяшканні.

Урэшце, ратавальнікі склалі вялізны спіс парушэнняў. Сярод іх самыя тыповыя: людзі, якія здзяйсняюць абслугоўванне і эксплуатацыю ацяпляльнага абсталявання, увогуле не ведаюць элементарных правілаў паводзінаў у выпадку, калі нешта загарыцца. На пажарных шчытах інвентару ці няма, ці ён далёка не ўвесь...

Печка на ферме ў в. Патапаўка.

Вогнетушыцель на мехдвары ў в. Патапаўка.

Вельмі хацелася атрымаць нейкі каментарый на гэты конт ад кіраўніцтва прадпрыемства «Саўгас «Патапаўскі». Але ж і дырэктар Мікалай Алісейка, які ўзначаліў гаспадарку менш чым два месяцы таму, і галоўны інжынер на сувязь са службай МНС так і не выйшлі.

Дарэчы, папярэдняя праверка тут праводзілася ў маі, пра што расказаў **інспектар нагляду і прафілактыкі Буда-Кашалёўскага аддзела МНС Аляксандр ХАЦУЛЁЎ**. Вось тады было прапанавана правесці 69 мерапрыемстваў. Цяпер ужо восень заканчваецца, а ў гаспадарцы амаль усё засталося так, як і вясной.

— Акрамя таго, сцірты грубых кармоў не абагнаны ахоўнай паласой. Ёсць характэрныя парушэнні для многіх сельскагаспадарчых аб'ектаў, але тут яны найбольш значныя, — адзначае **спецыяліст Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Яўгеній КАЗЛОЎ**. — На ўсіх аб'ектах адсутнічаюць першасныя сродкі пажаратушэння. Нават калі ёсць — у няспраўным стане. Паўсюдна выкарыстоўваюцца саматужныя печы. Супрацоўнікі не ведаюць элементарнага — як паводзіць сябе пры ўзнікненні пажару, як выклікаць службу МНС.

Кіраўнік спраў Патапаўскага сельвыканкама Алена ДЗЕМЯНКОВА расказала, што ў прыватным сектары да зімы правялі абследаванне ўсіх катэгорый: шматдзетных, адзінокіх, адзінока пражываючых і грамадзян групы рызыкі.

— Некаторых наведалі па два разы. Там, дзе былі заўвагі, правяралі — ці выправілі хібы. У асноўным людзі замазвалі расколіны печак, некалькі чалавек перарабілі грубкі і праводку новую зрабілі. Дапамогу на правядзенне гэтых работ мы людзям аказвалі праз сацыяльныя службы — у выканкаме для гэтага сродкаў няма, і гаспадарка наша не можа дапамагчы. Яшчэ звязваемся з дзецьмі, чыя сталыя бацькі на нашай тэрыторыі жывуць. Яны звычайна адклікаюцца і аказваюць неабходную дапамогу сваякам.

У таварыстве «Стаўбунскі» Веткаўскага раёна было таксама знойдзена шмат парушэнняў, аднак тут многія супрацоўнікі ўсё ж ведалі, што ў выпадку пажару тэлефанаваць трэба «101». Дарэчы, і кіраўнік быў на сувязі. Эльбрус Шчылаеў, які нядаўна стаў дырэктарам, паабяцаў, што будзе выпраўляць выяўленыя недахопы.

Дарэчы, на тэрыторыі Гомельскай вобласці знаходзіцца 210 аб'ектаў аграпрамысловага комплексу. На іх сёлета адбылося 16 пажараў. Спецыялісты МНС канстатуюць, што абсалютная большасць узнікла «з прычыны, звязаных з чалавечым фактарам». Гэта ці неасцярожнае карыстанне агнём, ці парушэнне правілаў пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі электраабсталявання. Гараць найчасцей за ўсё складскія памяшканні, фермы і збожжасховішчы. Найбольш складаная сітуацыя з пажарнай бяспекай на сельскагаспадарчых аб'ектах Жлобінскага, Веткаўскага і Нараўлянскага раёнаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Педсавет

ПРЫМЕРАЙЦЕ РОЛЮ НАСТАЎНІКА

Чаму не кожнага выдатніка будуць рады бачыць у школе ў якасці педагога?

Выпускнікі профільных педагагічных класаў, якім плануюць даць магчымасць паступлення на педагагічныя спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў без экзаменаў, павінны будуць прадаставіць у прыёмную камісію партфоліа, складзенае школьнымі настаўнікамі. Пра гэта расказаў удзельнікам круглага стала рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, прафесар Аляксандр ЖУК. У цэнтры ўвагі адміністрацый школ і прадстаўнікоў органаў кіравання аказаліся пытанні функцыянавання профільных педагагічных класаў.

ПАГЛЫБЛЕННЕ Ў ПРАФЕСІЮ

Ва ўстановах адукацыі нашай краіны функцыянуюць 102 педагагічныя класы і групы, у якіх навучаюцца каля 1,5 тысячы дзесяцікласнікаў. Вялікая арганізацыйная работа была праведзена на Міншчыне: як вынік — у вобласці ў 35 установах адукацыі створана 10 педагагічных класаў і 29 профільных груп. Затое ў сталіцы адкрыта ўсяго 8 педагагічных класаў у 5 школах і гімназіях Фрунзенскага, Цэнтральнага і Партызанскага раёнаў. А ў чатырох раёнах горада не створана ніводнага педагагічнага класа, хоць для сталічных устаноў адукацыі кадравае пытанне стаіць найбольш востра.

Піянерам у адраджэнні педагагічных класаў стала 20-я сталічная гімназія: тут яшчэ год таму былі адкрыты чатыры профільныя 10-я класы, якія ўзяў пад сваю апеку Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Фактычна яны пачалі функцыянаваць, калі ў краіне яшчэ не была створана для іх нарматыўна-прававая база. Але ў гэтым навучальным годзе ўсё было прадумана да дробязяў загадзя. Для старшакласнікаў быў распрацаваны факультатыўны курс «Уводзіны ў педагагічную прафесію», разлічаны на два гады (усяго 140 гадзін) і падзелены на чатыры змястоўныя модулі: «У свеце педагагічнай прафесіі», «Чалавек, які пазнае: практычная псіхалогія пазнання», «Я ў педагагічнай прафесіі» і «Пазнай самога сябе».

— Для таго, каб сфарміраваць у старшакласнікаў матывацыю і ўмацаваць іх рашэнне стаць педагогам, вельмі важна, каб гэты факультатыў вялі ўлюбёныя ў сваю прафесію настаўнікі, якія дасягнулі ў ёй пэўных вышынь: педагогі вышэйшай катэгорыі, настаўнікі-метадысты, фіналісты і ўдзельнікі конкурсу «Настаўнік года». Прафесіяналы, якія на ўласным прыкладзе дэманструюць, што ў педагогіцы ёсць месца паспяховым і ўпэўненым у сабе людзям. А калі факультатыў будзе весціся фармальна і педагог будзе проста «адбываць свой час», то мы атрымаем зусім не той эфект, які чакаем, — лічыць Аляксандр Жук. — Па запытах школ і гімназій да правядзення факультатыўных заняткаў могуць прыцягвацца і прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэтаў, спецыялісты ў галіне педагогікі і псіхалогіі. Зараз, напрыклад, тры выкладчыкі БДПУ вядуць факультатыўны курс у школах Мінска і Мінскай вобласці. Мы павінны праводзіць працу па прафарыентацыі на педагагічную прафесію з разуменнем яе выключнай важнасці. Які настаўнік — такая і школа. Таму наша праца ў профільных класах скіравана на тое, каб закласці добры фундамент для падрыхтоўкі будучага педагога. Матывацыя да прафесіі — гэта, напэўна, самае важнае.

Рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК адкрывае педагагічныя класы ў 20-й сталічнай гімназіі.

У 126-й сталічнай школе вучняў «пратэсціравалі» на педагагічныя страхі. «Не змагу знайсці падыход да дзяцей і зацікавіць іх» — гэтае апасенне аказалася на першым месцы.

Чаго яшчэ баяцца падлеткі, якія пакуль не зрабілі канчаткова выбар на карысць педагогікі? «Буду хвалявацца і разгублюся». «Дзеці не будуць мяне слухацца і паважаць». «Я буду дрэнным педагогам». Ці знікне іх няўпэўненасць праз два гады? Педагогі спадзяюцца, што іх выхаванцы будуць успамінаць свае апасенні з усмешкай...

НЕ РАСЧАРАВАЦЦА Ў ВЫБАРЫ

Сутнасць профільнай падрыхтоўкі будзе заключацца ў вывучэнні двух прадметаў (матэматыкі, фізікі, мовы ці іншых) на павышаным узроўні плюс факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Гэта першая мадэль. Другая мадэль — стварэнне груп з розных класаў паралелі, якія будуць вывучаць вышэйзгаданы факультатыўны курс. І трэцяя мадэль — стварэнне ў сельскай мясцовасці міжшкольнага факультатыву.

Такім чынам, педагагічныя спецыяльнасці атрымаюць праз два гады якаснае папаўненне: з аднаго боку, прыйдуць паступаць абітурыенты з добрай падрыхтоўкай па школьных дысцыплінах, а з іншага — людзі, якія ведаюць спецыфіку будучай прафесіі і зрабілі свядомы выбар.

Мяркуецца, што **паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў змогуць толькі тыя выпускнікі, якія маюць адзнакі 7 і вышэй балаў па ўсіх прадметах вучэбнага плана.** Настаўнікі, якія працуюць у педагагічных класах, не хаваюць, што некаторыя дзесяцікласнікі прыйшлі ў педагагічныя класы толькі для таго, каб атрымаць добрую падрыхтоўку па пэўных прадметах. Але наведванне факультатыву прымусіла іх па-іншаму паглядзець на педагагічную прафесію. Больш за тое, з'явіліся ўжо і іншыя ахвотныя наведваць гэты курс.

«Прывілея паступлення без экзаменаў у ВНУ павінна быць чымсьці падмацаваная. І звычайнай характарыстыкі-рэкамендацыі будзе ў гэтым выпадку недастаткова».

Змест праграмы факультатыўных заняткаў прымушае старшакласнікаў шукаць адказы на шэраг пытанняў. Якія патрабаванні прад'яўляюцца да настаўніка? Што ён павінен умець? Якімі якасцямі павінен валодаць? Ці магу я быць настаўнікам? Ці ёсць у мяне прафесійна важныя якасці? І гэтак далей.

РАЗГЛЕДЗЕЦЬ БУДУЧАГА КАЛЕГУ

— І ўсё ж мы разумеем, што не ўсіх школьных выдатнікаў ці «харашыстаў» можна дапускаць у школу ў якасці педагогаў, — канстатуе Аляксандр Жук. — Менавіта таму і ўзнікла неабходнасць запаўнення партфоліа. Усё ж такі прывілея паступлення без экзаменаў у ВНУ павінна быць чымсьці падмацаваная. І звычайнай характарыстыкі-рэкамендацыі будзе ў гэтым выпадку недастаткова. Вельмі важнае значэнне мае паглыбленне школьніка ў педагагічную прафесію. Трэба даць яму магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі настаўніка, таму школьныя педагогі павінны фіксаваць дасягненні сваіх вучняў цягам двух гадоў: працу важатымі, памочнікамі класных кіраўнікоў у малодшых класах, валанцёрамі ў аздараўленчых лагерах, удзел у арганізацыі розных школьных мерапрыемстваў і гэтак далей. Адным словам, характарыстыка павінна быць змястоўнай. А калі падлетак прапусціў палову факультатыўных заняткаў, то наўрад ці яго можна лічыць матываваным выпускніком і тым больш ствараць яму асаблівыя ўмовы пры паступленні.

Сфатаграфавацца са скульптурнай кампазіцыяй «Настаўніца першая мая» на ўваходзе ў БДПУ — традыцыя. Вучні вочна-завочнай педагагічнай гімназіі не сталі яе ігнараваць.

Педагогі з такой пастаноўкай пытання пагаджаюцца, толькі просяць: не пераўтварайце нашу місію ў папяровую валакіту, не афармалізоўвайце працу, а вызначыце той мінімум інфармацыі, якую павінна ўтрымліваць партфоліа. Тым больш, што адна вучэбная чвэрць ужо прайшла.

— Я ведаю, ёсць апасенні, што праз пэўны час колькасць выпускнікоў педагагічных класаў можа аказацца большай за колькасць месцаў на педагагічных спецыяльнасцях. Няхай сярод іх будзе конкурс. Гэта нават добра! — лічыць рэктар БДПУ. — У некаторых еўрапейскіх краінах, дзе таксама сутыкнуліся з падзеннем прэстыжу прафесіі настаўніка, час ад часу скарачаюць прыём на педагагічныя спецыяльнасці, каб штучна стварыць на іх конкурс. І ў грамадстве складваецца меркаванне, што паступіць у педагагічны ўніверсітэт дастаткова складана, а значыць, прэстыжна. Мы, вядома, так рабіць не будзем, але здаровая канкурэнцыя павінна прысутнічаць.

КАНКУРЭНЦЫЯ ПАМІЖ МЕДАЛІСТАМІ

Дарэчы, калі на ўзроўні краіны два гады таму прымалася рашэнне прадаставіць школьным медалістам і ўладальнікам дыпломаў з адзнакай магчымасць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў, у гэтага рашэння хапала скептыкаў. Казалі: няўжо медалісты адмовяцца ад паступлення на больш прэстыжныя спецыяльнасці? Але яны прыйшлі. Прычым палова ад агульнай колькасці медалістаў, якія зрабілі выбар на карысць педагогікі, прынесла свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Яны паверылі ў тое, што іх тут чакаюць. У БДПУ сфармулявалі 10 прычын, з якіх трэба паступаць менавіта да іх. Медалістам накіроўвалі асабістыя запрашэнні ад рэктара. І ў гэтым годзе на першым курсе тут вучацца 132 медалісты. У выдатнікаў самай вялікай папулярнасцю карыстаўся факультэт спецыяльнай адукацыі, куды падалі свае дакументы 19 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай, факультэт беларускай і рускай філалогіі (17 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай) і фізіка-матэматычны факультэт (15 медалістаў).

Разам з тым, на філалагічны факультэт не змагла прайсці абітурыентка з сумай балаў 324! Дзяўчына планавала вывучаць у педуніверсітэце рускую мову і літаратуру. На гэтую спецыяльнасць было вылучана ўсяго 15 бюджэтных месцаў. І менавіта сюды падалі свае дакументы 10 медалістаў і 6 выпускнікоў з мэтавымі накіраваннямі ад аддзелаў адукацыі. Такім чынам, на звычайны конкурс бюджэтных месцаў увогуле не засталося. Дзяўчыне прапанавалі платную форму навучання, але ўніверсітэт выплачвае ёй рэктарскую стыпендыю.

Футуролагі сцвярджаюць, што ў сярэдзіне бягучага стагоддзя ў тройку самых запатрабаваных прафесій увойдуць тры: спецыяліст у сферы IT, урач і педагог. Таму застацца без працы шанцы ў настаўнікаў — мінімальныя...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Паралелі

ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ ЦІ БЯСПЕКА Ў ШКОЛЕ?

Выбар установы адукацыі для дзіцяці — актуальны для многіх бацькоў. Натуральна, што дарослыя гатовыя інвеставаць свой час і рэсурсы ў пошук навучальнай установы, а дапамогай бацькам у эпоху інтэрнэту становяцца розныя рэйтынгі альбо спецыялізаваныя форумы.

Праўда, назіраецца і сустрэчны рух — школам таксама цікава меркаванне бацькоў. Інфармацыя пра тое, як і па якіх крытэрыях дарослыя выбіраюць установу адукацыі для сваіх дзяцей, мае значэнне пры распрацоўцы стратэгіі развіцця школы.

У міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў PISA-2012 бацькам навучэнцаў з адзінаццаці краін было прапанавана ацаніць па значнасці адзінаццаць фактараў, якія, на думку даследчыкаў, могуць адыгрываць вырашальную ролю пры выбары навучальнай установы для дзіцяці. Згадваліся крытэрыі, звязаныя з якасцю выкладання, фінансавымі пытаннямі, адлегласцю паміж домам і школай, атмасферай ва ўстанове адукацыі, філасофіяй школы (пад апошнім меліся на ўвазе педагагічныя падыходы, выкладанне рэлігіі) і г.д.. Для ацэнкі прапанаваных фактараў выкарыстоўвалася шкала з варыянтамі адказаў («вельмі важны» і «няважны»).

Цікава, што для многіх дарослых спрыяльная атмасфера ў навучальнай установе, а таксама яе рэпутацыя і ўзровень бяспекі аказаліся значна важнейшыя за ўзровень паспяховасці вучняў. Той факт, што многія разглядаюць пытанні бяспекі як крытэрый нумар адзін пры выбары школы для свайго дзіцяці, адлюстроўвае тэндэнцыю ўзрастання ўзроўню трывожнасці дарослых у сувязі з ростам гвалту як унутры ўстаноў адукацыі, так і ў знешнім асяроддзі.

Адлегласць ад дома да навучальнай установы таксама разглядаецца бацькамі як важны фактар пры выбары школы (пасля фінансавых пытанняў і філасофіі школы). Такое ранжыраванне пераваг назіраецца практычна ва ўсіх краінах, якія ўдзельнічалі ў даследаванні. Толькі ў Ганконгу філасофія школы мела большае значэнне ў параўнанні з фінансавымі пытаннямі. У Чылі бацькі ўказалі на фінансавы крытэрый як на больш значны ў параўнанні з адлегласцю ад навучальнай установы да дома, а ў Італіі адналькава ацэньваюць значнасць гэтых двух фактараў.

У выніку праведзенага даследавання выявілася наступная заканамернасць. Калі для бацькоў школьнікаў актуальны фінансавыя пытанні, то пытанні якасці навучання адступаюць на другі план. Большасць бацькоў жадае, каб іх дзеці вучыліся ў найлепшай школе, але не кожны можа сабе дазволіць кіравацца толькі якасцю адукацыі.

Між іншым, навучэнцы, бацькі якіх ставяць на першае месца навучальныя дасягненні, маюць па матэматыцы на 46 пунктаў больш у параўнанні з тымі, чые бацькі разглядаюць дадзены крытэрый як нязначны. Навучэнцы, чые бацькі больш заклапочаны фінансавымі пытаннямі, набіраюць меншую колькасць балаў у параўнанні з аднагодкамі, бацькі якіх не надаюць фінансам асаблівага значэння.

Такія вынікі выклікаюць заканамернае пытанне: ці прыводзіць праблема выбару навучальнай установы да адналькава станоўчых вынікаў для дзяцей? Калі пры пошуку ўстановы адукацыі завуалявана прысутнічае падзел на «багатых» і «бедных», школьная сістэма ўвогуле прайграе. Толькі пры ўмове, што бацькі не «адсоўваюць» якасць адукацыі на другі план з прычыны фінансавых цяжкасцей, кожнае дзіця атрымлівае выгаду ад выбару, здзейсненага дарослымі.

Надзея НІКАЛАЕВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «Витрембыт», 210035, г. Витебск, ул. Терешковой, 3, тел./факс 0212 26-12-87

Лот №1. Изолированное помещение с инвентарным №240/D-42005 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Черняховского, 7А-1, площадью 327,1 кв.м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, в т.ч. места общего пользования: котельная, коридор, тамбур, административное помещение с асфальто-бетонным покрытием, воротами металлическими, забором металлическим, водопроводной сетью, кабельной линией, канализационной сетью, наружной газовой сетью. **Начальная цена:** 1 752 349 200 бел. руб. с учетом НДС. **Размер задатка:** 175 234 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инвентарным №240/С-37346 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Черняховского, 7а, площадью 233,3 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – здание склада. **Начальная цена:** 155 277 600 бел. руб. с учетом НДС. **Размер задатка:** 15 527 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **16.11.2015 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: **с 30.10.2015 с 8.30 по 13.11.2015 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №242400000004001353 площадью 0,4181 под производственную базу

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится согласно срокам, указанным в договоре купли-продажи. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Извещение опубликовано в газете «Звязда» 22.07.2015. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

10 ноября 2015 года состоится внеочередное общее собрание акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Покупка Обществом акций собственного выпуска с целью сокращения их общего количества и уменьшения уставного фонда.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.

Начало работы собрания – в 10.00.

Регистрация участников собрания – с 09.30 до 09.50 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

УНП 100036332

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**ОАО «АЛЕВКУРП», г. Минск, ул. П. Бровки, д. 6, ком. 332**

Предмет аукциона

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь	Назначение
Кухня-столовая	500/С-49614	1374,3 кв.м	Здание неустановленного назначения
Составные части и принадлежности	Дорожка 763 кв.м, бордюр 88 м.п., газоны		
Месторасположение предмета аукциона	**г. Минск, ул. Славинского, д. 4К**		

Сведения о земельных участках:

1) Земельный участок пл. 0,3679 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания неустановленного назначения (кухня-столовая).

Ограничения прав: участок площадью 0,0462 га – охранная зона трубопроводов, участок площадью 0,0506 га – охранная зона водовода.

2) Земельный участок пл. 0,1151 га предоставлен продавцу в общее долевое постоянное пользование (доля: 3/10) для эксплуатации и обслуживания здания неустановленного назначения (кухня-столовая) и зданий и сооружений военного городка №52 (проезд)

Начальная цена с НДС 20% – 4 982 131 392 белорусских рублей (снижена на 20%)

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 24.09.2015**

Дата и время проведения аукциона	**16.11.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**13.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

БПС-СБЕРБАНК

Дата уведомления – 30.10.2015

Уважаемые Владельцы (физические лица) текущих банковских счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неподвижные счета)!

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам с неподвижными счетами, предусматривающими использование банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неподвижному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неподвижного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неподвижному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону: **148** – в стационарной и мобильных сетях для международных звонков **(+375 29) 5-148-148.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**ОАО «Слонимская камвольно-прядильная фабрика», Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 42**

Предмет аукциона

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь	Назначение
Здание центральных ремонтных мастерских	450/С-20683	1900,5 кв.м	Здание специализированное автомобильного транспорта
Месторасположение предмета аукциона	**Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 42**		
Сведения о земельном участке	Земельный участок пл. 0,0693 га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: с 31.01.2013 по 30.01.2033) для обслуживания здания центральных ремонтных мастерских		

Начальная цена с НДС 20% – 3 181 200 000 белорусских рублей

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Дата и время проведения аукциона	**30.11.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**27.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 30.11.2015 г. в 15.30 по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 104 (конференц-зал «Консул»).

Организатором аукциона является

республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»,

находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

1. Помещение № 43 площадью 43,5 кв.м на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл) в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 305 000 бел. рублей; размер задатка – 130 500 бел. рублей; целевое использование – размещение бутика, офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины.

2. Помещение № 46 площадью 10,3 кв.м на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл) в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 309 000 бел. рублей; размер задатка – 30 900 бел. рублей; целевое использование – размещение бутика, офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины.

Документы на участие в аукционе принимаются с 02.11.2015 по 27.11.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 27.11.2015, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 30 ноября 2015 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания летнего лагеря, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, Хальчанский с/с, д. Хальч, ул. Крестьянская, 52А, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Хальч» на праве собственности

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%)	Задаток, бел. руб. (в т.ч.НДС 20%)
1	**Здание летнего лагеря, инв. №311/С-47237**	**Назначение: здание неустановленного назначения. Двухэтажное строение из железобетонных панелей 1986 года постройки. Общая площадь 1518,9 кв.м. Составные части и принадлежности: подвал, два крыльца, вход в подвал.**	**4 173 384 070**	**200 000 000**
	***Земельный участок** для обслуживания здания на праве аренды площадью **0,1706 га** с кадастровым номером 320886804101000672. Договор аренды земельного участка сроком по 24.05.2040 г. с Ветковским райисполкомом. Имеются ограничения (обременения) прав на земельный участок: водоохранная зона водных объектов 0,1706 га; территория, подвергшаяся радиоактивному заражению, – 0,1706 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*			

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27 ноября 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, в т.ч. индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **30 ноября 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. **Шаг аукциона – 5%.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить объект.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 30 октября 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1,5 процента от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 20 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки, согласно заключенному договору купли-продажи, выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона.

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: ОАО «Хальч», Гомельская обл., Ветковский р-н, д. Хальч, пл. Победы, 1. ☎ 8 (02330) 3-77-85

■ Я прапаную...

ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ ТРЭБА ЛЮБІЦЬ!

«Пешаходаў трэба любіць...» — пісалі класікі савецкай сатыры Ільф і Пятроў на золку ўсеагульнай аўтамабілізацыі. У тым сэнсе, што не варта ўціскаць правы гэтых самых пешаходаў. Але ў наш час пешаходам, напэўна, грэх скардзіцца: і ў правілах дарожнага руху іх прывілеі прапісаны, і тратуары зроблены, і пераходы — са святлафорамі і без — уладкаваны. Кіроўцы машын, праўда, ставяцца да пешаходаў парознаму, але збольшага дарогу ўсё ж саступаюць. Калі б яшчэ ўсе пешаходы пільнаваліся правілаў...

Зрэшты, гэта крыху іншая гісторыя. А мне хацелася б сёння закінуць слоўца за веласіпедыстаў. Апошнім часам аматараў перасоўвацца па горадзе на двух колах з педалямі значна паболела. Хоць яшчэ не так даўно веласіпед як гарадскі транспарт лічыўся доляй «бедных», што не могуць узбіцца на ўласнае аўто. Або тых, у каго дзяцінства недзе свярбіць. Цяпер жа назіраеш самавітых, забяспечаных мужчын, якія ўлетку «рассякаюць» па вуліцах менавіта на веліках. Часта даволі дарагіх. І я думаю, што гэта проста цудоўна. І веласіпедыстаў трэба любіць. Я нават сказаў бы, усяляк песціць і берагчы. За тое, што не атручваюць паветра выхлапнымі газамі. За тое, што не ствараюць затораў на дарозе. За тое, што проста паказваюць прыклад здаровага ладу жыцця. І ты міжволі задумваешся пра тое, як бы самому скочыць у сядло і растрэсці назбіраныя кілаграмы.

Але пакуль прыцішым хваласпеў. Бо пакуль што нашыя гарады — не самы спрыяльны асяродак для веласіпедыстаў. Хоць у цэлым беларускія дарогі падтрымліваюцца ў значна лепшым стане, чым у некаторых суседніх краінах. Калі ўзяць, напрыклад, Мазыр, то ў апошнія гады тут было нямала зроблена, каб палепшыць арганізацыю дарожнага руху. Пашырылася праезная частка, усталёўваліся новыя святлафоры. Усё для таго, каб аўтамабілісты і пешаходы пачуваліся больш выгодна. Веласіпедыстам, аднак, пашанцавала меней. Не, калі вы любіце ў вольны час паганяць на «горніку», то сцяг вам у рукі: нашы яры і стромы не пакінуць абыякавым ніводнага экстрэмала. А вось прыхільнікам спакойнай камфортнай язды не пазайздросціш. Бо ездзіць, уласна кажучы, мазыранам пакуль няма дзе. Па дарозе, калі навокал гудуць машыны, катацца боязна нават дарасламу. Ужо не кажучы пра тое, каб пусціць туды дзяцей. А калі ехаць па тратуары, то дыскамфорт адчуваюць ужо пешаходы. Нестае і нармальных пакатых з'ездаў з бардзюраў, на якіх ты не рызыкаваў бы пагнуць колы.

Але дарожкі — гэта не самая вялікая бяда. Веласіпед яшчэ трэба недзе прыпарkаваць. Велапарковак таксама бракуе, а тыя, што ёсць, звычайна не падыходзяць пад сучасныя веласіпеды. Паркуючыся, велааматары, часцей за ўсё, рызыкуюць пашкодзіць тармазны дыск. Пра стрэшкі над велапаркоўкамі проста памаўчым. Хаця, на добры лад, месцы, дзе можна паставіць веласіпед, павінны быць каля магазінаў, устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый — бадай што паўсюль. А то нейкі парадокс выходзіць: вялізны аўтамабіль лягчэй прыткнуць, чым лёгкі і малагабарытны ровар.

Мы, напрыклад, любім пагаварыць пра здаровы лад жыцця. А язда на веласіпедзе — адзін з самых даступных спосабаў гэтага ладу прытрымлівацца. Чым болей народу катаецца — тым здаравейшая краіна. Але дзе, у такім разе, веладарожкі? Яшчэ адна праблема, што набіла аскому, — загружанасць дарог і «запаркаванасць» двароў. Давайце агітаваць народ перасаджвацца ў цёплую пару на веласіпеды. Адначасова і экалогія палепшае. Але зноў усё ўпіраецца ў адсутнасць інфраструктуры.

Варта быць рэалістамі: будаўніцтва веладарожак і парковак адразу ва ўсім горадзе будзе каштаваць шалёных грошай. Таму адным наскокам праблему не вырашыць. Але рана ці позна ўсе дарогі даводзіцца рамантаваць, а сям-там і пашыраць. Дык чаму б пры чарговым рамонце вуліцы не пракласці і веладарожку? І чаму б у новых раёнах, што існуюць пакуль толькі ў праекце, не прадугледзець іх першапачаткова? І чаму б поруч з новымі аўтамабільнымі паркоўкамі не ствараць невялічкія веласіпедныя? Спаквапя, па меры сіл і сродкаў. Бо трэба не толькі вырашаць надзённыя праблемы, але і дбаць пра будучыню. А будучыня — за больш эканамічнымі і экалагічнымі відамі транспарту. Не заўсёды ёсць рацыя ў тым, каб дзеля пары кіламетраў ганяць тону-паўтары «жалеза» і марнаваць дарагое паліва. Але да разумення гэтай простай, здавалася б, рэчы мы толькі падыходзім.

Валянцін БОЙКА

■

■ Неасабісты суб'ектыў

НЕ дробязі жыцця

Пра што варта задумацца цёмным восеньскім вечарам

Учора мы пахавалі дзядзьку Сяргея. Хаця які ён дзядзька — усяго на восем гадоў старэйшы. Ды і Сяргеем афіцыйна яго мала хто называў: наймалодшы з усіх шматлікіх маміных стрыечнікаў, ён для ўсёй радні быў проста Сярожа. Заўсёды крыху сарамлівы, ён быў убаку і ад шумнага гармідару сямейных свят, і ад роспачнай сямейнай жалобы. З пакручаным, пакалечаным лёсам, са сваім не зразумелым многім успрыманнем навакольнага, з шалёным пратэстам супраць гэтага свету, які не хацеў яго прымаць. З ціхай усмешкай, з гатоўнасцю дапамагчы кожнаму, хто папросіць, ён быў, па сутнасці, вельмі няшчасным і вельмі сціплым чалавекам.

Сярожа стаў героем самых папулярных навін на лентах беларускіх парталаў. Пра тое, што недалёка ад Станькава цёмным вечарам машына збіла чалавека, які сядзеў на праезнай частцы, у сераду не пісаў (а пасля і не чытаў) толькі лянівы. Нават мы, сваякі, пра тое, як дакладна Сярожа загінуў, даведаліся найперш з паведамленняў у сеціве. Мы ўжо ніколі не даведаемся, чаго ён прысеў каля веласіпеда на дарозе дадому, едучы а палове восьмай вечара з працы ў глухі, амаль пусты пасёлак, дзе жыў разам з састарэлым бацькам. Можа, паваліўся, можа, штосьці зламалася ў тым ровары... Дакладна вядома іншае: для вадзіцеля той машыны ён узнік з цемры нечакана, і той пры ўсім жаданні не мог вокамгненна спыніцца. Былі варыянты толькі ступені бяды. Яна аказалася найвышэйшай — праз дзве гадзіны Сярожа сканаў у бальніцы ад атрыманых траўмаў.

Наплакаліся, нагаварыліся, наўспаміналіся. «Як страшна, як па-дурному загінуў», — гучала ў гэтыя жалобныя дні найчасцей. «Як вядома, пешаход не быў абазначаны святлоадбівальнымі элементамі», — гэтая фраза з афіцыйнай зводкі здарэнняў звінела ў галаве кожны раз, калі зноў чула «як страшна, як па-дурному». Таму што ўсё астатняе ўжо адыходзіла на другі план, таму што пры ўсім перажыванні блізкай бяды розум падказваў: з якой бы хуткасцю ні ехала машына, у якім бы стане ні быў чалавек на дарозе, калі б у яго на рукавах ці на спіне была звычайная святлоадбівальная стужка, якая прадаецца ў кожнай краме і каштуе капейкі, такой непапраўнай трагедыі не здарылася б.

Атрымліваецца, чалавек загінуў менавіта праз гэтую няшчасную дробязь (дакладней, з прычыны яе адсутнасці) — праз флікер. Можна доўга разважаць пра тое, што прывяло нашага Сярожу на тую цёмную дарогу: пра лёс, які на кані не аб'едзеш, пра нешчаслівую зорку, якая вяла яго з самай маладосці, пра залішнюю цягу да чаркі. Але ўсё гэта мае нашмат меншае значэнне, чым бліскучая стужка ці хаця б падвеска, якія успыхнулі б у святле фараў і далі б шанц кіроўцу своечасова націснуць на тормаз.

Менавіта так. Я размаўляла ўчора з Ганнай Банадык, старшым інспектарам па асаблівых даручэннях УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў, пыталася пра статыстыку падобных выпадкаў. Задала і пытанне, якое чула і ад маці, і ад іншых сваякоў не раз: няўжо вадзіцель нічога не бачыў, няўжо не мог спыніцца? Мая суразмоўніца адказала катэгарычна: «Флікерамі ў цёмны час ды яшчэ ў сельскай мясцовасці грэбуюць толькі тыя пешаходы, якія ніколі не садзіліся за руль. Бо любы вадзіцель скажа, што заўважыць чалавека, ніяк не абазначанага, на цёмнай дарозе, немагчыма нават на адлегласці некалькіх метраў...»

Мы з Ганнай яшчэ даволі доўга і падрабязна размаўлялі на «флікерную тэму». Пра тое, колькі зроблена за апошнія гады, каб статыстыка па загінулых у цёмны час сутак пешаходах зменшылася ў разы. Работа сапраўды праведзена і праводзіцца немалая: святлоадбівальныя элементы, якія адпавядаюць дзяржстандартам, цяпер у продажы паўсюль, сельгаспрадпрыемствы абавязалі забяспечыць работнікаў вопраткай з «флікернымі» ўстаўкамі, з гэтымі ж устаўкамі вопратка цяпер і ў паштальёнаў, і ў дарожнікаў. На абочынах трас будуюцца адмысловыя, аддзеленыя ад праезнай часткі, дарожкі для пешаходаў, праз трасы і пад трасамі пракладваюцца абсталяваныя па ўсіх правілах бяспекі пераходы...

Гэта дае добры вынік: страшная статыстыка змяншаецца з кожным годам: калі ў 2006-м на дарозе ў цёмны час сутак загінуў 601 пешаход, дык у мінулым годзе такіх няшчасных было 228.

Ідеальна ўсё ж яны ёсць. І будуць. Прынамсі сёлета — дакладна. Будуць і налета, і праз два гады, якія меры на дзяржаўным узроўні ні прымаліся б, якая б прафілактыка ні вялася, колькі б дарожак і пераходаў ні будавалі. Пакуль кожны з нас — няважна, жыве ён у вёсцы ці ў горадзе (Ганна Банадык гаворыць, што ў горадзе выпадкі здараюцца мудрэйшыя, чым на вясковых дарогах), — не спыніцца на некалькі хвілін і не падумае. Не пра тое, што флікеры насіць у цёмны час сутак пешаход не абавязаны (яно на сёння сапраўды так і ёсць). А пра тое, што і каму АБАВЯЗАНЫ кожны з нас. Сабе самому, сваім блізкім людзям. Як мінімум — быць жывым. Пагадзіцеся, варта таго, каб перавязаць рукавы стужкай ці хаця б павесіць на сумку ці кішэню падвеску светлага колеру.

Калі б я пісала гэта на прыкладзе нейкага здарэння з невядомым мне чалавекам. Калі б Сярожа мог гэта прачытаць... Шкада, у жыцця і смерці няма ўмоўнага ладу...

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

■

■ З рэдакцыйнай пошты

ПАКЛАНІЦЦА ЗМАГАРНАМУ КРАЮ...

Год 70-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі нагадаў пра тое, што і Беларусь вызвалялі, і ў іншых старонках гітлераўцаў грамілі сыны і дочкі розных нацыянальнасцей. У Беларусі партызанілі калмыцкі паэт Міхаіл Хонінаў і казахскі празаік Адзій Шарыпаў. На Рудзеншчыне, Пухавіччыне ваяваў народны мсцівец рускі паэт, празаік Усевалад Саблін. І прыкладаў такіх процьма.

З Пухавіцкім краем звязаны ваенны лёс азербайджанскага паэта Алігасана Шырванлы (Наджафава), які нарадзіўся ў 1926 годзе. Чытаем у кнізе «І ўспомнім былыя паходы» (Мінск, 1990): «... Шырванлы (Наджафаў) Алігасан... Да вайны служыў у Мінску, Бабруйску, Магілёве, Быхаве, у мястэчку Ліпень Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Вайну сустрэў у Гродне. Цяжкія франтавыя дарогі праляглі праз Беларусь. Удзельнічаў у абароне Баранавіч і Мінска. Часта прыязджае ў Мінск, бывае госцем у Асіповіцкім, Чэрвеньскім, Пухавіцкім раёнах, наведвае свайго франтавога сябра, дырэктара школы ў мястэчку Ліпень А.У. Кернажыцкага, выступае перад навучэнцамі, калгаснікамі, рабочымі». А гэта — яго вершы: «Брат, здалёку прыйшоў прывітаць я цябе, / Пакланіцца змагарнаму краю. / Ты праславіў Айчыну сваю ў барацьбе, / Тую бітву я сам добра знаю. / Ваявалі адважна краіны сыны, / Разам білі мы ворага злога! / Чую сёння я порах той страшнай вайны, / Чую кліч пераможнага слова».

З яго верша «Беларускаму сябру». Пераклаў спавядальныя словы на беларускую мову Сяргей Панізнік. У кнізе «І ўспомнім былыя паходы», укладзенай Міхасём Няхаём, змешчаны яшчэ і верш «Салдацкая цыгарка» (перакладчык — Васіль Макарэвіч). Пэўна, у гэтых творах — і «пухавіцкі сцяжок», пухавіцкія сляды ў стасунках Алігасана Шырванлы з Беларуссю.

Колькі слоў пра тое, як склаўся творчы лёс колішняга салдата, абаронцы зямлі беларускай. Пра гэта расказвае сучасны азербайджанскі паэт Чынгіз Алі-аглу (ён часта бывае ў Беларусі, у Мінску мне і давялося з ім пагутарыць):

— Алігасан Шырванлы — са старэйшага пакалення... Ён актыўна працаваў у азербайджанскай паэзіі. Паколькі нарадзіўся ў сям'і нафтавіка, быў прывязаны да рабочай тэмы. І, вядома ж, шмат пісаў пра Вялікую Айчынную вайну. Вершы пра гэта — літаральна ў кожнай з кніг Алігасана Шырванлы, які нарадзіўся за смугой далёкіх ад нас часін — у 1926 годзе, пражыў вартае павагі нашчадкаў жыццё. Вельмі прыемна, што майго старэйшага калегу памятаюць у Беларусі і зараз.

Добра было б, каб у беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы з'явіліся новыя пераклады ваеннай паэзіі азербайджанскага творцы, які ваяваў і за нашу з вамі свабоду. Пра гэта я напісаў і ў Саюз пісьменнікаў Азербайджана, у Баку. Магчыма і ў нашым Саюзе пісьменнікаў хто адгукнецца... Раней жа шмат увагі было да ваеннай літаратуры, да тых пісьменнікаў, хто прайшоў агнявымі дарогамі Беларусі. Хацелася б спадзяванне на такую ўвагу адрасаваць і школьнікам. Быў жа некалі рух «чырвоных следапытаў». Было разуменне, што Перамогу здабывалі агульнымі намаганнямі. Таму і выслоўе «дружба народаў» не было пустым гукам.

Максім ПАЛАЖЫНСКІ, *г. Мінск*.

■ Імгненне, спыніся!

ВЫСТАВА ЯК ЛЕТАПІС ЛЁСУ

У Гродне праходзіць юбілейная выстава вядомага фотамастака Аляксандра Ласмінскага пад назвай «Убачанае». У выставачнай зале прадстаўлены 100 работ — як новых, якія раней не дэманстраваліся і зняты з вышыні птушынага палёту, так і ўжо ўключаных у розныя зборнікі. Іх, дарэчы, у актыве майстра фатаграфіі больш за 50 (з якіх 20 — аўтарскія). Аляксандр Ласмінскі — журналіст, гісторык, фатограф, дырэктар тэлерадыёвяшчальнага канала «Гродна Плюс» і дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў у адной асобе. Паўтара дзясятка гадоў у Маскве штогод праходзяць па дзве выставы гродзенскіх майстроў, фарміруе якія Аляксандр Іосіфавіч. З 1976 года ён на грамадскіх пачатках узначальвае народны фотаклуб «Гродна», дзе вырасціў ужо некалькі пакаленняў прафесійных фатографаў. У 2011-м з рук Прэзідэнта Аляксандр Ласмінскі атрымаў медаль Францыска Скарыны. А літаральна днямі юбіляру споўнілася 65.

— Ніколі не расстаюся з фотаапаратам, — прызнаецца лаўрэат шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. — На працу, з працы, у выхадны, на адпачынку ў водпуску ён заўсёды пад рукой. Вельмі люблю свой родны горад! Як дзівосна выглядаюць зверху помнікі архітэктуры, на якія багаты наш старажытны Гродна, чарапічныя дахі і купалы храмаў. Мы жывём ва ўтульным і дагледжаным еўрапейскім горадзе, прыгажосць якога трэба беражліва захоўваць. І, вядома ж, дзяліцца ўбачаным праз аб'ектыў фотаапарата — паказваць яго прывабнасць з нечаканых ракурсаў.

Выстава прадоўжыцца да пачатку лістапада.

Уладзімір ПЯТРОЎ

■

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК:

«ВАРТА ЛЮБІЦЬ СВАЁ»

Гэты год у маладога драматурга Васіля Дранько-Майсюка, які выступае і друкуецца пад псеўданімам Васіль ДЭ ЭМ, выдаўся багатым на падзеі. На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага паставілі яго п'есу «Пясняр», у якой галоўны герой — Уладзімір Мулявін. Спектакль ідзе год і нават не збіраецца страчваць гледачоў. Акрамя прафесійных поспехаў, у жыцці маладога творцы з'явілася яшчэ адна нагода для радасці — маладая жонка, паэтка і літаратарка Валерыя Кустава.

Васіль вырас у творчай сям'і, дзе бацька Леанід Дранько-Майсюк — беларускі паэт, а маці — Вольга Шчадрына (дачка Валянціны Шчадрыной, перакладчыцы на рускую мову твораў Караткевіча) — журналістка, якая прыехала за мужам з Масквы ў Мінск, вывучыла мову. І на думку драматурга, такое «змяшэнне крыві» мае больш станоўчага, чым можа здацца на першы погляд...

— Калі пісалі «Песняра», якую думку закладвалі, хацелі данесці да гледача?

— Самае галоўнае, каб п'еса спадабалася, натхніла. Любы творца піша і робіць для таго, каб таму, хто глядзіць, слухае, чытае, стала лепей. З другога боку, ёсць у «Песняры» і адукацыйны момант. Той, хто не чуў раней пра Уладзіміра Мулявіна, Максіма Багдановіча, Янку Купалу, Якуба Коласа, Цётку, зацікавіўся б імі і сам, прыклаўшы намаганні, даведаўся пра гэтых асоб больш.

— Мне здавалася, што галоўная задача — абудзіць тую самую «беларускасць»...

— Дык гэта тое ж і ёсць. Што такое беларускасць? Гэта гонар за «сваё», адчуванне сябе прадстаўніком значнага народа. А як мы можам сябе лічыць такімі, калі не ведаем нацыянальных паэтаў, сваіх песняроў? Дзякуючы гэтаму спектаклю мы можам даведацца пра іх больш і адчуць гонар за сваё. Але найперш для мяне важна было зацікавіць людзей, бо інакш яны не прыйшлі б у залу. А па-за яе межамі пашырыць светапогляд гледача немагчыма.

— Галоўны вобраз у п'есе — Пясняр. Ці бачыце вы іх у рэчаіснасці?

— Яны ёсць. Але той чалавек, які можа стаць сапраўдным песняром, мяркую, праявіць сябе пазней. Менавіта ўзроўню асобы Мулявіна нікога няма. Бо ён, у адрозненне ад многіх цяперашніх творцаў, быў шматгранным. Пісаў і рок-оперы, і папсовыя шлягеры, і апрацоўваў народныя песні — ва ўсіх сферах пакінуў сапраўды адметны след. Ёсць, напрыклад, выдатны, на мой погляд, музыка — Юрый Выдронак, заснавальнік беларускага фолк-мадэрну, стваральнік гуртоў «Палац», «Крыві», «Юр'я». Для мяне ён — другая па значнасці асоба пасля Мулявіна. Але Выдронак цудоўна праявіў сябе толькі ў адной сферы і, на жаль, не ўся яго творчасць можа захапіць шырокае кола людзей. Хочацца, каб з'явіўся такі музыка, які б зацікавіў усіх — ад гандляра насеннем на Камароўцы да прафесара з універсітэта. На тое ён і пясняр.

— Такое разуменне асобы Уладзіміра Мулявіна, яго ўспрыманне перадалося ад бацькі?

— Ад бацькі гэта магло перадацца не менавіта ў дачыненні да Мулявіна, а ўвогуле праз любоў да беларускай літаратуры, да тых, хто шмат зрабіў для нашай краіны. І самае галоўнае, ён шмат расказваў мне пра Уладзіміра Дубоўку (і чытаў сваю дзівосна-кінематаграфічную паэму «Кола»), Максіма Багдановіча (адкрыў для мяне выдатнае эсэ Міхася Стральцова «Загадка Багдановіча»), Уладзіміра Караткевіча, Барыса Мікуліча, Пятра Глебку, Міхася Лынькова... Бацька расказваў пра іх як пра ЖЫВЫХ, цікавых людзей, у кожнага з якіх быў свой адметны характар, арыгінальныя звычкі і погляды на жыццё і на літаратуру. У яго аповедах не было і цэню «сіропнага» псеўдазамілавання (якое так часта можна ўбачыць у артыкулах, што змяшчаюцца ў хрэстаматыях). Таму дзякуючы бацьку я стараюся пазбягаць, калі пішу п'есы ці артыкулы, такіх агульна-пустых фраз, як: «Ён любіў свой народ» і «Быў патрыётам», «Гомельшчына — зямля продкаў, яна ўзлюляла ды ўзгадавала...». Мінімум пустаты, максімум зместу! Вось чаму вучыў мяне бацька. Не павінна быць ніводнай лішняй фразы. Толькі канкрэтыка. Што любіў творца, а што не? Які ў яго быў характар? Паказаць жывога чалавека праз сваё эмацыйнае стаўленне да яго — вось мая асноўная задача.

«Хочацца, каб з'явіўся такі музыка, які б зацікавіў усіх — ад гандляра насеннем на Камароўцы да прафесара з універсітэта. На тое ён і пясняр».

— На якіх мовах размаўляюць вашыя бацькі?

— Маці на дзвюх: рускай і беларускай, бацька — толькі па-беларуску. У нас такая беларуска-руская сям'я, і гэта таксама добра.

— Чаму выбралі беларускую?

— Таму што я нарадзіўся і жыву тут, эмацыйна адчуваю сябе часткай беларускай культуры. Карысна, калі ты не стапрацэнтны беларус. Гэта значыць, што ў цябе будзе яшчэ і эмацыйнасць іншага народу, якая можа дапамагчы ў стварэнні ўжо свайго, беларускага. Лічыцца, што беларусы ціхія, спакойныя, часам, нават інертныя, а рускія жывыя, нават крыху шалёныя. І таму трэба, каб з'явіўся рускі Мулявін і ўзварушыў усіх. Дарэчы, шмат хто з беларускіх пісьменнікаў вандраваў па свеце, натхняўся энергіяй іншых народаў, а пасля вяртаўся ў Беларусь і ствараў штосьці каштоўнае.

— Калі з'яўляецца час, чытаю вашы «20 нечаканых фактаў» пра пісьменнікаў і шчыра здзіўляюся: адкуль такія звесткі? Напрыклад, што Цётка не любіла застоллі? Бо ў маім успрыманні ўсе біяграфіі фактычныя і сухія.

— Час не дазваляе сядзець доўга ў архівах. Я гляджу тыя кнігі, якія даступны кожнаму з нас. Іншая праблема ў тым, што мы пра іх не ведаем ці не жадаем ведаць. І выкладчыкі ў ВНУ ці школах павінны правільна расстаўляць акцэнты ў жыцці творцы. Напрыклад, у Якуба Коласа ёсць паэзія 1930—1940-х, любоўная лірыка, яго лісты вельмі кранальныя. Чаму б не расказаць пра гэта? Нядаўна чытаў аднаго даследчыка, які напісаў, што ў 1930-я гады Пятро Глебка стаў складаць адны толькі сталінскія «дрындушкі». Але ці адкрыў ён тую ж кнігу савецкага перыяду аўтара і пільна яе прачытаў? А змог бы адшукаць больш за дзясятак сапраўдных паэтычных жамчужын, як, напрыклад, вершы «Экзотыка», «Летні дзень», «На моры». Ёсць успаміны скульптара Заіра Азгура, дзе ён выдатна паказвае нашых класікаў — нібы яны жывыя стаяць перад табой. Але ж мы часцей за ўсё не адкрываем, не глядзім, і нам пальцам не паказваюць, што ў нас ёсць.

— Зможаце назваць улюбёных паэтаў-сучаснікаў?

«Дзякуючы бацьку я стараюся пазбягаць, калі пішу п'есы ці артыкулы, такіх агульна-пустых фраз, як: «Ён любіў свой народ» і «Быў патрыётам».

— Сучасная паэзія? Нечаканы вобраз, ярка-парадаксальная метафара, дзівосная рытміка... Калі ўсё гэта прысутнічае ў вершы, то гэтага аўтара я лічу надзвычай сучасным, ён для мяне сучаснік. А таму мае любімыя паэты — гэта Янка Купала, Уладзімір Жылка, Максім Багдановіч, Якуб Колас, Хведар Ільяшэвіч, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Пятро Глебка, Леанід Дранько-Майсюк, Ніна Мацяш, Валярына Кустава, Віктар Жыбуль...

— А калі ўсё ж такі пагаварыць пра маладых паэтаў, якія жывуць сёння... Чаго ім нестае, каб стаць «песнярамі»?

— У юных маладнякоўцаў, узвышанцаў, сяброў суполкі «Полымя» быў вялікі жыццёвы досвед, адчуваўся нейкі ўнутраны неспакой, прага вучыцца і ўдасканальвацца, імкненне да чысціні беларускага слова. Творчасць многіх сучасных аўтараў атулена спакоем і лёгкім холадам. Мне, як чытачу, не хапае ў некаторых творах энергіі і разумення, чаго хоча аўтар, за што ён альбо супраць чаго, што яму падабаецца, а што не. Не хапае нейкай выразнай тэмы. Чытаеш маладую паэтку і не можаш зразумець: кахае яна ці не? Хоча яна з каханым правесці па-цінтабрасаўску незабыўную ноч ці ўсё ж такі не? А ў творчасці хочацца бачыць аголены нерв. Пэўнасць і шчырасць у радках. Але паліндромы Віктара Жыбуля мяне радуюць сваёй святочна-карнавальнай формастваральнасцю, паэзія Валерыі Куставай натхняе нечаканымі для сённяшняй маладой паэзіі метафарамі і вобразамі. У яе творах ёсць эстэтычныя перагукванні з класічнымі творамі папярэднікаў. І гэта радуе. Выдатна, калі ёсць пераемнасць.

— А чым для вас з'яўляюцца класічныя творы нашых папярэднікаў?

— Я іх люблю! Для мяне гэтыя тэксты эмацыйна тоесныя сустрэчы з каханай. Той жа экстаз. Але каб зразумець гэта і сапраўды адчуць, класічную беларускую літаратуру трэба прапагандаваць. Пакуль што беларуская літаратура — гэта поле, якое трэба расчысціць ад «лісця», якім закідваюць нашых пісьменнікаў. Гэта, з аднаго боку — словы-клішэ накшталт «любімы сын народа», «сын зямлі», а з другога боку — розныя гнюсныя, быццам бы «постмадэрновыя» выбрыкі, дзякуючы якім, напрыклад, выдатны верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык» ператвараецца ў «Хлопчык і копчык».

— З Валярынай адшукалі агульную мову таксама на падставе літаратуры?

— Эмацыйная еднасць і жаданне ствараць адно аднаму кожны дзень свята — вось асноўнае, што нас яднае.

— Ведалі вы раней адно аднаго?

— Вядома, былі ў адным коле, часта бачыліся, віталіся, гутарылі. Але не болей. Пасля, у дзень нараджэння Уладзіміра Караткевіча, мы зноў сустрэліся, і тады я зразумеў, што хачу, каб побач была менавіта гэтая дзяўчына. З такімі поглядамі, з унікальным спалучэннем паэтычнага артыстызму і вялікай сямейнасці.

— Няўжо вы і дома разам чытаеце беларускіх класікаў?

— Чаму б і не? Нядаўна чытаў уголас апавяданне Міхася Стральцова «Свет Іванавіч, былы донжуан», а Валярына ў гэты час штосьці смажыла на патэльні. Часта чытаем адно аднаму свае артыкулы, робім заўвагі, правім, даём парады. А таксама вершы — свае і чужыя.

— У вашай маладой сям'і ўвогуле як праяўляецца беларускасць?

— Для мяне гэта штосьці настолькі натуральнае, што я не заўважаю, у чым яна ёсць. Ты шчыра любіш беларускае не дзеля атрымання грошай, не дзеля працы, а проста таму, што ты беларус. Навучыць сваіх дзяцей, каб яны размаўлялі па-беларуску — вось найлепшая праява беларускасці.

— Калі б бацькі не былі апантанымі ўсім беларускім, ці былі б вы такім?

— Што было б тады, калі б?.. Дарога была б не такой прамой, але, спадзяюся, я ўсё адно знайшоў бы правільны кірунак.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Дзеля памяці

СВЕДЧАННІ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ

Заўтра на Вілейшчыне пройдзе шосты аўтапрабег па мясцінах, звязаных з Першай сусветнай вайной

У 11 гадзін дня калона машын і аўтобусаў збярэцца на цэнтральнай плошчы Вілейкі. Адтуль рушыць да надбрамнай капліцы на старых вілейскіх могілках, дзе і пачнецца ўрачыстае дзейства. Будзе адслужана ліція — кароткае памінанне памерлых. Менавіта на гэтых могілках ляжаць астанкі тых, хто паміраў за вызваленне Вілейкі. Праўда, за савецкім часам над імі... быў зроблены яшчэ адзін пласт пахаванняў. Таму цяпер, у літаральным сэнсе, няма месца нават для таго, каб паставіць крыж. Таму і вырашана было будаваць надбрамную капліцу на ўваходзе. Імёны вайскоўцаў удалося высветліць. Іх спіс раздадуць удзельнікам аўтапрабегу для таго, каб супольна ўшанаваць памяць байцоў. Будуць запалены памінальныя свечкі. Да нябёсаў узнясуцца не толькі словы малітваў, але і паэтычныя радкі, прысвечаныя героям.

Далей аўтакалона накіруецца ў Іжаўскі сельскі Савет, на тэрыторыі якога калісьці праходзілі баі па ліквідацыі Свянцянскага прарыву. Удзельнікі акцыі наведаюць вёскі Любкі, Дварэц, саму Іжу. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **заснавальніца фонду памяці Першай сусветнай вайны «Крокі» Валянціна ЦІТОВІЧ**, там знойдзена шмат пахаванняў часоў Вялікай вайны. Сіламі яе мужа, мастака, таксама заснавальніка фонду Барыса Цітовіча і яшчэ аднаго актыўнага ўдзельніка (які прайшоў Афганскую вайну) Станіслава Сушы пастаўлены крыжы і надмагільныя помнікі. Плануецца наведаць стары мемарыяльны комплекс у вёсцы Рускае Сяло, лазарэтныя могілкі ў Забродцзі. Завершыцца ўсё традыцыйным піццём гарбаты. Валянціна Цітовіч адзначае:

— Звычайна ў аўтапрабегу ўдзельнічае да 100 чалавек, разам з машынамі, аўтобусамі. Завітваюць рэканструктары падзей Першай сусветнай вайны: можна будзе пабачыць людзей у форме салдатаў, афіцэраў тых часоў... Мы імкнёмся, каб да нашай дзейнасці далучалася моладзь, бо такія акцыі спрыяюць патрыятычнаму выхаванню, а таксама з'яўляюцца добрым прыкладам краязнаўчай працы.

Аўтапрабег прымеркаваны да завяршэння Першай сусветнай вайны, а таксама да вызвалення горада Вілейкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

Іван ЭЙСМАНТ:

«ПРАМЫ ЭФІР ДАПАМАГАЕ БЫЦЬ У ТОНУСЕ»

Агенцтва тэлевізійных навін — структура Белтэлерадыёкампаніі, сіламі якой ствараюцца не толькі выпускі навін (8-10 кожны дзень), але і шэраг вядомых праектаў рознай тэматыкі, напрыклад «Галоўны эфір», «Зона-Х», «Форум», «Дыялогі аб цывілізацыі», «Нашы» і многія іншыя. Напачатку новага сезона ў эфіры «Беларусь 1» з'явіліся таксама навінкі для аматараў параўноўваць мінулае і сучаснасць і аналізаваць жыццё ў дэталях. Больш падрабязна пра іх і не толькі нам расказаў галоўны дырэктар Агенцтва тэлевізійных навін Іван ЭЙСМАНТ.

— Іван Міхайлавіч, новы сезон на «Беларусь 1» распачаўся праектамі «Буйным планам», «Беларусь XXI», «Мы — беларусы»...

— Калі пачыналі з запуску праграмы «Буйным планам» з Маратам Маркавым, то аказалася, што не хапае перадачы, дзе можна абмяркоўваць сур'ёзныя тэмы ў фармаце «адзін на адзін». А цяпер на «Беларусь 1» два такія праекты — вышэйназваны і праграма Святланы Бароўскай «Выхад ёсць!». «Буйным планам» мы сталі рыхтаваць, жадаючы заняць вячэрнюю нішу, і каб размаўляць з кампетэнтнымі людзьмі на актуальныя тэмы. Мне здаецца, што наш старт быў удалым. І праект будзе працягваць сваё існаванне ў ранейшым фармаце. Магчыма, зменіцца крыху «аздабленне».

Потым на пачатку жніўня быў запушчаны дакументальны праект «Беларусь XXI», ідэя якога ўзнікла яшчэ пару гадоў таму. Натхнілі мяне, можна сказаць, модныя фотарэпартажы ў інтэрнэце «Беларусь 80-х — 90-х». Здавалася б, усюды знаёмыя месцы, але яны змяніліся за апошнія 20 гадоў. Так з проста натурнага праекта з часам пачало нараджацца нешта больш сур'ёзнае. Мы паглядзелі, як наогул змянілася наша жыццё за гэты час. Так з'явілася дзесяць фільмаў па 20-25 хвілін. Праект таксама атрымаў свае водгукі. Я размаўляў з журналістамі, рэжысёрамі, і яны адзначалі, што часам самі не маглі адарвацца ад прагляду архіўных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць наша колішняе жыццё. Як апраналіся, што куплялі ў крамах, у якіх дамах жылі. Безумоўна, адбылося шмат змен, але і праблем сёння хапае. Аднак у параўнанні з некаторымі іншымі «маладымі» краінамі мы зрабілі крок наперад. Варта ўзгадаць і праект «Мы — беларусы», які нібы працягвае расповед аб пераменах у нашай краіне. Ён складаецца з трох фільмаў (кожны амаль па гадзіне працягласцю), у якіх адлюстраваны палітыка, сацыяльная сфера і эканоміка. Ёсць у нас праект «Нашы», дзе героі — вядомыя людзі... Калі ж з'явілася ідэя зрабіць перадачу пра нашы брэнды, вырашылі назваць яе «Зроблена ў Беларусі». Дарэчы, міні-версію праекта можна ўбачыць у «Добрай раніцы, Беларусь» — там ёсць рубрыка «Made.by».

— Гасцямі праграмы «Буйным планам» з'яўляюцца людзі, якія займаюць высокія пасады. Сёння яны сталі больш даступнымі?

— Чыноўнікі ў нашай краіне ў прынцыпе апошнім часам сталі больш адкрытымі. Іх арыентуюць на тое, што з народам трэба размаўляць, а не зачыняцца ў кабінетах. І такую тэндэнцыю я назіраю не толькі на праграме «Буйным планам», але і ў «Галоўным эфіры», у «Форуме». Праблемы ёсць, і мы іх агучваем, а грамадству трэба тлумачыць, чым займаецца ўлада, чаму прымаюцца тыя ці іншыя рашэнні, сабліва гэта тычыцца работы на месцах. Інакш людзі самі дадумаюць і растлумачаць усё па-свойму. Нехта кажа, што ў «Панараме» няма крытыкі, але магу вас запэўніць: праграма не выйдзе ў эфір, калі там не будзе крытычных сюжэтаў. Мы назіраем за ўсім, што адбываецца ў краіне, і не баімся гаварыць аб недахопах. І заўсёды ёсць зваротная рэакцыя ад тых, каго закранае крытыка. Адны абураюцца, а іншыя пішуць лісты, што выправілі сітуацыю ці працуюць над ёй.

— Што вы адчувалі, дакранаючыся да архіўных здымак мінулага?

— Я пачынаў успамінаць, напрыклад, як мы жылі ў часы майго студэнцтва. Стыпендыю атрымлівалі доларaў 20, здаецца, на іх можна было набыць адны джынсы. Не хачу сгушчаць фарбы, але ежы нам тады хапала на пару дзён, а потым зноў ехалі да бацькоў па бульбу і яшчэ штосьці. Грошай не было ва ўсёй краіны. Пустыя крамы, зарплаты затрымлівалі... Замкнёнае кола, з якога нам давялося выбірацца... Ёсць праблемы і сёння, бо крызіс. Аднак машын на вуліцах не стала менш, увечары кавярню з вольнымі месцамі знайсці няпроста.

— 11 кастрычніка «Беларусь 1» працаваў у фармаце вялікага інфармацыйнага тэлеканала. Плануеце такі вопыт практыкаваць у далейшым?

— Мы стартавалі ў восем раніцы і на працягу дня працавалі ў вялікай студыі. Кожную гадзіну выходзілі з выпускамі навін, а вечарам пачаў трансляцыю інфармацыйны канал «Галоўны эфір. Выбары-2015». Вяшчалі прыкладна да дзвюх гадзін ночы. Былі ўключэнні з Радоса, дзе ў той дзень праходзіла канферэнцыя палітолагаў, таксама выходзілі на сувязь з намі нашы карэспандэнты з Беларусі, эксперты з Еўропы, ЗША, Расіі, Украіны. Мы ў студыі працавалі ў рэжыме рэальнага часу і так — каля 12 гадзін (6 з якіх склаў прамы эфір без перапынкаў). Лічу, вопыт проста ўнікальны. І радуе, што студыя, у якой мы працавалі, і надалей застанецца ў нас. Там зараз ідзе тэсціраванне тэхнікі. Хутка адразу некалькі праектаў можна будзе ўбачыць у новай «упакоўцы». І гэта той узровень працы, да якога мы імкнёмся.

— Ведаю, што зараз «Беларусь 1» зноў праводзіць кастынг вядучых. Вы — адзін з прадстаўнікоў журы. Як ацэньваеце кандыдатуры ахвотнікаў прабіцца на экран?

— Усе хочуць весці праграму «Добрай раніцы...». А я кажу, што нават калі з 50 чалавек адзін стане вядучым, то гэта поспех, і прапаноўваю спрабаваць сябе ў якасці рэпарцёраў. Па-першае, так здабудзеце сабе магчымасць для добрага шляху наверх, а па-другое, там цудоўная прафесійная школа. Адпрацаваўшы рэпарцёрам на розных кірунках, потым у эфіры ты будзеш як рыба ў вадзе. Але ж маладыя ў большасці хочуць быць менавіта тэлевядучымі. Але немагчыма пад кожнага стварыць праект і ўсіх пасадзіць у кадр.

— Вы — прыклад чалавека, які прайшоў шлях ад рэпарцёра да дырэктара АТН. Ёсць адчуванне, што дасягнулі «вяршыні»?

— Прыемна разумець, што тваю працу ацанілі. Я па адукацыі юрыст і не прыйшоў бы працаваць на тэлебачанне, калі б не быў перакананы, што магу тут рабіць нешта добра. Калі мяне прызначылі на кіруючую пасаду, то ўзрасла адказнасць за працу — не толькі сваю, але і ўсяго калектыву АТН. Я чалавек дэмакратычных поглядаў, але разам з тым строгі ў ацэнках усяго, што з'яўляецца на экране. Мая галоўная задача — даць людзям магчымасць раскрыцца і паказаць сябе на справе. Я заўсёды адкрыты для ўсіх супрацоўнікаў і кажу ім: калі ёсць выдатная ідэя і яе канцэпцыя зацверджана, то я зраблю ўсё, каб яна была здзейсненая. Тэлебачанне рухаецца наперад, і, думаю, мы яшчэ шмат цікавага зробім.

Мы назіраем за ўсім, што адбываецца ў краіне, і не баімся гаварыць аб недахопах.

— Сёння вы ўдала сумяшчаеце журналістыку і абавязкі кіраўніка. Дзякуючы чаму ўдаецца дасягаць раўнавагі?

— Мне радасна, што я па-ранейшаму вяду праграму «Галоўны эфір», магу і на нейкі рэпартаж з'ездзіць. І атрымліваю ад гэтага сапраўднае задавальненне. Зразумела, прафесіі журналіста і кіраўніка адрозніваюцца, але я стараюся рабіць так, каб адно аднаму не перашкаджала. У прамы эфір выходжу ўжо не так часта — раз на тры тыдні, аднак усё роўна гэта дазваляе быць у тонусе. І плюс як кіраўнік я бачу знутры ўсё, што адбываецца. І гэта вельмі карысна, каб ведаць, чаго не хапае, як кіраваць і якія прымаць рашэнні. У працы з творчым калектывам трэба ўмець падстройвацца пад кожнага.

— Скажыце, што чакае тэлегледачоў у новым сезоне?

— Па-першае, у новай упакоўцы пабачым такія ўжо вядомыя праекты, як «Галоўны эфір», «Форум». Па-другое, у нас з'явіцца новы цікавы палітычны праект, падрабязнасці пакуль трымаем у сакрэце. Магчыма, будзе нешта яшчэ, звязанае з тэмай эканомікі. Я кажу пра вячэрнія прайм-таймавыя лінейкі, якія ідуць у нас на «Беларусь 1». Застануцца спецыяльныя рэпартажы, журналісцкія расследаванні, бо без гэтага ніяк. Аднаўляем праект «Тайны следства». Праграма «Зона-Х» рыхтуе серыю рэпартажаў сумесна з Міністэрствам унутраных спраў. З прыемных навін і тое, што мы купілі новую студыю, дзе можна мабільна працаваць са зменай дэкарацый, графікі. Таму будзем працягваць здзіўляць.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

«Форум» хутка будзе ў новай упакоўцы.

СЦІЖМА ГІРСЫ

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Гірса́ — пустазелле сямейства злакавых. *Максім ТАНК пісаў:*

Сягоння не пазнаць
Былых палос, разор,
Дзе толькі рос палын
Ды горкі хлеб з гірсою.

Дылёўка — тоўстая дошка. *Акаліцы ў хаце зроблены з дылёвак.*

Крыжава́нка — тое, што і красворд. *Настаўніца дала заданне намаляваць крыжаванку.*

Сці́жма — вялікая колькасць, мноства. *Безліч, навала, плойма, процьма, сціжма — усё гэта сінонімы.*

Гэ́бель — сталярны інструмент для стругання дрэва. *На паліцах пабліскалі інструменты: гэблі, пілкі, дрыль, долаты ўсіх калібраў.*

Шабе́та — сумка, якая носіцца на поясе. *«Цімох дастае раменную шабету, туга напакаваную ўсялякімі паперамі», — чытаем у Івана НАВУМЕНКІ.*

Чортава гібель — вельмі многа нечага, некага. Беларусы яшчэ скажуць: без ліку, без меры, сорак саракоў. Рускія — тьма тьмущая. Фразеалагізм багаты на сінонімы: у кожнай кішэні па жмені, як на дзяды, як сабак нярэзаных, як гразі і шмат іншых.

Калі ласка — зварот для ветлівай просьбы, заахвочвання. Беларускія сінонімы — будзь добры, будзь ласкаў, зрабі ласку. Рускі — будьте добры. Утварыўся выраз, відаць, у выніку скарачэння больш поўнай формы: «калі твая (ваша) ласка будзе». У сённяшняй форме выраз сустракаецца з XIX стагоддзя, напрыклад, у п'есе В. Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта».

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

«БЕЛАРУСЬ 5» ПАКАЖА МАТЧЫ НОВАГА СЕЗОНА НБА

Беларускія прыхільнікі баскетбола змогуць назіраць за матчамі наймацнейшых гульцоў планеты. З 28 кастрычніка тэлеканал «Беларусь 5» пачаў паказ гульняў новага сезона рэгулярнага чэмпіянату Нацыянальнай баскетбольнай асацыяцыі (НБА).

Плануецца, што кожны тыдзень з кастрычніка па чэрвень «Беларусь 5» будзе паказваць ад 5 да 7 гульняў, прычым нядзельныя матчы позна ўвечары будуць выходзіць у прамым эфіры.

Нагадаем, Нацыянальная баскетбольная асацыяцыя была заснавана ў 1946 годзе і ўваходзіць у пяцёрку галоўных прафесійных спартыўных ліг свету. З гісторыяй НБА звязаны імёны такіх вядомых спартсменаў, як Майкл Джардан, Шакіл А'Ніл, Джэрсі Уэст, Біл Расэл і многіх іншых.

Сачыце за падзеямі ў свеце спорту ў эфіры «Беларусь 5».

ПАНЯДЗЕЛАК, 2 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.15 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45, 20.00 Серыял «20 гадоў без кахання».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.40 Рэтрадрама «Я цябе абажаю...».
13.35, 15.50 Меладрама «Адзін на ўсіх». 1—4-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.40 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «След».
23.50 Дзень спорту.
0.05 Серыял «Раскажы мне пра мяне».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.05, 21.05 Тэлебарометр.
9.05 «Арол і Рэшка. Шопінг». Пазнавальнае стайл-шоу.
10.40 М/с «Сябры анёлаў».
11.10 Азбука смаку.
11.55, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
12.55 Дэтэктыў «Метад Фрэйда».
15.00 Меладрама «27 вясельляў».
17.00 Перазагрузка.
19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
22.05 КЕНО.
22.10 Серыял «Косці».
23.05 Рэпарцёр.
23.55 Трылер «Прывіды». Заключная серыя.
0.50 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».

БЕЛАРУСЬ 3

7.10 «Дабраранак».
7.40 «Сусветная карцінная галерэя».
7.55, 13.00, 17.00, 1.20 «Калейдаскоп».
8.10 «Пачуцце». Драма.
10.10 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
11.05 «Наперад у мінулае».
11.30, 21.00 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
12.05 «Музеі Беларусі». Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі і рэлігіі.
12.30 «Кліч Палесся». Дак. фільм.
13.10 «Да скарбаў авіякатастрофы». Драма.
15.00 «Справы фамільныя». «Добрушская папяровая фабрыка».
15.25 «Стралец непрыкаяны». Трагікамедыя.
17.10 «Доблесць зямлі беларускай». «І адзін у полі воін». Дак. фільм.
17.25 «Дачка камандзіра». Кінааповесць.
18.30 «Доблесць зямлі беларускай». «Штурм «Мядзведжага вала». Дак. фільм.
18.45 «Доблесць зямлі беларускай». «Спынены бліцкрыг». Дак. фільм.
19.00 «Аленевае паляванне». Драма.
20.10, 23.00 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
20.40 «Калыханка».
21.35, 23.25 «Першыя выпрабаванні». Кінараман. 1—2-я серыі.
0.50 «Я — часовы вандроўнік». Творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.
1.35 «Геапалітыка: свет за тыдзень».

БЕЛАРУСЬ 5

7.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгемптан» — «Борнмут».
9.15 Авертайм.
9.45 Гандбол. SEHA-ліга. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Нексе» (Харватыя).
11.10 Баскетбол. НБА. «Нью-Арлеан» — «Голдэн Стэйт».
12.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Сандэрленд».
14.45 Баскетбол. НБА. Бостан — Сан-Антоніа.
16.25 Тэніс. Выніковы турнір ВТА. Сінгапур. Фінал.
18.30 Час футбола.
19.15 PRO спорт. Навіны.
19.25 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Рыга).
21.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.35 PRO спорт. Вынікі.
23.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Астан Віла».
0.55 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!»
11.05, 13.5. 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 «Адваротны адлік». «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 «Хроніка Мінскага гета-2. За гонар і свабоду».
23.15 Маст. фільм «Квінтэт».
1.15 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае сняданне».
10.05 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Ведай нашых!»
14.25 «Такі лёс».
15.10 «Іншая краіна». «Ад А да Я — Аўстралія».
16.50 «Вялікі горад».
18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Хто п'е, а хто лечыцца?»
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 Маст. фільм «Даўнія палюбоўнікі».
1.15 «Апошняе прароцтва святой Матроны».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30 Серыял «Белы наліў».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
16.20, 5.05 «Іншы свет».
16.50, 5.30 «Зямля. Тэрыторыя загадак». Тайна старажытнай медыцыны.
17.20, 2.45 Серыял «Калі нам лёс...»
19.25 Серыял «Развод».
22.05 Маст. фільм «Сысці, каб застацца».
23.55 Галоўная тэма.
0.10 Ток-шоу «Слова за слова».
1.00 Маст. фільм «Завяшчанне прафесара Доўэля».
4.20 Дак. фільм «З нагоды. Каханне хулігана».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 Ток-шоу «Што адбываецца».
12.35 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 Серыял «Тайны следства».
19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».
22.05, 23.10 Серыял «Пісьмы на шкле. Лёс».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 «Акцэнты тыдня».
7.10, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».
9.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
10.20 «Лаліта».
11.20 Серыял «Ляснік».
13.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «Ядзім дома».
14.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
17.55 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Высокія стаўкі».
21.25 Серыял «Чума».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Серыял «Бездань».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.50, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.55 Серыял «Злачынная імперыя».
8.25 Маст. фільм «Парыжскія тайны».
10.10, 18.20 «Аналітычная праграма».
10.20 Драма «Маанзунд».
12.45, 13.50, 15.45, 16.25, 18.30, 19.35, 21.00 «Хатняя крама».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Лавізна».
16.35 Серыял «Радзіма».
18.35 Серыял «Мушкецёры».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Драма «Ю-571».
23.15 Серыял «Нясхільная Кімі Шміт».

ВТВ

6.00, 14.30, 4.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
6.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30 «Турбаміксер».
8.30, 16.30 Серыял «Вароніны».
9.00 «Жанатыя з першага погляду».
10.00, 14.00, 20.00 Серыял «Кухня 5».
11.00 Меладрама «Дарагі Джон».
13.10 «Ералаш».
15.00, 3.00 «Спатканне для мамы».
16.00, 4.30 «Лаві момант».
18.00, 23.30 Серыял «Анжаліка».
19.00 Серыял «Лонданград».
21.10 Камедыя «Шлёпні яе, яна французанка».
23.00, 2.30, 5.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.30, 5.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Выжыць пасля».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 0.15 Навіны культуры.
10.15, 1.40 «Наглядальнік».
11.15 «Мужнасць». Маст. фільм.
12.25 «Лінія жыцця». Веніямін Смехаў.
13.20 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
14.50, 1.35 «Эрнан Картэс». Дак. фільм.
15.10 «Усё роўна яго не кіну. Агнія Барто». Дак. фільм.
15.50 «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.
17.05, 1.20, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
17.25 Прысвячэнне Дэбюсі. Сімфанічны аркестр Лільскай оперы.
18.25 «Юрый Алеша. Па мянушцы Пісьменнік». Дак. фільм.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 «90 гадоў рэжысёру. «Уладзімір Горыкер. Рэдкі жанр». Дак. фільм.
20.45 «Жывое слова».
21.25 «Тым часам».
22.15 Урачыстае адкрыццё гістарычнай сцэны тэатра «Геліканд-Опера».
0.30 Мастсавет.
0.40 Дакументальная камера. «Кіно. Маніфест сямі мастацтваў».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983.
6.45, 7.40, 11.40, 12.40, 13.35, 14.55, 17.25, 19.05, 20.30, 21.40, 23.00, 0.40, 2.30, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.00, 13.00 «Смяяцца, сапраўды, не грэх...»
8.15 М/ф «Пунсовенькая кветачка».
9.00 «Быў час». 2009 год.
10.00 Маст. фільм «Майстэрства жыць у Адэсе».
12.00 «Акулы пяра». Ірына Салтыкова. 1996 год.
14.00 Канцэрт групы «Аліса». Рок-фестываль у Ленінградзе. 1988 год.
15.30 Маст. фільм «Дзікае каханне».
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 1960-х». 2005 год.
19.20 Маст. фільм «І паўторыцца ўсё».
20.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
1.00 Маст. фільм «Гарадскі раманс».
2.45 М/ф «Някемлівы верабей».
4.00 «Колба часу».

EUROSPORT

5.00, 17.00, 19.00, 1.00 Футбол. MLS. Плэй-оф.
7.30, 4.00 Аўтаспорт. Серыя WTCC.
9.00, 21.00 WATTS!
9.30, 15.00 Марафон. Нью-Ёрк.
10.25 Спорт&Ко.
10.30, 21.15, 22.45, 1.45 Футбол. Кубак свету. (U-17.)
13.00 Фігурнае катанне. Гранпры Skate Canada. Лепшыя моманты.
16.00 «Яго Вялікасць футбол». Англія — Германія.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 3.00 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
7.00 Камедыя «Нерэальнае каханне».
8.30 Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
10.30 Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
12.15 Камедыя «Сямейны план».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.15, 0.45, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Модная штучка».
17.40, 22.00 Серыял «Прападобны».
18.40 Камедыя «Вялікі Джым».
20.20 Камедыя «Снежная нявеста».
23.10 Камедыя «Віктар».
1.10 Камедыя «Горка».
4.00 Меладрама «Каханне — гэта на дваіх».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.55 «Доктар І...»
8.25, 18.55, 1.25 «Курт Сеіт і Аляксандра». Серыял.
10.05, 3.45 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.55, 4.30 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.50 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.45 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
13.40 «Начная фіялка».
15.25, 3.00 «Нераскрытыя тайны».
16.20 «Мой герой».
17.10, 5.20 «Знахар 21 стагоддзя». Дак. фільм.
18.00 «Тайны следства». Серыял.
20.55, 0.40 «1943». Серыял.
21.55 «Ганна Герман». Серыял.
23.00 «Часова даступны».
23.55 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.20, 16.20 Меладрама «Бурлеск».
8.30, 2.20 Меладрама «Шоўк».
10.30 Камедыя «Эд з тэлевізара».
12.40 Баявік «Прывідны гоншчык».
14.50 Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж.К. Роўлінг».
18.20 Драма «Язмін».
20.00 Камедыя «Іможэн».
21.50 Драма «Рэй».
0.30 Камедыя «Дарослая нечаканасць».
4.25 Меладрама «Справа ў табе».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Казка «Пасля дожджыку ў чацвер».
7.40 Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
9.05 М/ф «Бабай».
10.20 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
11.50 М/ф «Смяшарыкі. Пачатак».
13.30 Прыгоды «Скарбы О.К.»
15.30 Меладрама «М+Ж».
17.10 Меладрама «Федзька».
18.40 Прыгоды «Тайна цёмнага пакоя».
20.20 Камедыя «Нерэальнае каханне».
21.50 Меладрама «Звычка расставацца».
23.20 Драма «Гамлет. XXI стагоддзе».
1.50 Драма «Кіно пра Аляксеева».
3.25 Драма «Іншае неба».
5.00 Маст. фільм «Што ў Сенькі было».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.50 Папулярная навука.
7.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.40 Золата Юкана.
8.30 Дзікі тунец.
9.20, 13.30, 19.20 Погляд знутры.
10.10, 14.20, 20.10 Наступнае мегацунамі.
11.00 Аўта-SOS.
11.50 Шаша праз пекла.
12.40 Будаўнічая ліхаманка.
15.10 Гонка да Паўднёвага полюса.
16.00 Моц племя.
16.50 Злавіць кантрабандыста.
17.40, 21.50, 2.00, 5.15 Міжнародны аэрапорт Дубай.
18.30, 2.50 Абаронцы культурнай спадчыны.
21.00, 4.30 Непаражальныя канструкцыі.
22.40, 3.40 Паранармальнае.
23.30 Ракавая стыхія.
0.20 Расследаванні авіякатастроф.
1.10 Падарожжа фатографа па Вялікім кітайскім канале.

DISCOVERY

8.00, 12.30 У пагоні за класікай.
8.50 Цуды Сонечнай сістэмы.
9.45, 14.20 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
10.40, 17.05 Паляўнічыя на склады.
11.35, 7.10 Гульня на жыццё.
13.25, 6.25 Не спрабуйце паўтарыць.
15.15, 5.35 Хуткія і гучныя.
16.10, 3.00 Махінатары.
18.00 Трой.
19.00 Лепшыя ў сваёй справе.
20.00 Разбуральнікі легенд.
21.30 Чуйскі тракт.
22.00 Падарожжа ў невядомасць.
23.00 Голыя і напалоханыя.
1.00 Рыбацкія легенды.
2.00, 4.50 Бітвы за кантэйнеры.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 3 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.30 Зона Х.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Серыял «20 гадоў без кахання». Заключная серыя.
12.10 Серыял «Каханне — не бульбачка».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Зроблена ў СССР».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.40 Серыял «Чорныя кошкі».
16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6». 1-я серыя.
17.40 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
20.00 Серыял «Добрае імя». 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.45 Спецыяльны рэпартаж.
0.25 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 15.55 «Арол і Рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
10.10, 21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
11.05 «Зразумець і абясшкодзіць».
12.05, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
13.05 Серыял «Косці».
14.00, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
17.00 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
22.05 Спортлато 6 з 49. КЕНО.
22.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — ЦСКА. Чацвёрты тур.
0.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.

БЕЛАРУСЬ 3

7.10 «Дабраранак».
7.40 «Сусветная карцінная галерэя».
7.55, 14.25, 18.40, 23.35 «Калейдаскоп».
8.10 «На дне». Драма.
9.40 «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі». Дак. фільм.
10.35, 12.30 «Першыя выпрабаванні». Кінараман.
12.00 «Я — часовы вандроўнік». Творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.
14.00, 23.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора Юрыя Цырука.
14.40 «Славянскі базар-2011». Юбілейны канцэрт арт-групы «Хор Турэцкага».
16.10 «Тапёр». Драма.
18.55, 21.25 «Блуканне па пакутах». Драма, 1—2-я серыі.
20.10, 22.40 «Дыя@блог». «Пра мову».
20.40 «Калыханка».
21.00 «Полымя і попел Першай сусветнай. Крэпасць Асавец. Рускія не здаюцца». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

7.35 PRO спорт. Вынікі.
8.05 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Рыга).
10.00 Тэніс. Турнір ВТА. Жухай.
12.05 Сэлфі.
12.20 Час футбола.
13.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
14.00 Тэніс. Турнір ВТА. Жухай.
17.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ты тур. «Астана» (Казахстан) — «Атлетыка» (Мадрыд, Іспанія). У перапынку — «PRO спорт. Навіны»).
19.55 Спорт-кадр.
20.25 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Першы матч. «Спарта» (Чэхія) — «Кярпят» (Фінляндыя).
22.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ты тур. Анлайн гульнявога дня.
0.50 PRO спорт. Навіны.
1.00 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Кат».
23.00 Камедыя «Кін-дза-дза!».

1.20 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Камедыя «Мэвэрык».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Наша справа».
14.05 «Ведай нашых!»
14.45, 23.40 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
18.35 «Дакументальны праект»: «Зялёны Салярыс».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Тэрыторыя памылак».
22.00 «Глядзець усім!»
23.00 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
23.20 «Аўтапанарама».
1.20 «Дакументальны праект»: «Захавальнікі тонкіх светаў».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 1.00 Маст. фільм «Пачатак».
11.10 Маст. фільм «Пайсці, каб застацца».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 19.25 Серыял «Развод».
15.05 «Справы сямейныя.
16.20, 5.05 «Іншы свет».
16.50, 5.30 «Зямля. Тэрыторыя загадак». Каўчэг Запавету.
17.20, 2.45 Серыял «Калі нам лёс...»
21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
22.05 Маст. фільм «Права на Надзею».
23.55 Галоўная тэма.
0.10 Ток-шоу «Слова за слова».
4.20 Дак. серыял «З нагоды. Тайны скарбаў».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Мая планета».
12.25, 0.00 «Чорны бізнес развітога сацыялізму. Цэхавікі». «Следчы эксперымент. Гісторыя атручванняў».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 Серыял «Сямейны дэтэктыў».
19.10, 20.55 Серыял «Склі-фасоўскі».
22.05, 23.10 Серыял «Пісьмы на шкле. Лёс».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 «Новыя рускія сенсацыі».
7.10, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».
9.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
10.20 «Лаліта».
11.20 Серыял «Ляснік».
13.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.55 «Справа густу».
14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
17.55 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Высокія стаўкі».
21.25 Серыял «Чума».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Серыял «Бездань».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».
8.30, 18.30 Серыял «Мушкецёры».
9.25, 12.55, 13.50, 15.45, 16.20, 18.25, 19.25, 21.00 «Хатняя крама».
9.35 Дакументальны экран.
10.15 «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
11.15 Драма «Віны».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Лавізна».
16.30 Серыял «Радзіма».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.20 Драма «Гэты смутны аб'ект жадання».
23.15 Серыял «Нясхільная Кімі Шміт».

ВТБ

6.00, 4.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
6.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30 «Турбаміксер».
8.30, 16.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Анжаліка».
10.00, 14.00, 20.00 Серыял «Кухня 5».
11.00, 19.00 Серыял «Лондан-град».
13.45 «Ералаш».
12.00 Камедыя «Шлёпні яе, яна французанка».
15.00, 3.00 «Спатканне для мамы».
16.00, 4.30 «Лаві момант».
21.10 Камедыя «Амаль замужам».
23.00, 2.30, 5.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.30, 5.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Выжыць пасля».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Наглядальнік».
11.15, 23.50 «Вершнік па імені Смерць». Маст. фільм.
13.05 «Сяргей Бондзі. Агонь у ачагу». Дак. фільм.
13.45 «Эрмітаж».
14.15 «Наталля Дудзінская. Багіня танца». Дак. фільм.
15.10, 20.45 «Жывое слова».
15.50 «Уладзімір Горыкер. Рэдкі жанр». Дак. фільм.
16.30, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
16.45 Дакументальная камера. «Кіно. Маніфест сямі мастацтваў».
17.25 Фестываль «Піянаскоп» у Баве.
18.25 «Самуіл Маршак. Звычайны геній». Дак. фільм.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 Штучны адбор.
21.25 «Тры тайны адваката Плявака». Дак. фільм.
21.50 «Гульня ў бісер». «А.С. Пушкін. «Барыс Гадуноў».
22.35 Ступені цывілізацыі. «Адкрываючы Ангкор нанова». Дак. фільм.
23.45 Мастсавет.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Ірына Салтыкова. 1996 год.
6.40, 7.35, 8.55, 11.25, 13.05, 14.30, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.45, 1.40, 5.40 Музычная настальгія.
7.00, 1.00 «Смяяцца, сапраўды, не грэх...»
8.00 Канцэрт групы «Аліса». Рок-фестываль у Ленінградзе. 1988 год.
9.30 Маст. фільм «Дзікае каханне».
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 1960-х». 2005 год.
13.20 Маст. фільм «І паўторыцца ўсё».
14.45, 20.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
18.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Івар Калныньш. 2008 год.
18.55 «Хачу ўсё ведаць!» 1980 год.
19.10 Маст. фільм «Споведзь».
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983. 4-я частка.
2.15 М/ф «Пунсовенькая кветачка».
3.00 «Быў час». 2009 год.
4.00 Маст. фільм «Майстэрства жыць у Адэсе».

EUROSPORT

5.00 Фігурнае катанне. Гран-пры Skate Canada. Найлепшыя моманты.
6.30 Конны спорт. Скачкі.
7.30 Марафон. Нью-Ёрк.
9.00, 11.30, 13.00, 14.30, 18.00, 19.05, 20.00, 2.00 Футбол. MLS. Плэй-оф.
10.30, 11.25, 19.00, 19.55 Футбол. Еўрагалы.
10.35, 22.00 Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
11.00, 19.30 Футбол. Веліч футбола.
16.00, 21.00 «Яго Вялікасць футбол». Галандыя — Германія.
17.00 WATTS!
22.30 Баскетбол. «Валенсія» (Іспанія) — «Венецыя» (Італія).
0.10 «Вялікія гонкі».
0.15 Аўтаспорт. Серыя World Endurance.
0.45 Акадэмія GT. Аўтаспорт.
1.00 «За кулісамі ралі ERC».
1.30 Аўтаспорт. Поршэ Супер Кап.

КАМЕДЫЯ

6.00, 3.00 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
7.00 Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
8.30 Камедыя «Сямейны план».
10.10, 17.40 Серыял «Прападобны».
10.40 Камедыя «Модная штучка».
12.25 Камедыя «Вялікі Джым».
14.00, 14.45, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 1.00, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Віктар».
18.45 Камедыя «Снежная нявеста».
20.20 Камедыя «На здрадзе».
22.00 Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
23.10 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
1.15 Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.50 «Доктар І...»
8.20, 18.50, 1.20 «Курт Сеіт і Аляксандра». Серыял.
10.00, 3.40 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.50, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.45 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.40 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
13.30, 17.55 «Тайны следства». Серыял.
14.25 «Простыя складанасці».
14.55 «Рокіно».
15.05, 2.55 «Нераскрытыя тайны».
16.00 «Мой герой».
16.50, 21.50 «Ганна Герман». Серыял.
20.50, 0.35 «1943». Серыял.
22.55 «Зорныя гісторыі».
23.50 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.10 Камедыя «Эд з тэлевізара».
8.30 Камедыя «Мадлен».
10.20 Драма «Рэй».
13.00 Меладрама «А вось і Полі!».
14.40 Драма «Галгофа».
16.30, 1.20 Драма «Перапыненае жыццё».
18.40 Меладрама «Парыж — Манхэтэн».
20.00 Камедыя «Дарослая нечаканасць».
21.45 Трылер «Стоўн».
23.30 Фантастыка «Дзіця чалавечае».
3.25 Драма «Гангстар».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Казка «Дзюймовачка».
8.10 Камедыя «Палярны рэйс».
10.05 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
11.45 М/ф «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч».
13.05 Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
14.40 Драма «Люстэркі».
17.05 Камедыя «Падарунак з характарам».
18.40 Камедыя «Ёлкі 3».
20.20 Казка «Тайна чатырох прынцэс».
22.10 Меладрама «Адзінокі па кантракце».
0.10 Камедыя «Калачы».
1.40 Драма «Анёлы вайны».
4.00 Драма «Паршывыя авечкі».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.50 Папулярная навука.
7.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.40 Погляд знутры.
8.30 Наступнае мегацунамі.
9.20, 13.30, 19.20 Непаражальныя канструкцыі.
10.10, 14.20, 20.10 Міжнародны аэрапорт Дубай.
11.00 Аўта-SOS.
11.50 Шаша праз пекла.
12.40 Будаўнічая ліхаманка.
15.10 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.00 Моц племя.
16.50, 21.00, 1.10, 4.30 Гульні розуму.
17.40, 21.50, 2.00, 5.15 Чалавек супраць YouTube.
18.30, 2.50 Нацысцкая падводная лодка.
22.40, 3.40 Паранармальнае.
23.30 Ракавая стыхія.
0.20 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY

8.00, 12.30, 22.00 Хуткія і гучныя.
8.50 Не спрабуйце паўтарыць.
9.45, 14.20, 21.30 Як гэта ўстроена?
10.10, 1.00 Чуйскі тракт.
10.40, 17.05 Бітвы за кантэйнеры.
11.35, 7.10 Рыбацкія легенды.
13.25, 6.25 Што было далей?
14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
15.15, 5.35 Круты цюнінг.
16.10, 23.00, 3.00 Махінатары.
18.00 Голыя і напалоханыя.
20.00 Падарожжа ў невядомасць.
0.00 Кубінскі хром.
1.30 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
2.00, 4.50 Скарбы з каморкі.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

«Я ХАЧУ ГЭТА ЎБАЧЫЦЬ»

Адкрывайце Беларусь з аднайменнай праграмай

Праграма «Я хачу гэта ўбачыць», якая выходзіць у эфіры маладзёжнага тэлеканала «Беларусь 2» і міжнароднага «Беларусь 24», стала пераможцай XIII рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» у намінацыі «За творчы падыход у асвятленні турызму».

Конкурс заснаваны Міністэрствам спорту і турызму ў 2003 годзе. Штогод пасля заканчэння летняга сезона вызначаюцца ўдзельнікі, якія наведалі найбольшую колькасць турыстычных аб'ектаў, расказалі пра гэта ў СМІ і г.д. Сёлета пераможцаў выбіралі ў васьмі намінацыях.

— Праект «Я хачу гэта ўбачыць» з'яўляецца даведнікам для многіх гледачоў, якія пасля прагляду адпраўляюцца вандраваць па нашым маршруце і дзякуюць за падказкі. Перамога на конкурсе «Пазнай Беларусь» — для нас творчы камплімент, што прагучаў не толькі ад сяброў і калег, але і ад сапраўдных прафесіяналаў у сферы турызму. Значыць, наша зладжаная каманда паспяхова працуе. У нас у планах наведаць яшчэ многія рэгіёны Беларусі і славутасці за яе межамі, — адзначыў аўтар і кіраўнік праекта Уладзімір Богдан.

Нагадаем, праект «Я хачу гэта ўбачыць» стартаваў на беларускім тэлебачанні ў жніўні мінулага года. Ён знаёміць тэлеаўдыторыю не толькі са славутасцямі Беларусі, але і адкрывае нашых унікальных майстроў, распавядае пра народныя рамёствы і нацыянальную кухню.

АДГУКНІЦЕСЯ, ТАЛЕНТЫ!

Заяві пра сябе на радыёконкурсе

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё працягвае прыём заявак на ўдзел у V рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі», які праводзіцца дзеля выяўлення і падтрымкі маладых адораных выканаўцаў у розных жанрах музычнага мастацтва. Дэдлайн адпраўкі заявак — 1 лістапада ўключна.

Гэтым разам творчае спаборніцтва прымеркавана да Года моладзі і 90-годдзя Беларускага радыё. Конкурс праводзіцца з верасня па снежань па трох намінацыях: «Эстрадны вакал», «Інструментальная музыка, салісты» і «Спадчына» (творчы пошук у галіне фальклору і этнічнай музыкі).

— Мы ўжо атрымалі шмат заявак на ўдзел у конкурсе «Маладыя таленты Беларусі». Прыярытэт па колькасці — у намінацыі «Эстрадны вакал», таму асабліва чакаем таленавітых дзяцей, якія праяўляць сябе таксама ў намінацыях «Інструментальная музыка, салісты» і «Спадчына». Як паказвае практыка, не ўсе паспяваюць своечасова адправіць заяўку, таму звяртаем увагу на тое, што часу застаецца зусім мала, — падкрэсліла аўтарка і кіраўнік праекта Таццяна Якушава.

У творчым спаборніцтве могуць прыняць удзел маладыя людзі ва ўзросце ад 10 да 21 года, навучэнцы дзіцячых музычных школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, удзельнікі музычных і эстрадных студый, а таксама студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

Заяўкі і запісы прымаюцца на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Чырвоная, 4. Альбо на электронны адрас *talentbelarus@gmail.com*. Тэлефон для даведак: 8 (017) 284-32-05. Падрабязная інфармацыя — на сайце Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё *www.radio1.by*. Плануецца, што першае праслухоўванне юных талентаў адбудзецца ў сярэдзіне лістапада.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

СЕРАДА, 4 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.20 Зона Х.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00, 20.00 Серыял «Добрае імя».
12.10 Серыял «Каханне — не бульбачка». Заключная серыя.
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Зроблена ў СССР».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.40 Серыял «Чорныя кошкі». Заключная серыя.
16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
17.40 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Актуальнае інтэрв'ю.
0.25 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 15.55 «Арол і Рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
10.05, 21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
11.15, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
12.10 Дэтэктыў «Марыя Верн: Зніклы хлопчык».
13.50, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
17.00 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
22.10 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
22.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Барселона» (Іспанія) — БАТЭ (Беларусь). Чацвёрты тур.
0.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд гульнявога дня.

БЕЛАРУСЬ 3

7.10 «Дабраранак».
7.40 «Сусветная карцінная галерэя».
7.55, 13.25, 18.40, 0.05 «Калейдаскоп».
8.10, 19.00, 21.45 «Блуканне па пакутах». Драма.
10.45, 21.00 «Балканская пастка. Тайна Сараеўскага замаху». Дак. фільм.
11.35 «Трактарысты». Меладрама.
12.55, 23.40 «Святло далёкай зоркі». Памяці скульптара Юрыя Палякова.
13.35, 18.55 «Размаўляем па-беларуску».
13.45 Міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер-2015» у Магілёве. Урачыстае адкрыццё.

15.20 «На дне». Драма.
16.50 «Без эпітафіі». Жыццёвы творчы шлях Цішкі Гартнага.
17.40 «Збянтэжаны Саўка». Маст. фільм.
18.15 «Полымя і попел Першай сусветнай. Крэпасць Асавец. Рускія не здаюцца». Дак. фільм.
20.10, 23.15 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
20.40 «Калыханка».

БЕЛАРУСЬ 5

7.25, 19.30, 0.50 PRO спорт. Навіны.
7.35, 16.05 Козел пра футбол.
7.55, 19.40 Баскетбол. НБА. Маямі — Атланта.
9.30 Спорт-кадр.
11.40 Містыка «Знаёмцеся, Джо Блэк».
14.45, 2.15 Фантастыка «Дзіця чалавечае».
16.40 Меладрама «Парыж — Манхэтэн».
18.05 Драма «Мяжа рызыкі».
20.00 Камедыя «Вядзьмарка».
21.50 Драма «Марыя — каралева Шатландыі».
0.00 Драма «Гавана, я люблю цябе».
4.10 Фантастыка «Чорная дзірка».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Злачынства і пакаранне».
8.10 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
9.45 Драма «Паршывыя авечкі».
11.50 Трагікамедыя «Нябёсы запаветныя».
13.55 М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».
15.35 Прыгоды «Тайна цёмнага пакоя».
17.05 Драма «Перамір'е».
18.50 Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
20.20 Драма «24 гадзіны».
22.05 Камедыя «Палярны рэйс».
23.45 Баявік «Антыкілер».
1.45 Дэтэктыў «Гатэль».
3.10 Меладрама «Адзінокі па кантракце».
4.50 Драма «Падарожжа аўтастопам».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.50, 7.40 Папулярная навука.
7.15, 8.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Зрабі або памры.
9.20 Асветленая багна.
10.10, 16.50 Па тонкім лёдзе.
11.00 Навука будучыні.
11.50 Космас. Прастора і час.
12.35 Погляд знутры.
13.30 Супердрэбудаванні Трэцяга рэйха.
14.20 Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
15.20 Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
16.25 Тайвань: вастраў рыбы.
17.40 Пагоня за ледавікамі.
19.00 Шырокі погляд.
20.10 Карставыя варонкі.
21.00, 1.10, 4.30 Эвакуацыя Зямлі.
21.50, 2.00, 5.15 Праўда пра зомбі.
22.40 2.50 Уварванне на Зямлю.
0.20 Паранармальнае.

DISCOVERY

8.00, 15.15, 6.25 Махінатары.
8.50 Мяцежнікі ледзянога возера.
9.45 Смяротны ўлоў.
10.40 Буйны ўлоў.
11.35 Гаражнае золата.
12.30 Склады.
13.25, 22.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
14.20, 3.00 Хуткія і гучныя.
16.10, 5.35 Кубінскі хром.
17.05, 4.50 Космас навыварат.
18.00, 20.00, 4.00 Як уладкаваны Сусвет.
19.00 Цуды Сусвету.
22.30 Чуйскі тракт.
23.00 Падарожжа ў невядомасць.
0.00 Прыроджаныя каралі.
2.00 Голыя і напалоханыя.
7.13 Трой.

■ Вакол прыгажосці

ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ БЫЦЬ ЛЯЛЬКАМІ

Закаханыя перанеслі серыю аперацый, каб стаць падобнымі на сусветна вядомых лялек Барбі і Кена. Анастасія і Квенцін выдаткавалі на аперацыі каля 210 тысяч еўра і не маюць намеру спыняцца на дасягнутым.

20-гадовая Анастасія Рэскас і яе малады чалавек — 23-гадовы француз Квенцін Дэхар пазнаёміліся ў 2013 годзе ў Сан-Трапэ. Там яны разгаварыліся і раптам выявілі, што абодва з'яўляюцца заўзятымі фанатамі «старых добрых» Кена і Барбі. Неўзабаве ўраджэнка Расіі і грамадзянін Францыі пачалі сустракацца. Праз некалькі месяцаў яны пачалі эксперыменты са знешнасцю.

— Мае бацькі купілі мне ўсіх Барбі, якіх я хацела. У нейкі момант іх стала больш за сто, і я любіла іх усіх, яны такія прыгожыя! Я марыла быць падобнай на Барбі з 14 гадоў, — цытуюць Рэскас СМІ.

Усяго за два гады парачка перанесла некалькі дзясяткаў хірургічных умяшанняў на немалую суму грошай. Цяпер Анастасія збіраецца перарабіць вушы, а Квенцін рыхтуецца ўставіць у грудзі імплантанты. Паводле слоў родных, Квенцін і Анастасія мала падобныя да сябе ранейшых. І свякі так і завуць іх — Кен і Барбі.

Трэба сказаць, што Анастасія і Квенцін далёка не першапраходцы па ператварэнні людзей у лялек. Немалая колькасць, у асноўным дзяўчат, захапляецца падобным ужо некалькі гадоў. Прычым іх колькасць расце з кожным годам. Не палохае іх нават тое, што ў выніку не зусім удалых аперацый твары некаторых «лялек» атрымліваюцца проста знявечанымі. Мелі месца і смяротныя выпадкі.

АКТРЫСУ ЗАПАДОЗРЫЛІ Ў НЕНАТУРАЛЬНАСЦІ

У Кітаі актрыса Ян Він, вядомая пад сцэнічным імем Анджэла Бэйбі, падвергнулася праверцы медыцынскімі экспертамі пасля таго, як пекінская клініка пластычнай хірургіі Ruili заявіла, што прыгажосць жанчыны не з'яўляецца прыроднай.

Прадстаўнікі Ruili паведамілі прэсе, што па просьбе 26-гадовай Ян выканалі шэраг умяшанняў з мэтай паляпшэння рыс яе твару. Кітайская «зорка» назвала інфармацыю паклёпам і патлумачыла, што некаторымі еўрапейскімі рысамі твару абавязаная дзядулі-немцу. Актрыса звярнулася да незалежных экспертаў, каб даказаць натуральнасць сваёй знешнасці. Урачы выканалі серыю рэнтгенаўскіх здымкаў і працэдур МРТ, якія пацвердзілі, што касцявыя і мяккія тканкі твару не падвяргаліся ніякім аперацыям. Ян падала ў суд на клініку, патрабуючы грашовай кампенсацыі.

Анджэла Бэйбі выйшла замуж за акцёра Хуан Сяаміна. Паводле звестак The Independent, іх вяселле абышлося ў 200 мільёнаў юаняў (больш як 31 мільён долараў). Малады муж таксама абверг чуткі аб ненатуральнай знешнасці сваёй жонкі. У якасці доказу Хуан заявіў, што часам яго жонка, як і ўсе жанчыны, выглядае «па-сапраўднаму страшнай».

■ Замор'е

Усім косам каса

Гі Менг з Кітая за 35 гадоў адгадавала касу даўжынёй 2,52 метра, каб трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса. 59-гадовая жанчына з народнасці мяо ў правінцыі Юньнань не стрыгла валасы з 24 гадоў.

Падчас працы ў полі Гі Менг закручвае сваю касу ў пяць кольцаў на галаве і тры разы абмотвае вакол таліі. Каса — галоўнае яе багацце. Кітаянка кажа, што мець доўгія валасы карысна для здароўя, аднак у чым менавіта заключаецца карысць, не ўдакладніла. Пры гэтым Гі Менг паскардзілася СМІ на тое, што пасля мыцця яе каса сохне каля сямі дзён. Раней жанчына адмовілася ад прапановы куплі яе валасоў за 19 000 юаняў (каля 53 мільёнаў рублёў), таму што хацела паставіць сусветны рэкорд. Сёння першае месца належыць іншай кітаянцы — Ксі Куіпінг, якая трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса ў 2004 годзе. Даўжыня яе валасоў на той момант складала 5,6 метра.

Мужчын вучаць хадзе на... абцасах

У венскай акадэміі Top in Heels, дзе жанчын вучаць прыгожа хадзіць на высокіх абцасах, адкрыліся такія ж курсы для мужчын.

Як паведамляе The Local, вялікую цікавасць да гэтага мясцовыя жыхары сталі праяўляць пасля конкурсу «Еўрабачанне», у якім перамог аўстрыйскі спявак Том Нойвірт, больш вядомы пад псеўданімам Канчыта Вурст. На сцэну ён выходзіць у жаночай сукенцы і з барадой.

Курсы атрымалі назву Men In Heels, яны пачнуцца з 30 кастрычніка, кошт паўтарагадзіннага занятка — 45 еўра. Арганізатары мяркуюць, што хаджэнне на абцасах можа стаць трэндам сярод прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва. Курсы вядуць танцорка Мары-Крысцін Шчэрзер і дрэг-квін (гэтым тэрмінам пазначаюць артыстаў мужчынскага полу, якія пераапранаюцца ў жанчын) Гельмут Фіксл.

Печыва з «Тытаніка» прадалі за $23000

Печыва-крэкер са славутага лайнера, якое апынулася ў адной са шлюпак, прадалі за 23 тысячы долараў.

Печыва пайшло з таргоў на аўкцыёне Henry Aldridge & Son у Дэвайзесе, Англія. Пакупніком стаў калекцыянер з Грэцыі, імя якога не называецца. Крэкер з «Тытаніка» стаў самым дарагім у гісторыі. Апошнія сто гадоў хлебабулачны выраб маркі Pilot вытворчасці кампаніі Spillers and Bakers захоўваўся ў якасці сувеніра. Яго захаваў Джэймс Фэнвік, пасажыр парахода «Карпатыя», экіпаж якога прыйшоў на дапамогу тым, хто выжыў пасля затаплення «Тытаніка». На днях на аўкцыёне ў брытанскім Уілтшыры фотаздымак айсберга, які, як мяркуецца, стаў прычынай гібелі лайнера, пайшоў з малатка за 21 тысячу фунтаў стэрлінгаў.

Іван КУПАРВАС.

■

НЯДЗЕЛЯ, 8 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

7.25 Меладрама «Там, дзе ёсць шчасце для мяне».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40 Гісторыі рамонту.
10.20 «50 рэцэптаў першага».
11.00 XXL WOMAN TV.
11.40 Навіны надвор'я.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Каробка перадач.
13.10 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.45 Тайны следства.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
15.30 Камедыя «Масква—Лапушкі».
17.20 Меладрама «Тры таварышы». 1—4-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Клуб рэдактараў.
22.35 Навіны надвор'я.
22.55 Меладрама «Знарок не прыдумаеш».
0.55 Серыял «Як выйсці замуж за мільянера-2».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 М/с «Сябры анёлаў».
8.15 Серыял «Хто ў доме гаспадар?». 1—4-я серыі.
10.10 «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
11.15, 20.05 Тэлебарометр.
11.20 Ваша лато.
11.50 Пяцёрачка.
12.25 «Зразумець і абясшкодзіць».
13.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».
15.05 Фэнтэзі «Персі Джэксан і Выкрадальнікі маланак».
17.10 Фільм-катастрофа «Некіравальны».
19.15 Суперлато.
20.40 Кіпень.
21.10 Дэтэктыў «Метад Фрэйда 2».
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.20 Хачу ў тэлевізар!
23.25 Меладрама «Іншаземка».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 11.00, 14.45, 18.05, 23.50 «Калейдаскоп».
8.15, 11.15, 14.55 «Размаўляем па-беларуску».
8.20, 18.15, 22.00 «Блуканне па пакутах». Драма.
10.35 «Полымя і попел Першай сусветнай. Сёстры неміласэрнай вайны». Дак. фільм.
11.20 «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Алесь Камоцкі, Аляксандр Баль, Вольга Залеская.
12.00 «Наперад у мінулае».
12.25 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
13.20 «Справы фамільныя». «Цукровы магнат».
13.50 «Музеі Беларусі». Музей беларускага кнігадрукавання і Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага.
14.15 «Азёрная Адысея». Азёры Атолава, Крывое, Чарбамысла і Глыбокае.
15.05 «Гітара па крузе». Валерый Чэчат, выканаўца бардаўскай класікі.
16.05 «Па галоўнай вуліцы з аркестрам». Трагікамедыя.
17.35 Тэлеверсія адкрыцця XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад 2015».
20.40 «Калыханка».
21.00 «Міхаіл Таніч: Усё добрае — не забываецца...» Канцэрт.
23.10 Леанід Млечын прадстаўляе. «Ад Лютаўскай рэвалюцыі да Кастрычніцкай контррэвалюцыі». Дак. фільм цыкла «Сусветныя тайны».

БЕЛАРУСЬ 5

7.20, 23.20 PRO спорт. Навіны.
7.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сток Сіці» — «Чэлсі».
9.20 Баскетбол. НБА. Чыкага — Мінесота.
11.00 Тэніс. Турнір ВТА. Жухай. Фінал.
13.00 Формула-Е. Гран-пры Малайзіі.
13.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Матч апошняга тура.
15.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
16.25 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Німбурк» (Чэхія).
18.20 Фактар сілы.
18.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Тотэнхэм».
20.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Манчэстэр Сіці».
22.55 Авертайм.
23.30 Баскетбол. НБА. Кліўленд — Індыяна.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.15 «Брэйн-рынг».
12.15 «Тэорыя змовы».
13.15 Да юбілею акцёра. «Алег Меньшыкаў. «Час, калі ты можаш усё!»
14.10, 16.20 Камедыя «Пакроўскія вароты».
16.15 Навіны спорту.
17.00 «Кропля ў кроплю».
20.00 Контуры.
21.05 «Голас».
23.20 Толькі для дарослых. Трылер «Метад». Сеанс трэці.

СТБ

6.30 «Афрамасквіч». Серыял.
7.20 «Скардзіцца дазваляецца».
7.40, 16.50 «Аўтапанарама».
8.10 Маст. фільм «Сірано дэ Бержэрак».
10.10 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 «Салдаты 6». Серыял.
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
13.40, 23.05 Мюзікл «Бітлз. На дапамогу!»
15.25 «Вадзіць па-руску».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 Маст. фільм «Дрэнная мамачка».
22.10 Дакументальны спецпраект «Ежа будучыні».
0.35 «Дакументальны праект»: «Амазонкі Старажытнай Русі», «Грыбныя прышэльцы».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
8.35 «Ведаем рускую».
9.30 «Нітка да ніткі».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Чаму я?»
10.45 Серыял «Цёмныя воды».
14.10 Маст. фільм «Прынцэса спецый».
16.15, 22.00 Серыял «Аляксандраўскі сад 2».
21.00 «Разам».
22.55 Серыял «Паляванне на Берыю».
1.00 Маст. фільм «Догвіль».

4.00 Маст. фільм «Вытанчаная эпоха».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.35 Маст. фільм «Зязюля».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 М/ф.
14.15 «Расія. Геній месца».
15.10 «Ха». Маленькія камедыі.
15.50 Яўген Петрасян — «Усмешка даўжынёю ў жыццё». Да 70-годдзя артыста.
18.00 «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
22.30 Маст. фільм «Шэпт».
0.20 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 8.20 Дэтэктыў «Адвакат».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.55 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Ядзім дома».
10.25 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 «Паедзем, паедзем!»
14.05 «Следства вядуць...»
15.00, 16.20 Серыял «Час Волкава».
18.00 «Акцэнты тыдня».
18.55 «Кропка».
19.45 Серыял «Мянтоўскія войны».
23.10 «Прапаганда». Інфармацыйнае шоу.
23.40 «Анёлы і дэманы. Чыста крамлёўскае забойства».

8 КАНАЛ

9.00, 14.45, 19.00, 23.30 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 14.50, 16.10, 20.55 «Хатняя крама».
10.45 Драма «Доктар Жывага».
15.00 М/ф.
16.40 Серыял «Каломба».
18.00 «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
19.05 Драма «Рабыня кахання».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Меладрама «Зайздрасць багоў».

ВТВ

6.00 «Хатняя кухня».
6.30 «Вялікая маленькая зорка».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
7.45 М/ф «Маша і мядзведзь».
8.00 «Ералаш».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 1.00 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Апошні з Магікян».
13.30 «Паспець за 24 гадзіны».
14.30 «Жанатыя з першага погляду».
15.30 «Дзікія гульні».
16.30, 22.30, 4.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
17.00 Камедыя «ALL INCLUSIVE, або Усё ўключана».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Камедыя «Усё ўключана 2».
23.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Кіно ў дэталях».
3.30 «Лаві момант».
4.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
5.00 Серыял «Свацці».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.30 «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм.
12.15 «Легенды сусветнага кіно». Сяргей Эйзенштэйн.
12.45 «Расія, любоў мая!» «Традыцыі мансі».
13.15 «Каралавы рыф. Дзіўныя падводныя светы». Дак. фільм.
14.05 «Што рабіць?» Праграма В. Траццякова.
14.50, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
15.05 Геніі і злодзеі. Сяргей Клычкоў.
15.35 «Захоп улады Людовікам XIV». Маст. фільм.
17.05 «Пешшу...» Масква Высоцкага.
17.35, 1.55 «Шукальнікі». «Сакрэтная місія архітэктара Шчусева».
18.25 Джозэф Калея, Крысціна Апалайс у гала-канцэрце «Італьянская ноч» у Мюнхене.
19.55 Да юбілею кінастудыі імя М. Горкага. «100 гадоў пасля дзяцінства».
20.10 «Верце мне, людзі». Маст. фільм.
22.00 Паслухайце!.. «Залаты век рускай паэзіі».
23.30 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». «Таска». Опера Джакама Пучыні. Пастаноўка тэатра «Ковент-Гардэн».
1.50 «Дождж зверху ўніз». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1984. Аляксандр Разенбаум.
7.00, 9.40, 11.00, 12.55, 14.30, 17.25, 18.40, 20.35, 21.40, 23.20, 0.55, 2.25, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.15 «4:0 на карысць Танечкі». Маст. фільм
8.45, 2.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
13.20, 19.20 Юбілейны канцэрт групы «Зямляне».
15.00 «Быў час». 2008 год.
16.00 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам».
18.00 «Акулы пяра». Аліка Смехава . 1996 год.
22.00 Маст. фільм «Ар-хі-меды!».
0.00 «Сняем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
1.20 Маст. фільм «Іншаземка».
4.00 «Народжаныя ў СССР».

EUROSPORT

5.00 Баявыя майстэрствы. Суперкомбат. Сусветная серыя Гран-пры. Фінал.
7.00 Бокс.
8.15, 13.00, 19.00 Футбол. Кубак свету. (U-17.)
10.30 «Яго Вялікасць футбол».
11.00, 14.00, 17.45 Снукер. Еўратур.
16.00, 17.40 «Перавага коней».
16.05 Конны спорт. Кубак свету.
17.30 «Час скачак».
21.00 Снукер. Еўратур. Фінал.
23.00, 3.00 Футбол. MLS. Плэй-оф.
1.00 Футбол. Кубак свету. (U-17.) Чылі. Фінал.

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.55, 3.00 Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
7.00 Камедыя «М+Ж».
8.25 Камедыя «12 калядных жаданняў».
10.50 Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
12.25 Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
14.00 Меладрама «Дзённік кар'ерысткі».
15.35, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Парыж любой цаной».
17.35, 22.00 Серыял «Татуля».
18.40 Камедыя «Вострай Нім».
20.20 Камедыя «Supernянь».

23.10 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
1.10 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».
4.00 Камедыя «І не чырванее».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.25 «Дачныя гісторыі».
9.50, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
10.45 «Паненка і кулінар».
11.20, 0.55 «Каменская». Серыял.
14.45 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.05 Меладрама «Скрыня Пандоры».
19.25 «Без падману».
20.10 Трылер «Адрачэнцы».
22.55 «Асцярожна, махляры!»
23.25 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
03.55 «Жывеш толькі двойчы». Дак. фільм.

ТБ1000

6.10 Камедыя «Вядзьмарка».
8.10 Драма «Змоўшчыца».
10.20 Фантастыка «Чорная дзірка».
12.20 Драма «Бабёр».
14.00 Меладрама «Справа ў табе».
15.35, 2.25 Фэнтэзі «Гары Потэр і тайны пакой».
18.20 Камедыя «Як украсці дыямент».
20.00 Драма «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
22.00 Драма «Штосьці не так з Кевінам».
23.55 Трылер «Палонніцы».
5.05 Меладрама «Да цуду».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Баявік «Сіндром шахматыста».
10.10 Казка «Пасля дожджыку ў чацвер».
11.35 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
13.10 Трагікамедыя «Яно».
15.20 М/ф «Смяшарыкі. Пачатак».
17.00 «Тайна чатырох прынцэс».
18.40 Драма «Каляфутбола».
20.20 Драма «Чэмпіёны».
22.00 Баявік «Дзень Д».
23.30 Трылер «Стальны матылёк».
1.15 Драма «Іншае неба».
2.40 Драма «Гідраўліка».
4.20 Драма «Анёлы вайны».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Непаражальныя канструкцыі.
6.50, 7.40 Папулярная навука.
7.15, 8.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Зрабі або памры.
9.20 Дзікая прырода Амерыкі.
10.10 Голая навука.
11.00, 20.10, 23.30, 3.40 Навука будучыні.
11.50 Космас. Прастора і час.
12.35 Наступнае мегацунамі.
13.30 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
14.20 Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
15.20 Самыя дзіўныя ў свеце акулы.
16.25 Тайвань: востраў рыбы.
16.50 Гонка да Паўднёвага полюса.
17.40 Сучасныя расследаванні.
18.30 Чалавек супраць YouTube.
21.00, 1.10, 4.30 Прарыў. Барацьба з пандэміямі.
21.50, 2.00, 5.15 Эвакуацыя Зямлі.
22.40, 2.50 Праўда пра зомбі.

DISCOVERY

8.00 Склады.
8.50, 21.00, 4.00 Голыя і напалоханыя.
10.40, 17.05, 5.35 Падарожжа ў невядомасць.
11.35 Як уладкаваны Сусвет.
12.30 Космас навыварат.
13.25, 4.50 Цуды Сусвету.
14.20, 22.00 Злыя геніі.
14.45, 22.30 Навука магіі.
15.15 Разбуральнікі легенд.
16.10 Трой.
20.00, 2.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
20.30 Чуйскі тракт.
23.00 Прыроджаныя каралі.
1.00, 3.00 Хуткія і гучныя.

ХОСПІС — ГЭТА ПРА ЖЫЦЦЁ...

Валанцёры зрабілі для хворых такія лялькі-абярэгі. Яны для тых, каму пастаянна неабходны спагада і падтрымка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...Рана сышлі бацькі, якія мелі патрэбу ў тваёй прысутнасці, а ты так часта быў заняты... Толькі цяпер, калі іх ужо не стала, я пачынаю разумець, што было галоўным у той момант, што другасным. Таму работа ў хоспісе — гэта ў нейкай ступені патрэба аддаць тое, што не дадала сваім бацькам. Магчыма, гэта гучыць некалькі эгаістычна, але гэта так.

Вольга Віктараўна прызналася, што калі будзе стаяць перад выбарам узяць на працу добрага спецыяліста ці добрага чалавека, не раздумваючы, аддасць перавагу апошняму.

— Наша задача не толькі аблегчыць фізічны боль, але і зрабіць так, каб пацыент адчуваў сябе камфортна духоўна і псіхалагічна. Таму без душэўнай цеплыні ў паліятыўнай медыцыне — ніяк. А ёй, не сакрэт, немагчыма навучыць: яна альбо ёсць, альбо не. З кожным годам пераконваюся, што ў хоспіс найчасцей супрацоўнікаў і дабрадзеяў (я не люблю іншамоўнае слова «валанцёр») Гасподзь прыводзіць сам. Гэта ў большасці выпадкаў людзі, якія перажылі страту, боль, якія ведаюць, што і ў якую хвіліну трэба сказаць пацыенту і яго блізкім. Часта прысутнасць чалавека, які мае жыццёвы вопыт, дзейнічае лепш, чым таблетка... Праўда, апошнім часам такое адчуванне, што чалавечая цеплыня ўступіла ў эру збяражэння, такія якасці, як духоўнасць і міласэрнасць, прытупляюцца. Людзі развучыліся аддаваць, дзяліцца... Таму сказаць, што сёння ў нас на кожны выпадак ёсць дабрадзей, пакуль нельга.

«Хочацца, каб людзі прыходзілі да гэтага не такой цаной»

Па дарозе ў бальніцу паліятыўнага догляду мы з фатографам сустрэлі валанцёра Ігара Боскіна:

— Так склалася, што мой тата апошнія тры тыдні жыцця знаходзіўся ў гэтым хоспісе. Вось ужо пяць гадоў, як яго няма з намі. І ўвесь гэты час я сюды прыязджаю, стараюся быць карысным. У асноўным дапамагаю з камп'ютарамі, бо я праграміст па адукацыі. Па шчырасці, заходзіць у палаты да пацыентаў мне дагэтуль цяжка. Але, калі трэба, не адмаўляю. Разумею, што многім падапечным хоспіса патрэбна выгаварыцца. Таму мая задача — проста ўважліва слухаць. Слухаць чужыя страхі, а не свае. Найчасцей жа за ўсё мы слухаем сябе... Толькі калі таты не стала, мы з сястрой зразумелі, што маці вельмі патрэбна наша ўвага: стараемся праводзіць як мага больш часу разам, берагчы яе. Хочацца, каб людзі прыходзілі да гэтага разумення не такой цаной.

Валанцёра Ігара Боскіна можна сустрэць на вуліцы, калі ён спяшаецца па справах хоспіса на сваім складным ровары.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Сярод нашых валанцёраў — абсалютна розныя людзі, — уступае ў размову псіхолаг Юлія Прымак. — Ёсць тыя, якія страцілі тут блізкіх, як Ігар Міхайлавіч. Часам дапамагаюць і больш моцныя анкапацыенты, якія самі перанеслі не адну аперацыю. У прыватнасці, раз на тыдзень да нас у стацыянар прыходзіць жанчына 38-га года нараджэння. Яна прыносіць апельсіны, яблыкі. Прычым просіць, каб ёй падбіралі адзінокіх падапечных, якіх ніхто не праведвае. Даглядае іх, размаўляе, корміць. Яе дачка не хацела, каб мама хадзіла ў хоспіс. Маўляў, лепш бы даглядала ўнукаў, займалася сабой. Але валанцёрка кажа: «У мяне ёсць такая ўнутраная патрэба, ды і сілы адчуваю ў сабе».

Сярод пастаянных дабрадзеяў ёсць і прыхаджане праваслаўнага храма. Напрыклад, два глыбока веруючыя мужчыны — Уладзімір і Аляксандр — двойчы на тыдзень наведваюць нашых падапечных дома. У прыватнасці, яны дапамагаюць пажылой маці занесці ў ванну і памыць цяжкахворага дарослага сына.

Маладая валанцёрка Вераніка вельмі моцна прывязалася да адзінокай пацыенткі (апошняя пахавала мужа і сына). Паабяцала ёй, што пасля выпіскі будзе клапаціцца пра яе. Але тая пацыентка так і не вярнулася дадому... Яе павінны былі пахаваць у агульнай магіле. Але Вераніка, як чалавек веруючы, сказала, што не можа гэтага дапусціць. Сабрала ўсе неабходныя дакументы, запрасіла бацюшку на адпяванне і годна праводзіла яе ў апошні шлях. Пасля прызналася, што гэта было першае пахаванне ў яе жыцці...

Яшчэ адну нашу падапечную дома даглядае маці. Жанчына нічога не бачыць, таму папрасіла, каб да яе прыходзіў нехта з валанцёраў і чытаў Евангелле, Біблію, духоўную літаратуру. Мы знайшлі веруючую дзяўчыну Надзю. Яна ўжо каля года праведвае пацыентку. Не так даўно тая пачала пісаць апавяданні, казкі для дзяцей. Дакладней, Надзя друкуе на камп'ютары ўсё, што надыктоўвае падапечная.

— Калі пацыента нельга вылечыць, гэта не значыць, што для яго нічога нельга зрабіць, — дадае Вольга Віктараўна. — Тое, што падаецца дробяззю здароваму чалавеку, для невылечна хворага мае велізарны сэнс. Для такіх людзей увага, добрае слова, усмешка ці такія, на першы погляд, элементарныя рэчы, як паштоўка ці ліст, даражэйшыя за любыя грошы. Пераацэнка каштоўнасцей адбываецца. Пачынаюць заўважаць тое, што раней не заўважалі. Адзін наш пацыент, напрыклад, толькі напрыканцы жыцця ўпершыню ўбачыў, што ў жонкі блакітныя вочы. Ведаеце, нашы падапечныя асаблівыя, я сама нават часам здзіўляюся, наколькі тонка яны ўсё адчуваюць. Ты толькі паглядзеў, а яны ўжо ведаюць, які ты, сапраўдны ўрач ці не. «А як вы вызначылі?» — пытаюся. «Па вачах».

— Не сакрэт, што анкалогія — гэта бяда не толькі канкрэтнага чалавека, але і выпрабаванне для ўсёй яго сям'і. Што можна параіць сваякам такіх пацыентаў, як сябе паводзіць?

— Любіць яго, — кажа Вольга Віктараўна. — І быць шчырым да апошняй ніткі. Але пры гэтым разумець, што праўду часам трэба гаварыць дазавана. Мы не ў сілах вылечыць невылечнае захворванне, але можам павысіць якасць жыцця пацыента. А яна наўпрост залежыць ад колькасці страху, які яго напаўняе. Чым вышэйшы страх, тым ніжэйшая якасць жыцця. Гэты страх скажае рэчаіснасць, адносіны...

— Мы заўсёды раім ісці ад жадання самога пацыента, — падхоплівае Юлія Прымак. — Не хоча ён гаварыць пра сваю хваробу, не трэба. Ён мае поўнае права ўзяць тайм-аўт, каб прыстасавацца да новай сітуацыі. Калі зрывае злосць на тых жа сваяках (здараецца і такое), дазволіць гэта рабіць. Трэба зразумець, што гаворыць не сам чалавек, а яго хвароба. Няхай лепш агрэсія выходзіць на таго, хто побач — вы справіцеся з ёй. Бо калі яна накіравана ўнутр, то гэта значна горшае: могуць узнікнуць думкі аб самагубстве.

— Справа ў тым, што ў сям'і, дзе ёсць анкахворы, пасля яго сыходу рызыка развіцця аналагічнага захворвання ў сваякоў большая, — працягвае Вольга Мычко. — Так званая анкалагічная дамінанта — стрэс, напружанне. Мы стараемся дапамагчы разарваць гэтае заганнае кола.

Ёсць у адным з пакояў невялікая бажніца, сюды са сваёй малітвай можа прыйсці кожны.

— Штогод праводзім вечары памяці, на якія запрашаем сваякоў сваіх былых падапечных, — распавядае Юлія Іванаўна. — У адных — страх, у другіх — пачуццё віны, нешта не адпускае. І псіхолагі, і святар спрабуюць дапамагчы гэтым людзям. З веруючымі прасцей размаўляць. Яны разумеюць, што на ўсё воля Божая і што чалавек жыве, пакуль пра яго памятаюць. Нядаўна муж нашай былой пацыенткі (так склаўся лёс, што сястра міласэрнасці Свята-Елізавецінскага манастыра, якая дапамагала анкахворым, захварэла сама) прынёс фільм, які зняў пра Ларысу Васільеўну пасля яе сыходу. Уладзімір Іванавіч быў на вечары памяці, доўга пра яе расказваў. Ён і кнігі Ларысіны ахвяраваў хоспісу — у яе была вялікая бібліятэка духоўнай літаратуры. Яны карыстаюцца папулярнасцю ў нашых падапечных.

«Усе мы госці на гэтай зямлі»

— Як у вас атрымліваецца, працуючы ў хоспісе, заставацца аптымістамі?

— А мы не проста аптымісты, мы — філосафы-аптымісты, — кажа Вольга Мычко. — Вельмі любім жыццё. Але пры гэтым разумеем, што ўсе мы на гэтай зямлі госці. Адзін са сланоў, на якім трымаецца паліятыўны падыход, — калі чалавек успрымае жыццё і смерць як натуральны працэс. Мы ўсе калінебудзь памром. Проста адзін раней, другі пазней. У кожнага свой тэрмін. Я не стамляюся паўтараць: хоспіс — гэта не пра смерць, хоспіс — гэта пра жыццё. Таму такім людзям, якія перажываюць чужы сыход, як свой, тут не месца. Калі ёсць жаданне дапамагаць, лепш рабіць гэта на адлегласці: сёння такіх магчымасцей мноства.

Толькі падумайце, колькі маладых і прыгожых людзей гіне пры трагічных абставінах, у аўтааварыях, пажарах. Перавага, як святары кажуць, нашых пацыентаў у тым, што ў іх ёсць час падрыхтавацца да сыходу ў плане духоўнага росту. Гэта тая магчымасць, калі ты можаш завяршыць усе свае хрысціянскія справы. Пабачыцца са сваякамі, для якіх праз мітусню не знаходзіўся час, папрасіць прабачэнне, напісаць завяшчанне. Хочацца, каб чалавек не толькі нараджаўся, але і сыходзіў з гэтага свету годна. Таму трэба жыць, а не дажываць. Бо, ведаеце, як па мне, дык няма нічога страшнейшага за духоўную смерць — адсутнасць усялякіх жаданняў.

Шчыра захапляюся анкапацыентамі, якія кардынальна змянілі лад жыцця. Спрабуюць напоўніць яго сэнсам. Як, напрыклад, маладая маці — псіхолаг па адукацыі. Яна пасля таго, як даведалася пра свой дыягназ, пачала праводзіць фотавыставы і трэнінгі для анкапацыентак. Такія людзі, замест таго, каб наракаць на лёс, Бога, растуць духоўна. Калі здараецца няшчасце, варта правільна ставіць пытанне: НЕ «чаму са мной так здарылася?», А «навошта?». У пацыентаў і іх сваякоў, калі іх пачынаеш арыентаваць на гэта, высыхаюць слёзы, людзі пачынаюць думаць, а не аплакваць сябе.

Разам з тым, я не перастаю верыць у цуды. Пацыенты, якім аднойчы быў пастаўлены дыягназ «рак», і 10, і 15 гадоў на маіх вачах жывуць. Ёсць такія і сярод нашых супрацоўнікаў і дабрадзеяў. Яны многія прыярытэты ў сваім жыцці пераставілі. Па-іншаму глядзяць на праблемы. Калі ты вылечыўся, значыць, цябе Гасподзь пакінуў для нечага на зямлі, значыць, ты яшчэ не гатовы, табе трэба паслужыць прыкладам для іншых.

З кожным годам анкалагічна хворых становіцца больш, але гэта зусім не значыць, што ў той жа прагрэсіі расце смяротнасць ад гэтага захворвання. Проста цяпер сталі лепш і больш дыягнаставаць, выяўляць рак на больш ранніх стадыях. Але па-ранейшаму шмат людзей, якія думаюць, што яны будуць жыць вечна, што бяда іх міне. Не сакрэт: чым раней мы пачынаем лячыць рак, тым нашмат верагоднейшае выздараўленне. Недарма ж існуць рэкамендацыі: кішэчнік трэба абследаваць пасля 40 гадоў, а пасля 45 рабіць мамаграфію. Медыкі ж не са столі прыдумалі гэтыя тэрміны. Не трэба чакаць, пакуль у цябе нешта забаліць. У цывілізаваным свеце столькі інфармацыі. Людзі, карыстайцеся!

— Адна жанчына, з якой я пазнаёмілася ў анкадыспансеры, расказвала: «Пасля таго, як сяброўка даведалася, што ў мяне выявілі рак кішэчніка, адразу ж пабегла на абследаванне. На шчасце, у яе не выявілі ніякіх пухлін...»

— Снарад упаў побач, называецца, — рэзюмуе Вольга Віктараўна. — Гэта класіка: пакуль не загрыміць, мужык не перахрысціцца. Дык давайце ж хрысціцца загадзя!

Надзея ДРЫЛА.
dryla@zviazda.by

Ад рэдакцыі: Сёння бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс» спаўняецца 10 гадоў. Ад душы зычым усім штатным супрацоўнікам, дабрадзеям і іх падапечным здароўя і духоўнага росту.

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

ХТО ЎСЁ Ж ТАКІ «РУЛІЦЬ»?

— Вам гарбаты ці кавы? — спыталі ў яе, як толькі яна пераступіла парог рэдакцыі.

— Гарбаты, — адказала. — Зялёнай.

«Ах, якая! Толькі паглядзіце на яе! А ты ўвогуле ўпэўнена, што тут ёсць зялёная гарбата?» — звярнулася я да яе ў сваіх думках, не надта ветлівых. Бо адкуль ім быць ветлівымі, калі такое дэманстратыўнае адчуванне ўласнай значнасці мне ніколі не здавалася прыстойным. Недалюбліваю я гэткіх фіфачак, якія лічаць, што свет кожнае імгненне самаствараецца наноў — у адпаведнасці з іх патрэбамі і жаданнямі. Я добра ведаю, што зялёнай гарбаты ў рэдакцыі няма. Скончылася. Якраз учора ўжылі апошні пакецік, а новай набыць не паспелі.

Толькі я так да яе «звярнулася», толькі паспрабавала зноў паглыбіцца ў свае справы (візіцёрка прыйшла не да мяне, і мне ўсё роўна, па якім пытанні), як пачула ўдакладненне, зробленае тым самым упэўненым тонам, якім прамаўлялася першая частка заказу.

— Зялёнай з язмінам, — сказала візіцёрка.

«Ты яшчэ колер кубка закажы, — зноў у думках прабурчэла я. — Пад лак на пазногцях».

Гэта я апісваю падзеі колькігадовай даўнасці, калі ў «маю» рэдакцыю прыходзілі не перспектыўныя пачаткоўцы-літаратары і іх калегі, літаратары-мэтры, а... модныя блогеры, аўтары шлягераў, «зоркі» ўсіх велічынь і такія вось жалезабетонныя «акулы маркетынгу». Стапудова, яна хацела стварыць уражанне. Паказаць сваю ўпэўненасць. Каб далей, што б яна ні сказала, яе слухалі ў тры вухі і падтаквалі. Вось жа вучаць іх недзе такому. А можа, і не вучаць. Хлопца, што заходзіў да мяне ўчора, дакладна «навучылі». Адчыняе дзверы — і адразу па-пісанаму... А гэтая — вытанчаная, з якой-ніякой пазіцыяй, нават калі апошняя дыктуе ёй выносіць штодзённа не смецце, а мозг.

Памятаю, я не магла не расказаць Яму пра гэты выпадак. Але адказ прымусіў задумацца: а як я стаўлюся да пытання выбару, нават калі размова ідзе пра такую дробязь, як кава ці гарбата? Ды ніяк! Гэта значыць, або адмаўляюся ад прапановы наогул, або раблю «ніякі» выбар: што вам, маўляў, прасцей згатаваць, тое і добра. Абы не нарабіць нікому клопату.

Але мой самааналіз, праходзячы праз татальную няўпэўненасць, пра фатальнае няўменне ні ў чым сабе не адмаўляць, праз далікатнасць, якая больш перашкаджае, чым спрыяе, упарта вырульвае да разважанняў зусім іншага кшталту.

Калі я іду на дзелавую сустрэчу, то я іду на дзелавую сустрэчу: выкласці прапановы, атрымаць меркаванні ў адказ, абгаварыць дэталі, прыняць рашэнне, акрэсліць тэрміны рэалізацыі. А калі мне пачнуць расказваць, як гарачы напой спрыяе змястоўнай і глыбокай размове, я засмяюся: вы яшчэ пахучыя свечкі запаліце! Тут міжволі ўзнікае пытанне: а хто менш упэўнены — той, хто далікатнічае, ці той, хто абавязкова і нават дэманстратыўна адмяжуе сябе «шчаслівым» кубкам і будзе ўскладаць адказнасць за вынік перамоў на тое, што ў гэты кубак наліта?

Сям'я, як я даўно ўжо ўцяміла, нічым не адрозніваецца ад той ці іншай кампаніі, калектыву. Таварыства з адказнасцю! І тут, і там «руліць» зусім не мацнейшы (ці з больш высокай самапавагай), а... той, хто гатуе гарбату і каву!

Наша візіцёрка, як памятаю, без ніякіх каментарыяў з боку сакратаркі атрымала не тое, што заказвала, а тое, што было ў наяўнасці

■

■ Наматай на локан

У СТРАХА ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ,

або Няўжо мы такія баязліўкі?

Цяжка знайсці жанчыну, якая нічога не баіцца. Страхі суправаджаюць нас усё жыццё, незалежна ад узросту і сацыяльнага становішча. Адны страхі прыходзяць і знікаюць, іншыя затрымліваюцца надоўга, заганяючы ў ступар і пазбаўляючы спакою. Праўда, калі не ўлічваць крайнасці, калі сітуацыя патрабуе медыцынскага ўмяшання, то жаночыя страхі па сутнасці сваёй з'яўляюцца звычайным хваляваннем, уласцівым абсалютна ўсім жывым істотам. Што ж нас трывожыць і як з гэтым змагацца?

«А калі замуж не выйду...»

Сяброўкі адна за адной выходзяць замуж. Сваякі пастаянна цікавяцца, калі ж вы паклічаце іх на вяселле. Бацькі кажуць: «Мы пазнаёмім цябе з жаніхом. Будзь вясёлай, надзень адкрытую сукенку, зрабі прычоску...». Вас хочуць «выгадна» прадаць, і вы не супраць...

Вы вельмі-вельмі стараецеся прадацца. Спачатку выгадна, потым ужо як-небудзь... Зазіраеце ў вочы патэнцыяльнаму пакупніку, слухаеце яго, раскрыўшы рот, печаце яму смачныя пірагі — шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік... На вас немагчыма глядзець без жалю. Паверце, такі тавар выглядае ляжалым, яго ніхто не спяшаецца купляць. Усё гэта надта падобна на распродаж. А слова «распродаж», такое прывабнае для жанчын, вельмі адпужвае мужчын. Жанчына лёгка купіць на распродажы дзве непатрэбныя ёй блузкі толькі таму, што яны каштуюць танней, чым звычайна, а мужчына ўдвая пераплаціць за рэч, якая яму сапраўды патрэбна. Задумайцеся над гэтым...

«Я зацяжарала?!»

У пытаннях, што датычацца мацярынства, жанчыны, здаецца, баяцца ўсяго адразу. Баяцца незапланаванай цяжарнасці, баяцца не зацяжарыць увогуле, а калі гэта ўжо здарылася, то баяцца расказваць пра сваё «становішча» сябрам і знаёмым (каб не сурочылі). Баяцца падчас цяжарнасці сваіх новых адчуванняў, баяцца пакутлівых родаў і патаўсцець пасля іх, баяцца першы час клапаціцца пра немаўля, а калі яно падрастае, пачынаюць баяцца за яго яшчэ больш і ў выніку гадуюць «цяплічную расліну», якой не дазваляецца бегаць і скакаць... Здаецца, мацярынства нясе ў сабе адны толькі страхі: нараджаць дзяцей балюча і страшна, а выхоўваць яшчэ страшней, бо вакол адны небяспекі: гузы, збітыя каленкі, «двойкі» ў школе, бойкі, дрэнныя кампаніі... І ўсё ж гэта натуральны працэс. Жанчыны нараджалі, нараджаюць і будуць нараджаць. І ў гэтым працэсе значна больш станоўчых эмоцый, чым страхаў і асцярог.

«Чым старэць — лепш памерці!»

З'яўленне першай маршчынкі або адзінай сівой валасінкі ў жыцці многіх жанчын адзначаецца тыднёвай дэпрэсіяй. А пасля 35 кожны дзень нараджэння ўспрымаецца як плявок лёсу ў душу. Карціны адзінокай, беднай і нямоглай старасці, дзе нават і шклянку вады падаць няма каму, нярэдка ўзнікаюць ва ўяўленні большасці з нас. А ў такім узросце яшчэ і хваробы пачнуць адна за адной атакаваць, і якое ўжо тут можа быць кругасветнае падарожжа з... высокім ціскам і абвастрэннем артрыту. Так, такая перспектыва здольная ўсяліць страх у любога. Любога, хто не разумее, што прыгажосць не залежыць ад узросту, шчасце прыходзіць не толькі да маладых, а трымаць сябе ў добрай фізічнай форме і сачыць за здароўем — не подзвіг, падуладны толькі абраным, а абавязковая праца для кожнага чалавека.

«Ой, не страціць бы!»

Страх страціць мужчыну грунтуецца на глыбінным унутраным перакананні, што жанчына без мужчыны — нуль без палачкі. Гэта значыць, мужчына перайшоў у разрад абсалютных каштоўнасцяў для жанчыны, часта ён нават больш каштоўны, чым яна сама.

Страх застацца адной — шкодная для здароўя рэч. Таму лепш дзейнічаць, чым сядзець і баяцца. Усвядомце, што вы (а не нейкі там мужчына) — цэнтр Сусвету. Мужчыны могуць мяняцца, вы застаяцеся. І лепш, чым з самой сабой, вам не будзе ні з кім і ні пры якіх абставінах.

Няма мужчыны — ідзіце ў клуб знаёмстваў, шукайце сябра ў інтэрнэце, прыгледзьцеся да калег... Ёсць мужчына? Тады ацаніце сітуацыю, адчуйце сэрцам, ці кахае ён вас. Пры гэтым любіце і ўдасканальвайце сябе, будзьце адкрытымі і цікавымі, тады адзінота вам дакладна не пагражае.

«Што пра мяне падумаюць?»

Гэтыя магічныя словы ўсяляюць страх у многіх з нас і прымушаюць рабіць непатрэбныя ўчынкі. Каб начальства не падумала пра нас дрэнна, мы працуем дапазна, выконваем не сваю працу і праглынаем любыя неапраўданыя нараканні ў наш бок. Па гэтай жа прычыне ўтойваем сакрэты асабістага жыцця ад сяброў і знаёмых і наогул не дазваляем сабе быць самімі сабой, а толькі тымі, каго хочуць бачыць у нас навакольныя. А раптам асудзіць хтосьці? Здаецца, што рэзкую крытыку наша далікатнае сэрца не перажыве. А варта правесці хоць бы раз эксперымент і зрабіць так, як хочацца нам, — і ўсё падасца не такім страшным. Ну асудзяць, і што? Пашчабечуць тыя, хто прывык малаціць языком; пазайздросцяць тыя, хто прывык зелянець ад зайздрасці; абурацца тыя, хто прывык, што ім заўсёды патураюць. У выйгрышы застаняцеся толькі вы самі, і паколькі выбераце свабоду жаданняў і дзеянняў, застаняцеся самой сабой.

«Я такая тоўстая!»

Яшчэ адзін тыповы жаночы страх — боязь папаўнець. Цікава, што яго адчуваюць не жанчыны, схільныя да паўнаты, а тыя, у каго няма пакуль праблем з лішняй вагой. Апошнія схільныя лічыць, што прычынай няўдач у асабістым жыцці з'яўляецца дрэнная фігура. Ім і ў галаву не прыходзіць, што гэта — вынік няўмення падтрымліваць адносіны з мужчынамі.

Не варта камплексаваць з прычыны занадта жаноцкіх формаў. У рэальным жыцці вельмі шмат абаяльных жанчын з пышнымі формамі, у якіх цудоўная сям'я. І нямала адзінокіх стройных прыгажунь. Проста трэба любіць сябе, сваё цела, весці правільны лад жыцця і прытрымлівацца здаровага харчавання. Толькі тады, калі вы знаходзіцеся ў міры сама з сабой, пара лішніх кілаграмаў не стануць прычынай псіхалагічнага дыскамфорту.

Так што, дамы, смела заказвайце першае і другое, а на закуску — дэсерт. І памятайце: магчымасць заплаціць за ваш абед або вячэру — узнагарода для мужчыны, падстава паказаць сваю значнасць.

«Баюся выглядаць недарэчна...»

Памятаеце, як у фільме «Дзённік Брыджыт Джонс» гераіня чырванела і хацела праваліцца скрозь зямлю, калі пад яе маленькай вячэрняй сукенкай былі «знойдзены» вялікія «бабуліны» трусы? Гэты эпізод запаў многім дзяўчатам у душу, бо кожная ведае, як страшна апынуцца ў такім непрывабным становішчы. Мы баімся праліць на сябе каву ў кавярні, упасці на слізкай падлозе, заснуць у метро, парваць калготкі... Карацей, існуе мноства сітуацый, у якіх мы можам выглядаць недарэчна. Але існуе і лякарства ад гэтага страху, і імя яму — смех! Не варта чакаць, пакуль хтосьці пасмяецца з вас. Добра ўмець самой пасмяяцца з сябе ў любой сітуацыі!

Вера ФЕМІНА

■

■ Гісторыі з канверта

ПІСЬМО... У СУСЕДНІ ПАКОЙ

Шлюб Алены і Сяргея Р., жыхароў аднаго з райцэнтраў, распаўся некалькі гадоў таму. Жывуць у адным доме, але ў розных пакоях. Адносіны сапсаваныя настолькі, што былыя муж і жонка не размаўляюць зусім. Гэта вельмі нязручна, калі людзі жывуць без нармальнага кантакту, бо трэба ж весці гаспадарку, абслугоўваць і рамантаваць дом, плаціць за камунальныя паслугі...

Прыкладна паўгода назад Сяргей, які нейкі час у поўным памеры плаціў за камунальныя паслугі (за газ, святло, ваду), накіраваў Алене пісьмо... у суседні пакой з патрабаваннем плаціць за паслугі на «агульных паях»: палову ён, палову — былая жонка. Напісаў пісьмо, паклаў у канверт, кінуў у паштовую скрыню, пасля чаго паштальён прынёс пісьмо назад — у гэты ж дом, толькі ў суседні пакой.

Але ў адказ — цішыня, Алена быццам не бачыла яго. Сяргей злаваўся, нервавaўся, але так і не змог выклікаць былую жонку на размову. Прайшоў месяц, другі, трэці... Урэшце, цярпенне лопнула, мужчына звярнуўся да адваката, заплаціў за яго кансультацыі больш за мільён рублёў. У хуткім часе Алена і Сяргей атрымалі позвы ў суд.

Пазіцыя Алены з пункту гледжання мужа і адваката выглядала пройгрышнай: калі яна не плаціць за камунальныя паслугі, хоць пражывае ў гэтым доме, то суд можа прымусіць яе кампенсаваць затраты мужа і нават аплаціць паслугі адваката. Але ў судзе жанчына з лёгкай усмешкай дастала з сумачкі квітанцыі, якія пацвярджалі, што ўсе гэтыя месяцы яна... таксама ў поўным памеры аплачвала камунальныя паслугі. Фактычна за адну і тую ж паслугу жыльцы дома плацілі двойчы, а адказныя службы ніяк не рэагавалі на гэтыя пераплаты.

У выніку суд не знайшоў у дзеяннях Алены ніякага «крыміналу». Крыху збянтэжаны былы муж запатрабаваў, каб яму кампенсавалі судовыя затраты, але на якой падставе? Калі б іск быў задаволены — то няма пытанняў, але тут жанчына ні ў чым не вінаватая.

...Якая напрошваецца выснова? Ва ўмовах гендэрнай барацьбы някепскім «партнёрам» можа стаць... маўчанне — каб збянтэжыць, збіць з панталыку мужчыну. Сучаснай жанчыне не трэба спыняць імклівых коней або рвацца ў палаючую хату, каб даказаць сваю перавагу. Ёй дастаткова проста перастаць гаварыць.

Аляксандр ГОРБАЧ

■

■ Паміж намі

ЦІХАЯ НЯНАВІСЦЬ

Калі на горад апускаецца змрок, калі ў вокнах запальваюцца агні, калі апошнія прахожыя, нагружаныя пакетамі з прадуктамі, нецярпліва выскокваюць з аўтобусаў і трамваяў, спяшаючыся дадому, Ліля старанна ўхутвае сонную Веранічку і, моцна прыціскаючы да сябе каштоўную ношу, выходзіць з кватэры і асцярожна спускаецца на першы паверх... Лесвіца стромкая і, да таго ж, дрэнна асветленая. Унізе Лілю чакае выратавальная каляска, куды яна пакладзе дачку і выйдзе насустрач пранізліваму ветру, ці халоднаму дажджу, ці мокраму снегу, ці чаму-небудзь іншаму, абы не заставацца адной у абрыдлай кватэры, у чатырох сценах. У калясцы, акрамя Веранікі, ляжаць укручаная ў шарсцяную хустку «малочная» бутэлечка, цёплыя паўзункі на змену, сумка для прадуктаў і томік любімых вершаў, парадкам патрапаны і зашмальцаваны...

Рэдкія прахожыя — усе без выключэння — здзіўлена глядзяць ёй услед. Ліля нетаропка крочыць па знаёмай да дробязяў вуліцы, штурхаючы перад сабой каляску, уткнуўшыся ў кнігу, не заўважаючы нічога і нікога, толькі зрэдку прыслухоўваючыся да ціхага сапення, што даносіцца з калясачных нетраў... На гарадской вуліцы поўна ліхтароў, і, дзякуй Богу, можна чытаць, а дома яна проста звар'яцела б... Акуляры з'ехалі на кончык носа, шалік разматаўся, валасы выбіліся з-пад шапачкі... Але, акрамя Веранічкі і вершаў, яе не цікавіць нічога. Вонкавае добраўпарадкаванне свету падманлівае. Людзі, што спяшаюцца ў свае кватэры, нешчаслівыя ў пераважнай большасці.

Лілі — каля трыццаці. І яна ўжо не верыць у цуды і тым больш не разлічвае на іх. Некалі — невыпраўная аптымістка, завадатарка, цэнтр любой кампаніі... Цудоўнае пачуццё гумару, зайздросныя вынаходлівасць і кемлівасць, здольнасць да ўсіх без выключэння навук. І разам з тым — чароўны голас, таямнічая ўсмешка, бяздонныя вочы на паўтвару... Карацей, мужчыны падалі. «Цотныя — направа, няцотныя — налева», — жартавалі сяброўкі. «И грудь, и тело, и душа — со всех сторон ты хороша!» — гэта жартоўная эпіграма была змешчана моцнай паловай курса пад Ліліным фотаздымкам у віншавальнай сценгазеце з нагоды Міжнароднага жаночага дня.

Але, у адрозненне ад сваіх аднакурсніц, замуж Ліля не спяшалася. Уважліва перабіраючы шчыльныя шарэнгі сваіх паклоннікаў, не магла спыніцца ні на адным. І ўсё марыла. І дапазна «глытала» вершы, зачыніўшыся ў пустой інтэрнатаўскай «чыталцы». А недзе над галавой грымела развясёлая дыскатэка і марнелі ў чаканні шматлікія паклоннікі... «Хто?» — гэтае пытанне і пасля размеркавання заставалася нявырашаным. «Дзіўныя людзі, — казала яна пазней. — Яны думалі, што я чакаю прынца. А мне проста хацелася закахацца. Каб усё было прыгожа, як у гэтых кніжках...».

Хто можа зразумець загадкавую жаночую душу? Вядома ж, мужчына. Прычым вопытны. Душа Лілі па-ранейшаму заставалася занадта загадкавай і недаступнай для аднагодкаў, не вельмі дасведчаных у такім далікатным пытанні.

Андрэй быў старэйшы на цэлае жыццё. Яе жыццё. Ён паспеў пражыць два такія жыцці і ведаў, што трэба рабіць, каб падабацца жанчынам. А спіс яго шматлікіх станоўчых якасцяў відавочна ўпрыгожвала наяўнасць двухпакаёвай кватэры ў цэнтры горада.

Андрэй, ці Андрэй Барысавіч (што больш адпавядала рэчаіснасці), быў трэнерам па плаванні, дастаткова вядомым у сваім асяродку. Лілю плаванне ніколі не цікавіла, але, заўважыўшы аднойчы, што яе прывабныя акругласці ператвараюцца ў мілую паўнату, яна запісалася «ў басейн».

«Чем меньше женщину мы любим, тем легче нравимся мы ей», — сказаў у пачатку пазамінулага стагоддзя класік. Менавіта гэтым прынцыпам кіраваўся спачатку Андрэй Барысавіч, калі заўважыў недвухсэнсоўныя позіркі адной са сваіх падапечных. І ўжо ў хуткім часе стаў першым «сапраўдным мужчынам» у яе жыцці. У адзін цудоўны дзень Ліля склала ў дарожную сумку свае кофтачкі і джынсы і пераехала з інтэрната ў добра вядомую ёй двухпакаёўку.

Пачалося сямейнае жыццё. Неафіцыйнае, зразумела, але ад гэтага не менш цікавае і бесклапотнае. Кожныя выхадныя — выезд з Андрэем і кампаніяй яго сяброў-спартсменаў за горад, з палаткамі і спальнымі мяшкамі, з вогнішчам, з песнямі пад гітару і задушэўнымі размовамі... Начныя купанні, зачараваныя позіркі і камплімenты іншых мужчын толькі «падагравалі» пачуцці Андрэя. Ліліна маладосць і прыгажосць песцілі мужчынскае самалюбства. Дома цяпер заўсёды былі чысціня і парадак. Спартыўныя касцюмы і іншыя рэчы не валяліся дзе папала, а роўненька віселі на плечыках і ляжалі на палічках. Брудны посуд не збіраўся ў ракавіне. Некуды знік пыл з паліраванай мэблі... Па вечарах, расправіўшыся з вячэрай і кухоннымі справамі, яны садзіліся разам перад тэлевізарам або гарталі яго сямейныя альбомы з фотаздымкамі. Андрэй з мамай падчас школьнага свята, Андрэй з бацькамі адпачывае ў Батумі, Андрэй з былой жонкай і дачкой Ірынай, Андрэй на вяселлі Ірыны, Ірына з мужам і маленькім сынам... «Дарэчы, — нечакана падхопліваўся Андрэй Барысавіч, — пасля вячэры ў нас застаўся кавалак сыру, ты схавала яго ў халадзільнік? Дакладна схавала? Ідзі правер, калі ласка. Шкада будзе, калі сапсуецца...»

Перад прыходам гасцей ён асабіста рабіў абход кватэры і правяраў сервіроўку стала. Потым выклікаў Лілю на кухню і падрабязна тлумачыў: вось гэты нож — для сыру, гэты — для рыбы, глядзі не пераблытай... Ліля ўважліва выслухоўвала і бегла пераадзявацца, каб паспець да прыходу гасцей. «Ну што ты там корпаешся?» — Андрэй заходзіў у пакой, крытычна аглядаў з ног да галавы юную спадарожніцу жыцця, рэзюмаваў: «У кароткай спадніцы табе будзе нязручна падаваць на стол». «А я нічога падаваць не збіраюся — мы паставім усё адразу і будзем весяліцца», — бесклапотна адказвала яна, разумеючы па твары Андрэя Барысавіча, што чуць гэта яму непрыемна. Ліля ніколі не задавала пытанняў пра тое, колькі жанчын перабыло ў гэтай кватэры да яе. Здагадвалася, што шмат. Яны былі ўпэўненыя ў сабе і ў сваёй прыгажосці, яны ведалі, што і ў які момант сказаць. Яны прыходзілі з патаемным жаданнем затрымацца ў гэтых пакоях, марылі прасаваць яго кашулі і карміць сняданкам — і што? І нічога. А яна вось затрымалася.

Іх шлюб стаў вынікам не яго кахання, а яе цяжарнасці. Пасля нараджэння Веранічкі Ліля цалкам завязла ў хатніх клопатах. Андрэй Барысавіч узяў дадатковыя «гадзіны», знайшоў працу па сумяшчальніцтве і як бы... самаліквідаваўся — выключыўся з іх сумеснага жыцця. Дадому вяртаўся гадзін у адзінаццаць вечара. Спаць ішоў у іншы пакой, шчыльна зачыняючы за сабой дзверы — не мог выносіць дзіцячага плачу. Па магазінах, аптэках і паліклініках Ліля хадзіла сама, страціўшы ўсякую надзею на дапамогу мужа. У Андрэя выявілася моцная схільнасць да бераглівасці, ён пачаў скрупулёзна падлічваць даходы і выдаткі і ў выніку «абрэзаў» расходы на не самыя патрэбныя, на яго погляд, рэчы (напрыклад, паходы ў кіно і тэатр). Перад паездкамі ў замежныя камандзіроўкі ён заўсёды папярэджваў Лілю: я табе адтуль нічога не прывязу... Вярнуўшыся, знаходзіў шэраг усялякіх недаробак і хібаў, дапушчаных маладой жонкай падчас самастойнага вядзення хатняй гаспадаркі: не так палітыя і не тым бокам павернутыя кветкі ў вазонах, няправільна складзеныя паўзункі і пялёнкі ў шафе, недастаткова свежая заварка ў чайніку, неідэальна чыстыя дзверкі ў халадзільніку — усё выклікала раздражненне. І Ліля раптам пачала разумець. І таксама заўважаць у «ідэальнага» любага такія-сякія недахопы. А тут яшчэ патэлефанавала прыяцелька з пытаннем: чаму, маўляў, не паехала з мужам у суботу на «уік-энд» за горад? Цудоўна бавілі час! Андрэй быў проста беспадобны...

«Так-так, я ведаю, але ў мяне з'явіліся тэрміновыя справы», — апраўдвалася Ліля, успамінаючы, што сваю адсутнасць у памянёную суботу муж патлумачыў нечаканай пазапланавай нагрузкай...

...Ці доўгі шлях ад любові да нянавісці? Калі прыгадаць вядомае выказванне — адзін крок. Ён можа быць большым, можа быць меншым, але... Зрабіўшы яго, ужо вельмі цяжка, практычна немагчыма вярнуцца назад.

Так і жывём, баючыся страціць тое, што маем, — нават калі маем адны ілюзіі. Так у жыццё паступова ўваходзіць нянавісць — ціхая-ціхая...

Ала БЫВАЛАВА.

■

■ Быць жанчынай

ТВАЁ НАЙЛЕПШАЕ АДЗЕННЕ,

або Навошта мазацца глінай і насіць спадніцы?

Хатнія клопаты, сям'я, праца... У гэтай віхуры мы — хто заўгодна: мамы, работніцы, начальніцы, гаспадыні... Але выконваючы ўсе гэтыя ролі, часам забываемся на сваю сутнасць, аддаляемся ад сваёй прыроды, перастаём рабіць тое важнае, для чаго прызначаны, — ствараць любоў і гармонію навокал. Што для гэтага трэба? Пра гэта — па запрашэнні Мінскага гарадскога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў — прадстаўніцам прыгожага полу, якія кіруюць буйнымі сталічнымі калектывамі, расказала інструктар па антыўзроставай ёзе, астролаг і эксперт моды Таццяна ЦЕРАШКОВІЧ.

Самае галоўнае ў жыцці — любіць сябе, любіць іншых і любіць жыццё. На жаль, самым важным рэчам не вучаць у школах, у інстытутах. Напрыклад, як захоўваць сваё здароўе? Як выяўляць свае таленты і здольнасці і іх рэалізоўваць? Не вучаць узаемаадносінам паміж людзьмі і таму, як знешні выгляд уплывае на энергетыку цела, на здароўе, на кар'еру.

Рэкамендую такі метад: купляеце касметычную гліну (яна прадаецца ў аптэках, каштуе нядорага — ад 10 тысяч), разводзіце яе альбо талай вадой, альбо дыстыляванай, альбо мінеральнай, альбо сухім віном, альбо — у амаладжальным варыянце — кавуновым сокам да кансістэнцыі смятаны. І гэтай «смятанкай» змазваеце ўсё цела. Ходзіце па кватэры, пакуль гэта ўсё на вас не высахне да скарынкі. Пасля змываеце і яшчэ паўгадзіны ляжыце ў ванне. Чым гэта добра: па-першае, гліна, якую вы пасля спусціце ў каналізацыю разам з вадой, упітвае ўсю адмоўную энергетыку, што вы назапасілі. Па-другое, яна вельмі насычаная мінераламі і мікраэлементамі і вельмі добра аднаўляе і сілы, і скуру.

Па тым, як чалавек апрануты, можна «намаляваць» яго псіхалагічны партрэт. Вы самі, апранаючыся (тым ці іншым чынам. — **Аўт.**), не заўважаеце, як расказваеце пра сябе людзям больш, чым хацелі б.

Што мяне здзіўляе на нашых вуліцах: як правіла, жанчыны, якія сябе не любяць і лічаць, што ў іх знешнасці ёсць нейкія праблемы, апранаюцца так, каб тое, што ім не падабаецца, яшчэ больш падкрэсліць.

Паказчыкам добрага густу стала ўменне ў адным вобразе спалучаць зусім розныя рэчы. Быць з галавы да ног у адным стылі, колеры, аксесуарах ужо некалькі гадоў лічыцца не модным. Моднымі сталі складаныя колеры.

Тыя, хто любіць насіць чорнае, майце на ўвазе: гэты колер уцягвае не толькі ўвесь спектр вясёлкі, але і іншыя электрамагнітныя хвалі. Усё, што пра вас сказалі ці падумалі дрэнната, альбо калі побач нехта вылаяўся — ваша чорнае адзенне «ўсмокча», і вы будзеце «насіць» яго на сабе. Калі ж вы ідзяце на добры фільм, на канцэрт, збіраецеся сустракацца з людзьмі, якія вас любяць, радуюць, то чорнае адзенне — тое, што трэба, бо ўсю станоўчую энергетыку вы «ўбераце».

Пастаяннае знаходжанне ў штанах цягам месяца зніжае энергетыку прыкладна на год. Жаночая энергетыка назапашваецца ў вобласці рэпрадуктыўных органаў. І калі вы гэтую энергію «заціскаеце» штанамі, яна па пазваночніку паднімаецца да галавы. На працы гэта нармальна, бо стымулююцца мысліцельныя працэсы. Але ва ўсіх астатніх выпадках трэба аддаваць перавагу спадніцам. Яны захоўваюць жаночую любоўную энергетыку.

Аксесуары ні ў якім разе не павінны супадаць па колеры з адзеннем і адно з адным! Чорныя туфлі і чорная сумачка — гэта ўжо не модна.

Апошні трэнд 2016 года: для тых, хто носіць жакеты з лацканамі, вельмі модна прышпільваць да іх 3 — 4 розныя брошкі. У мінулым сезоне былі моднымі кулоны. Зноў у модзе кліпсы, а не завушніцы. Дамам, якія хочуць выглядаць маладзейшымі, рэкамендую насіць кафы — канструкцыі, якія адзяваюцца на вушы. Ну і апошні аксесуар, які адрозніваецца ад мінулага года: летась насілі шалікі, цяпер модныя вялікія квадратныя хусткі — паўлаўскія з доўгімі махрамі, арэнбургскія, звычайныя ваўняныя.

99% таго, што вы бачыце на вуліцах горада, да моды не мае ніякага дачынення. Але нельга не прызнаць, што мода становіцца ўсё больш камерцыйнай і пераўтвараецца ў выцісканне грошай.

Самае прыгожае адзенне — гэта шчасце. Не здымайце яго ніколі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

seradzyuk@zviazda.by

■



МОЙ ДОМ

Са сцяны ў маім доме манатонна гучыць «цік-так, цік-так, цік-так»... Гэта гадзіннік шчыруе: нястомна адлічвае мінуты майго жыцця, складае ў гадзіны, дні і тыдні, у гады. Ужо багата іх прайшло ў гэтым доме, але ж гісторыя будаўніцтва па-ранейшаму ў памяці.

Пачалася яна са страшэннага ўрагану. Гэта цяпер мы іх бачым па тэлевізары і ўжо неяк прывыклі — ведаем, што яны здараюцца. А тады...

Жудасная была карціна! Чорна-бурае неба амаль без перапынку паласавалі маланкі, не сціхаў гром, то тут, то там білі перуны, а шквалісты вецер, здавалася, вось-вось сарве дах і па бярвенцы разнясе нашу хатку.

Толькі так падумалі — нешта і напраўду стала трашчаць. «Хаваймася, дачушка!» — загадала мама, яшчэ больш збялеўшы ад страху, і пацягнула мяне ў падвал.

Мы спусціліся пад падлогу, але паратунку не знайшлі, бо нам на галовы амаль адразу ж палілася вада. «Страхуʹ, відаць, знесла», — прызнала мама, выціраючы твар ці то ад слёз, ці то ад дажджу. І мы з ёй кінуліся наверх, назад, сталі шукаць у хаце хоць нейкае сухое месца і знайсці не маглі, пакуль...

На покуці стаяў вялікі самаробны стол. Мы з мамай забіліся пад яго і, мусіць, з гадзіну прасядзелі там, прытуліўшыся адна да адной. На вуліцу выйшлі потым, калі крыху пацішэла і пачало днець.

А выйшлі — і нічога вакол не пазналі: усе садовыя дрэвы ляжалі на зямлі ўгору карэннем, пад нагамі валяліся паламаныя латы і кроквы, кавалкі гонты ды цэгла ад разбуранага коміна...

Да нас тут жа сталі падыходзіць такія ж спалоханыя суседзі: сталі суцяшаць маю маму, сталі расказваць пра свае беды, бо нехта застаўся без хлява, нехта — без гумна, паветкі, без вокнаў у хаце (чалавечых ахвяр, дзякуй Богу, не было). Паблізу, нібы зжаты, ляжаў Парахоньскі лес...

Але ж праўду кажуць, што бяда адна не ходзіць: яна альбо новыя водзіць, альбо чаргуецца з радасцю. У тую ж раніцу пасля ўрагану з арміі ў адпачынак прыйшоў мой брат Коля, а праз два дні па даросе ў санаторый зазірнуў яшчэ адзін — Міша. Удвух яны, як маглі, падладзілі нашу хату — нейкі час яна магла паслужыць. Больш за тое, неяк увечары Міша сказаў: «Мама, мы ў вялікім даўгу перад табой (бацька наш загінуў у 1944-м, і мама ўсіх пяцярых дзяцей падымала адна), так што настаў час аддзячыць... Я хачу пабудаваць табе новы дом у цэнтры вёскі (а жылі мы тады на хутары Засвяціца). Вось дагавор з міжкалгаснай будаўнічай арганізацыяй. Табе застаецца сачыць за ходам работ, а я іх буду аплачваць».

Радасць маміна была бязмежнай!

Мы самі выбралі месца. Туды — і адразу ж — завезлі матэрыялы (нават нейкага п'яніцу прыставілі, каб іх вартаваў!)...

Але ж так пабыло нядоўга. Хутка мы ўбачылі, што будуюць наш дом як мокрае гарыць: з такімі тэмпамі мы не толькі праз год, але і праз тры не заселімся. А грошы ж заплачаны... І, падобна, патрачаны...Ва ўсякім разе будаўнікі сталі патрабаваць ад брата новых і новых выплат — ужо звыш дагавора.

Доўжылася так, пакуль Міша не напісаў заяву ў самую высокую на той час інстанцыю — Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі.

Мы з мамай пра гэта ведалі, але ніякіх праверак, вядома ж, не чакалі: што ў нас правяраць? А таму...

Напярэдадні да матулі прыйшоў адзін з нашых хлопцаў. Сказаў: «Цётачка Саша, я жаніцца надумаў, вяселле спраўляць. Можа, выганіце літраў з 10 гарэлкі? Я вам усё прывязу: і мукі, і бульбы, і дражджэй. Вы толькі зрабіце!»

Ну дзе ж тут адмовіш чалавеку?! А тым больш з матуліным найдабрэйшым сэрцам! Згадзілася яна. І вось мы, што называецца, выконваем заказ: уладкавалі ўсё, пачулі, што пабег першачок... Як раптам улятае ў хату суседка і крычыць: «Саша, замыкай дзверы! Да цябе на «казле» нейкія начальнікі едуць. У мяне дарогу пыталіся, дык я іх у аб'езд адправіла, сказала, што тут забуксуюць».

Мама мне тут жа замок у рукі. Кажа: «Ідзі на двор, замкні сенцы. Мяне дома няма... І ты не ведаеш, ні дзе я, ні калі прыйду».

Я — з хаты. Ключ у замку кручу — рукі трасуцца. Думаю, добра, каб мама ў печцы агонь заліла...

А яна з вялікага перапуду яшчэ і нагой па чыгунах. Дым з коміна ўжо не ідзе, затое пах — ад цёплай брагі, ад свежай гарэлкі — на ўвесь хутар, можна сказаць!

І «госці» тут як тут: прынюхваюцца, распытваюць, дзе гаспадыня? А я ж «нічога не ведаю. І ключа ад хаты ў мяне няма».

Не дык не: двое, як быццам, гатовы з'язджаць. А вось трэці... Без гальштука, але ў модным тады балоневым плашчы падыходзіць да нашых дзвярэй, тузае замок, суне нос у шчыліну... А потым і наогул тварам прыліп да акна, штось убачыў у хаце і давай адгінаць цвікі, каб шыбу дастаць, каб залезці ўсярэдзіну...

Я ў крык: «Што вы робіце?!»...

Тады ўжо і самы важны адазваўся, кажа: «Кіньце, Сцяпанавіч... Паедзем да будаўнікоў. Будзем там разбірацца».

Селі яны ў свайго «казла» і паехалі... Пранесла, значыць.

...А мы тую самагонку потым «дагналі». І на вяселлі мама пабыла. Расказвала там, як ледзь не папалася, як той служака ў хату шчаміўся... «І чаго ён хацеў, — уголас гадала матуля, — можа злавіць мяне, можа...» — «Ды вядомая ж рэч, — перабілі яе хутаране, — гарэлкі пакаштаваць! Відаць, знюхаў, што яна ў цябе добрая!»

...Як бы там ні было, а будаўнікі пасля той праверкі трохі заварушыліся, і мы ўрэшце пераехалі ў новы дом.

Менавіта з яго ў апошні шлях я правяла майго маленькага першынца, маю дарагую гаротніцу-маму, маіх незабыўных братоў Ваню, Васю і Міколу (Міша пахаваны ў Курску), сюды ж з радзільні я прывезла некалі другога сына, а потым мая нявестка — старэйшую ўнучку.

Жыццё працягваецца...

Ніна Бурко,

Бярэзінскі р-н.

ПРАВЯРАЙ ДЫ... МЕРУ ЗНАЙ

Не так даўно прывялося мне трапіць у адну кампанію, дзе дарослыя ўжо дзядзькі ўспаміналі зборы. Не, не вайсковыя. Некалі, да развалу Савецкага Саюза, урокі ваеннай падрыхтоўкі былі ў школах. Старшакласнікі цягам навучальнага года вывучалі воінскі статут, разбіралі і збіралі на хуткасць аўтамат Калашнікава, вучыліся маршыраваць у страі. А потым з усіх школ раёна яны з'язджаліся на спецыяльна падрыхтаваную базу на так званыя палявыя зборы. Жылі, як сапраўдныя салдаты, у палатках, дзяжурылі па кухні, неслі каравульную службу. Прычым дзяжурылі тады па чарзе: суткі — адна школа, суткі — другая і г.д.

— А памятаеш, як ваш ваенрук на міну нарваўся? — пытае раптам адзін з дзядзькоў у другога.

— Ага, — адзываецца ён, — такое хіба забудзеш... Галоўнае, прайшоў і не падарваўся!

— Няўжо ў вас нешта мініравалі? — вушам не паверыў я.

— Мініравалі-мініравалі, — заўсміхаліся суразмоўцы.

І з задавальненнем расказалі, што за каравульнымі з адной школы досыць пільна назіралі ваенрукі з іншых. Правяралі, умоўна кажучы, як тыя ахоўвалі лагер, ці не курылі (і ці не парушалі тым самым правілы пажарнай бяспекі), ці не бегалі на рэчку або наогул за тэрыторыю лагера... Потым усе гэтыя правіны разбіраліся перад строем: на парушальнікаў налічваліся штрафныя балы і ўжо ад іх залежала месца школы ў так званым «табелі аб рангах». Вось ваенрукі і стараліся знайсці хоць якуюсьці парушынку — у чужым воку. Адзін дык і наогул зямлю носам рыў.

— У той вечар мы з Саньком у каравуле стаялі, — працягваў апавядальнік. — І мала ўжо заставалася — стаміліся, надакучыла, а тут яшчэ дождж стаў накрапваць. Дай, думаем, у палатку, схаваемся. Толькі навастрыліся — чуем голас з кустоў. Мы, вядома ж, туды. А там... Міхайлавіч, ваш ваенрук — лаецца і распранаецца, распранаецца і лаецца... Аказалася, ён хацеў праверыць, як мы службу нясём. І не каб спакойна падысці... Ён да каравульнай палаткі падпаўзці хацеў — з таго боку кустоў, каб ніхто не заўважыў... Ну і локцем на «міну» — нехта з хлопцаў да прыбіральні, відаць, не дабег.

...Як і варта было чакаць, «мінёра» таго не знайшлі. А ваенрука яго калегі суцешылі. Сказалі, што так з вайны павялося: хто праз міннае поле прайшоў і не падарваўся, жыць будзе доўга.

Так гэта ці не так, мае суразмоўцы не ведалі.

Валерый Гаўрыш,

г. Чавусы.

НОЧ НАД КРАЕМ БАЛЯВАЛА

...Не, не ўсе пазабывалі,
Як калгасы ў нас стваралі,
Як вяскоўцы ў іх гарбелі
А заробкаў — кукіш мелі.
...У Адаркі муж калека,
Бо без ног — паўчалавека,
Не гультай, майструе дома,
І параіць штось, вядома...
Мае дзетак, гаспадарку,
Бо ўпіраецца Адарка:
Каб зусім не заняпасці,
Дзе дастаць што, дзе... украсці.
Старшыня ў іх прынцыповы:
Уляпіў бы ўсім вымовы!
І Адарцы іх давалі.
Бо вымовы ж — не медалі...
Ды і ў іх няма патрэбы,
Ёй бы хлеб... Ну й штось да хлеба:
Парсючкі ў хляве, карова —
Ім начхаць, ці ёсць вымова.
Просяць есці, суха легчы —
Што дзе ўзяць, куды пабегчы?..
...Месячык зайшоў за хмарку —
Сцежка вывела Адарку
У поле, дзе ляжыць салома
(Падаслаць няма чым дома).
Ноч над полем балявала.
Дарка посцілку паслала,
Копку добрую ўзваліла
І нясе, пакуль пры сілах —
Не ідзе, паўзе паціху.
Трэба ж — як на тое ліха,
Старшыня... Ды з брыгадзірам...
Не адпусцяць, пэўна, з мірам?..
— Ну, і дзе твой памагаты? —
Запытаўся старшыня той.
Ты ж былінка, не кабета —
Хто нясе пасцілку гэту?
Эй, выходзь! Глядзіш, даруем
І дамоў камандзіруем...
Тут Адарачка прысела,
Голаў пад вузлом прадзела,
На калена чуць прыпала
І на ногі спрытна ўстала.
У вачах гарыць хітрынка:
«Чалавекам будзь, старшынька!
Красці закажу другому...
Адпусці мяне дадому!»
На начальства косіць вокам...
І паціху бокам, бокам...
Месяц выглянуў з-за хмаркі,
Свята ў доме ў Адаркі.
...Не, не ўсе пазабывалі,
Як калгасы ў нас стваралі,
Як вяскоўцы ў іх гарбелі,
А заробкаў — кукіш мелі.

Галіна Нечыпаровіч,

в. Магільна,
Уздзенскі раён

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

dounar@zviazda.by

Ад яе ж заўсёднае: *«Пішыце... Прозай, вершам... Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў».*

РЭСПУБЛІКАНСКІ СПІС ЭКСТРЭМІСЦКІХ МАТЭРЫЯЛАЎ

Від інфармацыйнай прадукцыі	Найменне, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі	Найменне суда, які вынес рашэнне, і дата ўступлення ў сілу рашэння суда
CD-R-дыскі	«Урок Беларускае мовы»; «Канцэрт «Салідарныя зь Беларусьсю» на рынкавай Плошчы Новага Горада ў Варшаве 12 сакавіка 2006»; «MEGAUS MEG 16753» (канфіскаваны ў гр-на Буракова Аляксандра Уладзіміравіча)	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна ад 4 верасня 2008 года, увайшло ў законную сілу 16 верасня 2008 года
Кніжныя выданні	«Нет плохих народов», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2007 г., 127 с.; протаіерэй Алег Чакрыгін «Читая Евангелие. Размышления на евангельские чтения. Кто мы: христиане или иудеи?», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г., 95 с. (7-е выданне); Ерчак В.М. «Слово и Дело Ивана Грозного», Мінск, ФУА Информ., 2005 г. 704 с.; «Россия пробудись. В защиту Отечества» складальнік ігумен Сімяон, Масква, «Империум-Пресс», 2005 г., 384 с.; Платонаў А.А. «Тайное мировое правительство», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Загадка Сионских протоколов», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Русское сопротивление», серыя «Война с антихристом», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Война с внутренним врагом», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Барыс Міронаў «Иго иудейское», Масква, «Алгоритм», 2007 г.; Мікалай Жавахаў «Еврейская революция», серыя «Проект Олега Платонова «Русское сопротивление», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; «Убиение Андрея Киевского. Дело Бейлиса — «смотр сил», Мінск, «Русская идея», 2006 г.; Філімонаў В.П. «Время суда», Мінск, ЗАТ «Христианская инициатива», у 2-х тамах, 2007 г.; «Исследование Холокоста. Глобальное видение. Материалы международной Тегеранской конференции», Масква, «Алгоритм», 2007 г., 272 с.	Рашэнне суда Савецкага раёна г. Мінска ад 19 снежня 2008 года, увайшло ў законную сілу 26 лютага 2009 года
Кніжнае выданне	«Приговор убивающим Россию», Барыс Міронаў, Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г.	Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 8 ліпеня 2009 года
Кніжнае выданне	«Особое мнение или обращение христианки», Алена Гнаук, Брэст, 2011 г.	Рашэнне суда Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ад 16 лістапада 2011 года, увайшло ў законную сілу 27 лістапада 2011 года
Друкаванае выданне	«Прэс-фота Беларусі 2011», выдавец: ІП Логінаў, надрукавана: Taurapolis, Каўнас, Літва, 159 с.	Рашэнне суда Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці ад 18 красавіка 2013 года, увайшло ў законную сілу 24 чэрвеня 2013 года
Кніжнае выданне	«ВЕЛЕС — БОГ РУССОВ». Неизвестная история русского народа / А.І. Бялоў. — 4-е выд. — М.: Амрита, 2012. — 272.	Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 10 студзеня 2014 года, увайшло ў законную сілу 21 студзеня 2014 года
Друкаваныя выданні	Ас-Сухеймі, Саліх. Основы веры в свете Корана и Сунны/ пер. з араб. Э. Куліева — 3-е выд., выпраўл., дап. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008. — 304 с.; Куліеў, Эльмір. На пути к Корану. — 3-е выд., выпраўл. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008 — 560 с.; Рабі Хадзі аль-Мадхалі. Мудрость и логика в методах призыва пророков к Аллаху. / 1-е выданне. Пераклад з арабскай Куліева. — М.: Выдав. дом «БАДР», 2000 — 152 с.; Мухамад Салех. Как ответить на три основных вопроса / Першае выданне, 2010 — 250 с. (капірайт www.Svet-Islama.com); Захарна С.Н. Тяжкие последствия актов самоубийства — Кувейт, 2005 — 128 с. Капірайт — Общество «Возрождения Исламского Наследия»; Абдуль Азіз Ар-Райіс. Нарушение единобожия. — 2008 — 130 с.; Аліхан Мусаеў. 10 прав. — 28 с.; Вероубеждение мусульманина. — 11 с.	Рашэнне суда Фрунзенскага раёна г. Мінска ад 12 сакавіка 2014 года, увайшло ў законную сілу 24 сакавіка 2014 года
Кніжныя выданні	Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 848 с.; Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.; Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 384 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў мяккай вокладцы, 384 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга 694 с.; George L. Mosse. Nazi Culture. Кніга 386 с.; George Lincoln Rockwell. This Time the Wolrd. Кніга 264 с.; George Lincoln Rockwell. White Power. Кніга 466 с.; Soldier's Manual for MOS 11C — Indirect Fire Infantryman: Skill level 1. Кніга 516 с.; Soldier's Manual, MOS 11C, Indirect Fire Infantryman: Skill level 2/3/4». Кніга 900 с.	Рашэнне суда Бабруйскага раёна і г. Бабруйска ад 17 лютага 2015 года, увайшло ў законную сілу 28 лютага 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	размешчаны на інфармацыйным рэсурсе ў інтэрнэце (URL https://vk.com/id210277702)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце (URL https://vk.com/psh_soc; https://vk.com/psh_info; https://twitter.com/psh_eco; https://facebook.com/psh.by)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Відэаматэрыялы	размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце (URL https://www.youtube.com/watch?v=qF-wX10MHKU; https://www.youtube.com/watch?v=FJRN6k1wzag; https://www.youtube.com/watch?v=jn7pgkcoY60; https://www.youtube.com/watch?v=2vjNW5g4Yfc)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	misanthropic.info misanthropic.in	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 5 жніўня 2015 года, увайшло ў законную сілу 18 жніўня 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	нагрудны знак (брошка) шэрага колеру	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	маркі ў 4-х упакоўках з выявай нацысцкай свастыкі, партрэт Адольфа Гітлера, нагрудныя знакі — 5 шт., нашыўка — 1 шт., перавадныя карцінкі — 4 шт., чайны сервіз з керамікі з 21 прадмета: кубак — 14 шт., конаўка — 2 шт., сподак — 2 шт., попельніца — 1 шт., чайнік — 1 шт., цукарніца — 1 шт.	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	блок, які складаецца з 4-х марак з выявай Адольфа Гітлера	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года

«БЕЛАЎТАДАР» ПЕРАДАДЗЕНЫ ДЗЯРЖКАММАЁМАСЦІ

У краіне праведзена чарговая рэформа структуры кіравання дарожнай гаспадаркай: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Кіруючая кампанія холдынга «Белаўтадар» пераведзена з падпарадкавання Міністэрства транспарту і камунікацый у распараджэнне Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №844 ад 9 кастрычніка, якая 13 кастрычніка была апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Такім чынам праведзена раздзяленне ведамаснай падпарадкаванасці арганізацый заказчыкаў і падрадчыкаў, якія да гэтага моманту функцыянавалі ў складзе аднаго Міністэрства транспарту і камунікацый. У падпарадкаванні Мінтранса знаходзяцца ўладальнікі аўтамабільных дарог (аўтадары), якія выступаюць у якасці заказчыкаў на выкананне работ па будаўніцтве і рамонце рэспубліканскіх аўтамабільных дарог. Падрадныя арганізацыі дарожнай гаспадаркі (дарожна-будаўнічыя і мостабудаўнічыя трэсты, прамысловыя і транспартныя прадпрыемствы), якія ўваходзяць у холдынг «Белаўтадар» і выконваюць работы па будаўніцтве і рамонце дарог, становяцца незалежнымі ад Міністэрства транспарту і камунікацый.

Паводле ацэнак экспертаў, новая структура дарожнай гаспадаркі дазволіць больш эфектыўна кіраваць рэспубліканскімі аўтамабільнымі дарогамі, а таксама сродкамі, што выдзяляюцца на іх утрыманне і развіццё.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 2	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-48538 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 598,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20. Составные части и принадлежности: подвал, пристройка, рампа
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002006545, площадь 0,0515 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания книготорга) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20
Начальная цена продажи	827 961 000 (восемьсот двадцать семь миллионов девятьсот шестьдесят одна тысяча) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	41 398 050 (сорок один миллион триста девяносто восемь тысяч пятьдесят) белорусских рублей
ЛОТ 3	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 401/С-16330 (назначение – здание неустановленного магазина, наименование – цех торгового оборудования), площадью 1379,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422050400002002300, площадь 0,2800 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания цеха торгового оборудования) по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,2800 га
Начальная цена продажи	557 500 000 (пятьсот пятьдесят семь миллионов пятьсот тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	27 875 000 (двадцать семь миллионов восемьсот семьдесят пять тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 4	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Изолированное помещение, инв. № 400/D-97171 (назначение – магазин, наименование – магазин), площадью 391,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Красноармейская, 69-17
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002000780, площадь 0,0639 га (назначение – обслуживание жилого дома со встроенным магазином) по адресу: г. Гродно, ул. Красноармейская, 69
Начальная цена продажи	4 362 627 600 (четыре миллиарда триста шестьдесят два миллиона шестьсот двадцать семь тысяч шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	218 131 380 (двести восемнадцать миллионов сто тридцать одна тысяча триста восемьдесят) белорусских рублей
ЛОТ 5	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Изолированное помещение, инв. № 400/D-5569 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 165,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Лермонтова, 8
Начальная цена продажи	1 383 000 000 (один миллиард триста восемьдесят три миллиона) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	69 150 000 (шестьдесят девять миллионов сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей
Продавец	Гродненский городской филиал облпотребобщества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 24 ноября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.06.2015 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений 18 ноября 2015 г. до 15.00

Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», дополнительная информация: http://realty.tut.by/catalog/company/ino-v-grodno/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Изолированное помещение, инв. № 410/D-17243 (назначение – складское помещение 4 02 05, наименование – помещение склада с рампой), площадью 2440,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, д. 1, -2
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 420850100001008310, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (для обслуживания и эксплуатации здания склада с рампой), площадь 0,3789 га, расположен по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, д. 1А
Начальная цена продажи	6 500 134 960 (шесть миллиардов пятьсот миллионов сто тридцать четыре тысячи девятьсот шестьдесят) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	650 013 496 (шестьсот пятьдесят миллионов тринадцать тысяч четыреста девяносто шесть) белорусских рублей
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 410/С-24502 (назначение – здание нежилое 2 20 00, наименование – здание управления рынком), площадью 71,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Фабричная, 18Б
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 420850100001010192, площадь 0,0127 га (назначение – земельный участок для размещения объектов административного назначения) по адресу: г. Волковыск, ул. Фабричная, 18Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водных объектов, код – 4,1, площадью 0,0127 га
Начальная цена продажи	87 050 880 (восемьдесят семь миллионов пятьдесят тысяч восемьсот восемьдесят) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	8 705 088 (восемь миллионов семьсот пять тысяч восемьдесят восемь) белорусских рублей
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 410/С-28181 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад кирпичный), общей площадью 814,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/2; - капитальное строение, инв. № 410/С-22461 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – закрытая терраса для хранения велосипедов), общей площадью 452,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/1; - капитальное строение, инв. № 410/С-28180 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар), общей площадью 34,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е; - капитальное строение, инв. № 410/С-28262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – забор), общей площадью 702,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый № 420850100001010312, площадью 0,7360 га (назначение – 1 16 00 земельный участок для размещения объектов иного назначения), расположенном по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е
Начальная цена продажи	2 256 322 540 (два миллиарда двести пятьдесят шесть миллионов триста двадцать две тысячи пятьсот сорок) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	225 632 254 (двести двадцать пять миллионов шестьсот тридцать две тысячи двести пятьдесят четыре) белорусских рубля
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Волковысский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-4-36-24
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 02 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 26 ноября 2015 г. до 15.00

Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №1.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5425, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 72,0 кв.м**. Наименование – спальный корпус №1 стоимостью 123 064 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №2.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5426, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 628,5 кв.м**. Наименование – спальный корпус №2 стоимостью 128 472 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №3.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5427, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 631,7 кв.м**. Наименование – спальный корпус №3 стоимостью 122 115 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №4.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5428, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 632,8 кв.м**. Наименование – спальный корпус №4 стоимостью 119 900 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №5.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5424, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 1802,6 кв.м**. Наименование – клуб-столовая стоимостью 374 546 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №6.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5422, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 108,8 кв.м**. Наименование – здание овощехранилища стоимостью 28 257 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №7.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5432, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 145,4 кв.м**. Наименование – здание котельной стоимостью 46 755 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №8.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5423, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 45,5 кв.м**. Наименование – дом сторожа стоимостью 2 999 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №9.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5421, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 32,2 кв.м**. Наименование – здание туалета стоимостью 5616000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №10.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5431, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7. Наименование – сеть водопроводная стоимостью 105 151 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №11.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5431, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7. Наименование – сеть канализационная стоимостью 42 490 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №12.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5429, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 618,2 кв.м**. Наименование – административное здание стоимостью 215 572 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №13.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5433, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 72,0 кв.м**. Наименование – тепловая сеть стоимостью 229 556 000 рублей
Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №14.** Капитальное строение с инвентарным номером 244/С-5430, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, Богушевский с/с, 7, **общей площадью 72,0 кв.м**. Наименование – сеть наружного освещения стоимостью 15 931 000 рублей
Собственник (владелец) имущества	**ООО «Салютэм»**
Место, дата и время проведения торгов	**г. Сенно, ул. Машерова, 2, 01.12.2015 года в 15.00, электронный адрес – opi_senno@tut.by**
Справочная информация	Начальник отдела принудительного исполнения Горбачёва Оксана Александровна, тел. 8(02135)51638, моб. тел. +375336879014, г. Сенно, ул. Машерова, 2
Условие и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен не позднее **27.11.2015** на депозитный счет отдела принудительного исполнения Сенненского района № 3642903000096 ЦБУ 218 ф-л 200 АСБ «Беларусбанк» г. Сенно, УНН 300002505, код 635. Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов стоимости реализуемого с торгов имущества (лота). В соответствии со статьей 385 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	**ОАО «Медпласт»,** г. Гомель, ул. Объездная, 12

Предмет аукциона

Наименование	Общая площадь, м²	Инвентарный номер
Здание цеха пластмассовых изделий	2269 кв.м	350/С-43619
Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, сени, служебное помещение, ворота, забор.		
Трансформаторная подстанция № 181	96,8 кв.м	350/С-78584
Оборудование: трансформатор, инв. № 40041		
Водопроводная сеть	протяженность 86,6 м	350/С-138467
Канализационная сеть	протяженность 105,8 м	350/С-138487

Начальная цена с НДС 20% – 2 664 353 280 белорусских рублей (снижена на 20%)

Сведения о земельном участке: Для эксплуатации и обслуживания здания цеха пластмассовых изделий продавцу на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) предоставлен земельный участок пл. 0.2865 га, с установленными ограничениями – охранных зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0386 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0.0105 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0365 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0365 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0053 га. Для эксплуатации и обслуживания трансформаторной подстанции №181, продавцу предоставлен на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) земельный участок пл. 0.0244 га., с установленными ограничениями – охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0038 га. К трансформаторной подстанции подключены субабоненты

Сведения по арендаторам: ЗАО «БеСТ» – участок асфальтобетонного покрытия под установку конструкции антенной мачты высотой Н-26 и контейнера с оборудованием сотовой связи, общей площадью 25 кв.м (срок действия договора по 18.08.2017 г). ИП Клещук В.А. – помещение на 1 этаже здания цеха пластмассовых изделий для размещения участка по производству корпусной мебели, общей площадью 48,16 кв.м (срок действия договора по 15.04.2018)

